Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»

# Па працы - пашана

***Біябібліяграфічны даведнік***

Кобрын
2020

УДК 016:908(476.7)(092)
ББК 91.9:26.89(4Беи)
П12

Серыя заснавана ў 2017 годзе

***Складальнікі:***

галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» *С. Д. Курачук*

бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» *Л. С. Дардзюк*

П12 **Па працы - пашана** : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. - 165 с. : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

Біябібліяграфічны даведнік прысвечаны асобам, якія ўдастоены высокага звання «Герой Сацыялістычнай Працы», узнагароджаны дзяржаўнымі працоўнымі ўзнагародамі, удастоены звання «Заслужаны работнік» у розных галінах дзейнасці. У нейкім сэнсе даведнік - гэта кніга працоўнай славы нашых землякоў.

Для шырокага кола чытачоў.

**УДК 016:908(476.7)(092)**
**ББК 91.9:26.89(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма , 2020

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Зберажэнне гістарычнай памяці, веданне сваёй духоўнай спадчыны вяртаюць нас да памяці аб тых, хто праславіў родную зямлю сваімі справамі, сваёй добрасумленнай працай. Іх жыццёвы шлях, адданасць справе выклікаюць бясконцую павагу і заслугоўваюць асаблівай падзякі землякоў.

Гісторыю кобрынскага краю шмат у чым рабілі людзі працы. Лёсы іх розныя, не падобныя адзін на аднаго, але іх аб'ядноўвае вынік дзейнасці на карысць развіцця нашай малой радзімы. Многія з іх аддалі роднаму прадпрыемству, арганізацыі лепшыя гады жыцця, шчодра дзяліліся сакрэтамі прафесійнага майстэрства з моладдзю, на асабістым прыкладзе выхоўвалі годную змену. Гэтыя людзі здзяйснялі свой працоўны подзвіг штодня. Сярод іх прадстаўнікі розных прафесій і сфер дзейнасці: педагогі, медыкі, работнікі культуры, гандлю, сельскай гаспадаркі, навукоўцы… У розны час у розных сферах яны не проста дасягалі асабістых і кар'ерных прафесійных вышынь, але і прымнажалі славу Кобрыншчыны, спрыяючы яе прагрэсу і росквіту, шчыра імкнуліся зрабіць сваю малую радзіму прыгажэйшай і паспяховай.

Добрая праца ніколі не забываецца, а ўшаноўваецца і застаецца ў памяці і сэрцах людзей. Біябібліяграфічны даведнік «Па працы - пашана» з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» прысвечаны асобам, якія ўдастоены высокага звання «Герой Сацыялістычнай Працы», узнагароджаны дзяржаўнымі працоўнымі ўзнагародамі, удастоены звання «Заслужаны работнік» у розных галінах дзейнасці. Можна сказаць, што ў нейкім сэнсе даведнік - гэта кніга працоўнай славы нашых землякоў.

Матэрыял выдання згрупаваны ў наступныя раздзелы:

Героі Сацыялістычнай Працы

Ардэнаносцы

*Узнагароджаныя ордэнам Леніна*

*Узнагароджаныя ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Працоўнай Славы, Кастрычніцкай рэвалюцыі, ордэнам «Знак Пашаны» (ордэнам Пашаны), Ордэнам Айчыны*

Заслужаныя работнікі Беларускай ССР, Рэспублікі Беларусь

*Заслужаны аграном*
*Заслужаны будаўнік*
*Заслужаны дзеяч мастацтваў*
*Заслужаны дзеяч навукі*
*Заслужаны меліяратар*
*Заслужаны механізатар сельскай гаспадаркі*
*Заслужаны настаўнік*
*Заслужаны работнік адукацыі*
*Заслужаны работнік аховы здароўя*
*Заслужаны работнік культуры*
*Заслужаны работнік прамысловасці*
*Заслужаны работнік сацыяльнай абароны*
*Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі*
*Заслужаны сувязіст*
*Заслужаны ўрач*
*Заслужаны юрыст*

Заслужаныя работнікі-землякі іншых дзяржаў

Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі

Артыкулы ў кожным раздзеле размешчаны ў алфавіце прозвішчаў асоб. Біяграфічныя даведкі напісаны на аснове фондаў Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, архіўных дакументаў, інфармацый кадравых службаў прадпрыемстваў і арганізацый горада і раёна, Кобрынскага раённага савета ветэранаў, сельскіх саветаў раёна, аўтабіяграфій, успамінаў і іншых крыніц. Уключаны матэрыялы, дадзеныя супрацоўнікамі публічных бібліятэк раёна. Тэкст дапоўнены фатаграфіямі.

Размяшчэнне бібліяграфічных запісаў унутры раздзелаў - алфавітнае (для кніг, артыкулаў з даведачных выданняў, зборнікаў); храналагічнае (для газетных і часопісных артыкулаў), у межах года - у зваротнай храналогіі публікацый. Прадстаўлены бібліяграфічныя выданні цэнтральнай раённай бібліятэкі, найбольш значныя электронныя рэсурсы. Адбор крыніц завершаны ў снежні 2020 года.

Бібліяграфічныя запісы ў паказальніку зроблены ў адпаведнасці з міждзяржаўнымі стандартамі «ГОСТ 7.1-2003 Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления», «ГОСТ 7.80-2000 Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления», метадычнымі рэкамендацыямі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Оформление библиографического списка к научной работе».

Даведачна-дапаможны апарат выдання ўключае імянны, геаграфічны паказальнікі; алфавітны спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў выданне.

Біябібліяграфічны даведнік змяшчае звесткі пра землякоў, узнагароджаных дзяржаўнымі працоўнымі ўзнагародамі, удастоеных звання «Заслужаны работнік» у многіх прафесіях. Прызначаны шырокаму колу карыстальнікаў: настаўнікам, студэнтам, навучэнцам, бібліятэкарам, краязнаўцам, экскурсаводам, наогул усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, дасягненнямі людзей, якія ўнеслі асабісты ўклад у развіццё нашай малой радзімы.

Асаблівую актуальнасць біябібліяграфічнаму даведніку «Па працы - пашана» надае той факт, што ён выдадзены ў Год малой радзімы ў Беларусі.

*Святлана Курачук*




***Уручэнне ўрадавых узнагарод працаўнікам***
***Кобрынскага раёна***
***1971 год***



***Ардэнаносцы калгаса «Зара»***

# ГЕРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

**Герой Сацыялістычнай Працы — ганаровае званне ў СССР з 1938 па 1991 год, вышэйшая ступень адзнакі за працу.**

**ГЕРОЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ, найвышэйшая ступень працоўнай адзнакі за выдатныя дасягненні ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве. Устаноўлена Указам Прэзідыума Савета СССР 27.12.1938 года. Прысвойваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета асобам, якія сваёй асабліва выдатнай наватарскай дзейнасцю ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, транспарце, гандлі, навуковых адкрыццях і вынаходствах праявілі выключныя заслугі перад дзяржавай, садзейнічалі ўздыму народнай гаспадаркі, развіццю культуры, навукі, магутнасці і славы СССР.**

**Г. С. П. уручаюць ордэн Леніна, залаты медаль «Серп і Молат» і спецыяльную грамату Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Г. С. П., якія дамагліся новых выключных дасягненняў, узнагароджваюцца другім залатым медалём «Серп і Молат», а на радзіме ставяць яго бронзавы бюст.**

*Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т.*
*Мінск, 1971. Т. 3. С. 457.*



***Медаль «Серп і Молат» — знак адрознення Героя Сацыялістычнай Працы***

# ВАЛАСЮК ФЁДАР КАНСТАНЦІНАВІЧ

**ВАЛАСЮК Фёдар Канстанцінавіч** (1921-2000) - Герой Сацыялістычнай Працы.



Нарадзіўся 6 студзеня 1921 года ў вёсцы Багуславічы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (з 1972 года Залуззе Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям'і. Працоўную дзейнасць пачаў у пятнаццацігадовым узросце.

У час Вялікай Айчыннай вайны Фёдар Валасюк жыў у роднай вёсцы, дапамагаў партызанам, а затым быў байцом партызанскага атрада імя Фрунзе Брэсцкага злучэння. У 1944 годзе прызваны ў Чырвоную армію. Вызваляў Польшчу, пад Варшавай быў паранены.

Пасля шпіталя накіраваны ў органы МУС БССР, служыў у Брэсце. Потым працаваў старшым упаўнаважаным аддзела барацьбы з крадзяжом сацыялістычнай уласнасці і спекуляцыяй Кобрынскага раённага аддзела міліцыі. Гэтай няпростай справе аддаў 14 гадоў 7 месяцаў.

11 лістапада 1958 года Ф. К. Валасюк выбраны старшынёй праўлення сельскагаспадарчай арцелі імя Сталіна з цэнтральнай сядзібай у вёсцы Пескі Пескаўскага сельсавета Кобрынскага раёна. Гаспадарка была слабая, але пад новым кіраўніцтвам праз некалькі гадоў пераўтварылася ў перадавую. Новы старшыня падабраў надзейныя кадры, зрабіў стаўку на жывёлагадоўлю. Завялі кароў, была створана племянная ферма. Надоі малака павысіліся ў два разы: больш за 3000 кг малака за год ад кожнай каровы. Даход гаспадаркі павялічыўся ў тры разы, а аплата чалавека-дня – у 6 разоў. У 1959 годзе арцель перайменавана ў калгас імя XXI з'езда КПСС (у 1991-2003 гадах – калгас «Беларусь», з 2003 года – СВК «Вербнае»). Калгас першым у раёне пачаў будаваць жылыя дамы для сваіх работнікаў, былі ўведзены аб'екты сацкультбыту. Адным з першых у раёне ў Песках з'явіўся прыродны газ.

За дасягнутыя поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці мяса і малака 22 сакавіка 1966 года Ф. К. Валасюку прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

У 1970 годзе Фёдар Канстанцінавіч закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут па спецыяльнасці «аграном». Кіраўнік ён быў патрабавальны, але справядлівы, шанаваў людзей працавітых, дбайных і клапаціўся пра іх. Для лепшых працаўнікоў за кошт калгаса арганізоўваліся паездкі ў Маскву, Ленінград, на Чорнае мора, у Прыбалтыку. Фінансавае становішча калгаса было стабільным. За 27 гадоў працы ў калгасе Ф. К. Валасюк ніколі не браў банкаўскія крэдыты. У 1980 годзе да гаспадаркі далучылі калгас «Савецкая Беларусь», які меў даўгі 700 тыс. рублёў, але старшыня здолеў пагасіць запазычанасць.

За ваенную і працоўную дзейнасць Ф. К. Валасюк узнагароджаны ордэнамі Леніна (1966), Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені (1985), медалямі (у т. л. сярэбраным і двума бронзавымі медалямі ВДНГ СССР 1969, 1974, 1976), граматамі.

Памёр Фёдар Канстанцінавіч Валасюк 23 чэрвеня 2000 года. 1 мая 2007 года на будынку СВК «Вербнае» адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар Фёдара Канстанцінавіча Валасюка, першага Героя Сацыялістычнай Працы на Кобрыншчыне, кавалера ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Адамович, А**. Земля отцов / А. Адамович // Земные звёзды : [очерки] / сост. : П. П. Сутько, В. И. Хомич, Е. В. Шилаев. - Минск, 1978. - С. 63–69.

**Багуславічы** : [вёска, у якой нарадзіўся Ф. К. Валасюк] // Памяць. Жабінкаўскі раён: гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 1999. - С. 484.

**Бензярук, Р.** Зорка за працу. Валасюк Фёдар Канстанцінавіч / Расціслаў Бензярук, Анатоль Бензярук // Сорак дарог / Р. Бензярук. – Брэст, 2007. – С. 138-140.

**Бугаревич, В. С.** Распределение доходов в колхозе : опыт колхоза «XXI съезд КПСС» : [Кобринский район] / Виктор Спиридонович Бугаревич, Федор Константинович Волосюк. – Минск : Урожай, 1966. – 52 с. – (Решения XXIII съезда КПСС в жизнь!).

**Волосюк Федор Константинович** // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда. - Минск, 2014. - С. 65.

**Волосюк Федор Константинович** // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. - Минск, 1982. - Т. 5. - С. 123.

**Валасюк Фёдар Канстанцінавіч** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. - Мінск, 1981. - Т. 5. - С. 110.

**Валасюк Фёдар Канстанцінавіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1970. - Т. 2. - С. 568.

**Героі** Сацыялістычнай Працы. **Валасюк Фёдар Канстанцінавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 426. - (Вызначыліся працай).

**Героі** Сацыялістычнай Працы. 1966 **Ф. К. Валасюк** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 198.

**Герой** Сацыялістычнай Працы. 1966 **Ф. К. Валасюк** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1971. - Т. 3. – С. 457.

**Герои** Социалистического Труда. **Волосюк Федор Константинович** // Хидры - первый агрогородок на Кобринщине : информационно-аналитический очерк / Кобринская центральная районная библиотека, отдел обслуживания и информации ; сост. гл. библиограф Светлана Курачук. – Кобрин, 2007. – С. 39. – (Наша гордость, наша слава).

**95 гадоў** з дня нараджэння Ф. К. Валасюка (1921) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. - С. 10.

**Ромма, Ф.** Мужала молодость в боях : записки секретаря подпольного обкома комсомола / Федор Дмитриевич Ромма ; лит. обраб. Н. Грицана. – Минск : Беларусь, 1974. – 286 с.: ил.

См. на с. 275.

**Сяло** маё роднае. – Мінск : Ураджай, 1968. – 272 с. : іл.

См. на с.163–166.

**Их подвиг** и труд награждены звездой Героя. **Федор Константинович Волосюк** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Бензярук, Я.** «Я – з Багуславічаў», альбо Работа над памылкамі / Анатоль Бензярук // Сельская праўда. – 2017. - 23 мая.

Інтэрв'ю з Ф. К. Валасюком.

**Дубина, Л.** Всю жизнь служил народу / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. – 19 января.

К 95-летию со дня рождения Ф. К. Волосюка.

**Бялоў, Д.** Адным жыццём - з зямлёю роднай і з народам / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2011. - 19 студзеня. - С. 4.

Пра Героя Сацыялістычнай Працы, кавалера ордэна Леніна, залатога медаля «Серп і Молат» і інш. узнагарод, былога старшыню СВК «Вербнае» Ф. К. Валасюка.

**На свята** працы - гонар Герою // Кобрынскі веснік. – 2007. – 5 мая. – С. 1.

Аб адкрыцці мемарыяльнай дошкі ў гонар Ф. К. Валасюка ў СВК «Вербнае».

**Сацук, А**. Золотая Звезда Фёдора Волосюка / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. - 2006. - 18 студзеня. - С. 2.

**Хільчук, М**. Вяртаючыся ў мінулае / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. - 2001. – 17 студзеня. - С. 2. - 18 студзеня Ф. К. Валасюку споўнілася б 80 гадоў.

**Волосюк** Фёдор Константинович : [некролог] / Ашмянцев С. Д. [и др.] // Кобрынскі веснік. - 2000. - 1 ліпеня. - С. 4.

**[Валасюк Ф. К.]** // Кобрынскі веснік. – 1999. – 17 сакавіка.

**Хільчук, М**. Старшынёва Зорка / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. - 1998. - 28 кастрычніка. - С. 2.

**Валасюк, Ф.** Здзяйсненне нашай мары / Ф. Валасюк // Камуністычная праца. - 1978. - 26 жніўня.

**Камяндант, С.** На светлым шляху / С. Камяндант // Камуністычная праца. - 1974. - 17жніўня.

З гісторыі калгаса «XXI з’езд КПСС».

**Примачук, Н**. Смотр сил / Н. Примачук // Сельская газета. - 1974. - 23 января.

О коммунистах колхоза «XXI съезд КПСС».

**Пищик, В**. Сеятель / В. Пищик // Сельская газета. - 1967. – 26 ноября.

Очерк про Ф. К. Волосюка.

**Калгас** «XXI з’езд КПСС» // Камуністычная праца. - 1967. - 16 лютага.

Нумар прысвечаны калгасу «XXI з’езд КПСС».

**Волосюк, Ф. К.** Помогаем соседям преодолеть отставание / Ф. К. Волосюк ; [записал] П. Спиридонов // Сельское хозяйство Белоруссии. - 1959. - № 12. - С. 7.

**Волосюк Федор Константинович** : информация Хидринской средней школы. – Хидры, 2002.

**6 студзеня 2016 г.** – 95 гадоў з дня нараджэння Фёдара Канстанцінавіча Валасюка (1921–2000), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, гаспадарчага дзеяча, Героя Сацыялістычнай Працы (1966) [Электронны рэсурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. – Рэжым доступу: http://kb.brl.by. - Дата доступу: 10.10.2019.

# ДУБІНКА МІХАІЛ КАЛІСТРАТАВІЧ

**ДУБІНКА Міхаіл Калістратавіч** (1937-2011) - Герой Сацыялістычнай Працы.



Нарадзіўся 23 чэрвеня 1937 года ў вёсцы Хідры Кобрынскага павета (цяпер Хідры Кобрынскага раёна).

Працоўную дзейнасць пачаў калгаснікам-паляводам у калгасе «Зара» Кобрынскага раёна (цяпер СВК «Узыходзячая зара») у 1950 годзе, дзе прапрацаваў да 1989 года.

Пасля службы ў радах Савецкай арміі з 1960 года стаў брыгадзірам паляводчай брыгады ў калгасе «Зара», у 1970-1990 гадах - начальнікам вытворчага ўчастка калгаса. Некалькі пяцігодак запар яго комплексная брыгада, а пасля вытворчы ўчастак, дабіваўся высокіх паказчыкаў: атрымліваў звыш 50 цэнтнераў збожжавых з гектара, па 300 цэнтнераў бульбы, 700 кармавых і 350 – цукровых буракоў. Міхаіл Дубінка шмат увагі ўдзяляў культуры земляробства.

У Міхаіла Калістратавіча было шмат разнастайных грамадскіх даручэнняў: член партбюро калгаса, дэпутат Хідрынскага сельскага Савета, член бюро гаркама КПБ, старшыня селькама. У 1980-1985 гадах М. К. Дубінка - дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. Ён меў актыўную жыццёвую пазіцыю, людзі аказвалі яму давер’е.

28 снежня 1976 года за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і продажы дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі Міхаілу Калістратавічу прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

У арсенале дзяржаўных узнагарод - ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга (1965), ордэн Леніна (1967), медаль «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР. Міхаіл Калістратавіч узнагароджаны двума залатымі і бронзавым медалямі ВДНГ СССР. Такія высокія ўзнагароды сваёй радзімы Міхаіл Калістратавіч Дубінка заслужыў, працуючы ў гаспадарцы брыгадзірам комплекснай брыгады. Ён унёс неацэнны ўклад у развіццё і станаўленне СВК «Узыходзячая зара» сваёй карпатлівай працай і адданасцю роднай зямлі.

У 1980 годзе выдавецтвам «Ураджай» была выдадзена кніга М. К. Дубінкі «Внедряем новое, передовое».

5 верасня 2011 года на 75-м годзе Міхаіл Калістратавіч Дубінка пайшоў з жыцця.

**Дубинка, М. К.** Внедряем новое, передовое / М. К. Дубинка. – Мінск : Ураджай, 1980. – 32 с. – (Серия «Герои пятилетки»).

**Адамович, А.** Полюшко-поле / А. Адамович // Земные звезды : очерки о Героях Социалистического Труда Брестской области. – Минск, 1978. – С. 87-91.

**Героі** Сацыялістычнай Працы. **Дубінка Міхаіл Калістратавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 426. - (Вызначыліся працай).

**Герои** Социалистического Труда. **Дубинка Михаил Калистратович** // Хидры - первый агрогородок на Кобринщине : информационно - аналитический очерк / Кобринская центральная районная библиотека, отдел обслуживания и информации ; сост. гл. библиограф Светлана Курачук. – Кобрин, 2007. – С. 39. – (Наша гордость, наша слава).

**Героі** Сацыялістычнай Працы. 1976 **М. К. Дубінка** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 199.

**Дубинка Михаил Калистратович** // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Минск, 1982. – Т. 5. Биографический справочник. – Минск, 1981. – С. 208.

**Дубинка Михаил Каллистратович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. – Кн. 1. - С. 355.

**Дубинка Михаил Калистратович** // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биографический справочник / сост. И. Н. Кулан [и др.] ; под общ. ред. А. Н. Новикова. – Минск, 2014. – С. 90.

**Дубінка Міхаіл Калістратавіч** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1981. – Т. 5. Біяграфічны даведнік. – С. 212.

**Их подвиг** и труд награждены звездой Героя. **Михаил Калистратович Дубинка** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**80 гадоў** з дня нараджэння М. К. Дубінкі (1937) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. –С. 37.

**Елизарова, Ж.** Эра открытий, достижений, развития / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. - 12 снежня. - С. 5.

О трудовой деятельности бригадира, начальника участка Михаила Калистратовича Дубинки в колхозе «Заря» (ныне СПК «Восходящая заря»).

**Дубинка Михаил Калистратович** : [некролог] // Кобрынскі веснік. – 2011. – 10 верасня. – С. 4.

**Владимиров, Д.** Их победы трудовые / Дмитрий Владимиров // Кобрынскі веснік. – 2008. – 14 мая. – С. 2.

Герой Социалистического Труда М. Дубинко всю жизнь проработал в родном хозяйстве - колхозе «Заря» (сейчас СПК «Восходящая заря»).

**Петров, П.** Из одного металла льют медаль за бой, медаль за труд / Петр Петров // Заря. - 2004. – 24 февраля.

**Сацук, А.** Ёсць у «Зары» свае героі / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 12 студзеня. – С. 2.

**Александров, П.** Трудными были первые годы / Петр Александров // Заря. – 1999. – 14 декабря. – С. 3.

За свой труд, помимо иных наград, Т. А. Соколюк и М. К. Дубинко получили высокое звание Героя Социалистического Труда.

**Дубінка, М.** «Быць гаспадаром на зямлі» / Міхаіл Дубінка ; [гутарыў] І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1987. – 25 ліпеня.

Гутарка з Героем Сацыялістычнай Працы М. К. Дубінкай.

**Дземідовіч, Т.** Будні селькома / Т. Дземідовіч // Камуністычная праца. – 1986. – 26 жніўня.

У характары Міхаіла Калістратавіча Дубінкі - прыносіць вялікую карысць справе, за якую ён бярэцца.

**Дубінка, М.** Возьмем новыя рубяжы / М. Дубінка // Камуністычная праца. – 1982. – 25 марта. – С. 3.

Начальнік першага вытворчага ўчастка калгаса «Зара», дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, Герой Сацыялістычнай Працы М. Дубінка прымаў удзел у рабоце XVII з’езда прафсаюзаў СССР.

**Дубінка, М. К.** Шчодрая ніва брыгады / Міхаіл Калістратавіч Дубінка ; [гутарыла] М. Хільчук // Камуністычная праца. – 1981. – 10 кастрычніка.

Інтэрв’ю з Героем Сацыялістычнай Працы Міхаілам Калістратавічам Дубінкай.

**Михаил Калистратович Дубинка** : информация Хидринской средней школы. – Хидры, 2002.

# САКАЛЮК ТАЦЦЯНА АНТОНАЎНА

**САКАЛЮК Таццяна Антонаўна** (1932-2009) - Герой Сацыялістычнай Працы.



Нарадзілася 23 красавіка 1932 года ў вёсцы Хідры Кобрынскага павета (цяпер Хідры Кобрынскага раёна).

Працоўную дзейнасць пачала ў родным калгасе «Зара» ў 1951 годзе. З 1963 года працавала аператарам на свінаферме. За гады працы (з 1951 па 1982 год) карысталася аўтарытэтам, адрознівалася высокай адказнасцю і выключнай працавітасцю.

У 1970 годзе ўзнагароджана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».

У 1971 годзе Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за дасягнутыя поспехі ў выкананні планаў вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і залатога медаля «Серп і Молат». Неаднаразова выбіралася дэпутатам раённага і сельскага Савета народных дэпутатаў.

28 студзеня 2009 года на 77-м годзе абарвалася жыццё Таццяны Антонаўны Сакалюк.

**Адамович, А.** Драгоценный сплав / А. Адамович // Земные звезды : очерки о Героях Социалистического Труда Брестской области. – Минск, 1978. – С. 313-317.

**Героі** Сацыялістычнай Працы. 1971 **Т. А. Сакалюк** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 199.

**Героі** Сацыялістычнай Працы. **Сакалюк Таццяна Антонаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 426. - (Вызначыліся працай).

**Их подвиг** и труд награждены звездой Героя. **Татьяна Антоновна Соколюк** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Сакалюк Таццяна Антонаўна** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1973. – Т. 9. – С. 318.

**Сакалюк Таццяна Антонаўна** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1981. – Т. 5. Біяграфічны даведнік. – С. 533.

**Соколюк Татьяна Антоновна** // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биографический справочник / сост. И. Н. Кулан [и др.] ; под общ. ред. А. Н. Новикова. – Минск, 2014. – С. 207.

**Соколюк Татьяна Антоновна** // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Минск, 1982. – Т. 5. Биографический справочник. – Минск, 1981. – С. 592.

**85 гадоў** з дня нараджэння Т. А. Сакалюк (1932) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 45.

**Герои** Социалистического Труда. **Сакалюк Таццяна Антонаўна** // Хидры - первый агрогородок на Кобринщине : информационно - аналитический очерк / Кобринская центральная районная библиотека, отдел обслуживания и информации ; сост. гл. библиограф Светлана Курачук. – Кобрин, 2007. – С. 39. – (Наша гордость, наша слава).

**Елизарова, Ж.** Эра открытий, достижений, развития / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 12 снежня. — С. 5.

О трудовой деятельности свинарки Татьяны Антоновны Соколюк в колхозе «Заря» (ныне СПК «Восходящая заря»).

**Соколюк** Татьяна Антоновна : [некролог] // Кобрынскі веснік. – 2009. – 4 лютага. – С. 7.

**Владимиров, Д.** Их победы трудовые / Дмитрий Владимиров // Кобрынскі веснік. – 2008. – 14 мая. – С. 2.

Герой Социалистического Труда Т. Соколюк всю жизнь проработала в родном хозяйстве - колхозе «Заря» (сейчас СПК «Восходящая заря»).

**Кветкі** для героя // Кобрынскі веснік. – 2005. – 12 сакавіка. – С. 2.

Старшыня раённага аб'яднання прафсаюзаў віншаваў Героя Сацыялістычнай Працы Т. А. Сакалюк са святам.

**Сацук, А.** Ёсць у «Зары» свае героі / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 12 студзеня. – С. 2.

**Александров, П.** Трудными были первые годы / Петр Александров // Заря. – 1999. – 14 декабря. – С. 3.

За свой труд, помимо иных наград, Т. А. Соколюк и М. К. Дубинко получили высокое звание Героя Социалистического Труда.

**Татьяна Антоновна Соколюк** : информация Хидринской средней школы. – Хидры, 2002.

# А Р Д Э Н А Н О С Ц Ы

## УЗНАГАРОДЖАНЫЯ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

**ОРДЭН ЛЕНІНА - найвышэйшая ўзнагарода ў СССР. Устаноўлены Пастановай ЦБК СССР ад 6.04.1930. Ордэнам узнагароджваюцца грамадзяне СССР, калектывы, установы, прадпрыемствы, грамадскія арганізацыі, гарады, рэспублікі, краі, вобласці за асаблівыя заслугі ў сацыялістычным будаўніцтве і абароне краіны. Могуць узнагароджвацца таксама іншаземныя грамадзяне за заслугі перад Савецкай дзяржавай і ў справе ўмацавання дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі СССР і інш. краін. Уручаецца таксама асобам, удастоеным вышэйшай ступені адзнакі - звання Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы. Знак ордэна - партрэт-медальён У. І. Леніна. Памеры: вышыня 40,5 мм, шырыня 38,0 мм. Зроблены з золата. Пасярэдзіне ордэна - плацінавы рэльефны малюнак У. І. Леніна. Прымацоўваецца з дапамогай пяцівугольнай калодкі, пакрытай шаўковай муаравай стужкай. Пасярэдзіне стужкі чырвоная падоўжная палоса, па яе краях дзве залацістыя палоскі, бліжэй да краёў стужкі чырвоныя палоскі і на самых краях 2 залацістыя палоскі. Носіцца на левым баку грудзей.**

*Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т.*
*Мінск, 1973. Т. 7. С. 574.*



**У свой час найвышэйшую ўзнагароду СССР – ордэн Леніна -атрымалі каля чатырохсот тысяч чалавек, сярод кавалераў ордэна былі і кабрынчане. Змяшчаем біяграфічныя звесткі пра кавалераў ордэна Леніна, якія звязаны з кобрынскай зямлёй.**

**БАРЫСЮК Вольга Паўлаўна**. Нарадзілася ў 1936 годзе ў вёсцы Залессе Кобрынскага павета (цяпер Залессе Кобрынскага раёна). Працоўную дзейнасць пачала ў пасляваенныя гады ў калгасе, шмат гадоў працавала даяркай у саўгасе імя Суворава Кобрынскага раёна (СВК «Быстрыца»). Узнагароджана ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, іншымі ўзнагародамі.



**Ардэнаносцы. Барысюк Вольга Паўлаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 426. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Ольга Павловна Борисюк** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981. – (К XXVI съезду КПСС).

**Барысюк Вольга Паўлаўна** : інфармацыя Залескай публічнай бібліятэкі. – Залессе, 2019.

За выдатныя працоўныя дасягненні даярка калгаса Суворава В. П. Барысюк узнагароджана ордэнам Леніна, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі.

**БАТУЛІН Сцяпан Нічыпаравіч**. Нарадзіўся ў 1922 годзе ў вёсцы Задзернава Кобрынскага павета. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1943 года знаходзіўся ў партызанскім атрадзе імя Фрунзе Брэсцкага злучэння, з 1944 года на фронце ў радах Савецкай арміі. Пасля вайны працаваў на лесараспрацоўках Урала. З 1956 па 1974 год быў брыгадзірам паляводчай брыгады ў калгасе «Зара» Кобрынскага раёна (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Член КПСС з 1959 года. У 1965 годзе за паспяховае выкананне планаў пяцігодкі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР узнагароджаны ордэнам Леніна.



**Ардэнаносцы. Батулін Сцяпан Нічыпаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 426-427. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Степан Никифорович Батулин** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981. – (К XXVI съезду КПСС).

**Батулин Степан Никифорович** // Хидры - первый агрогородок на Кобринщине : информационно-аналитический очерк / Кобринская центральная районная библиотека, отдел обслуживания и информации ; сост. Светлана Курачук, гл. библиограф. – Кобрин, 2007. – С. 40. – (Наша гордость, наша слава).

**БЕЛЮСЬ Васілій Лукіч**. Нарадзіўся ў 1921 годзе ў вёсцы Агароднікі Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Агароднікі Кобрынскага раёна). Працоўную дзейнасць пачаў з 15 гадоў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1949 года стаў працаваць у калгасе «Запаветы Ільіча» Кобрынскага раёна, дзе шмат гадоў быў брыгадзірам паляводчай брыгады. Пад яго кіраўніцтвам брыгада ўвесь час дасягала высокіх вынікаў у вытворчасці і продажы дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1965), медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» (1970), іншымі ўзнагародамі.



**Ардэнаносцы. Белюсь Васіль Лукіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина**. Василий Лукич Белюсь** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981. – (К XXVI съезду КПСС).



**ГІЛЕЦІЧ Якаў Трафімавіч**. Нарадзіўся ў 1906 годзе ў вёсцы Сухоўчыцы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Сухоўчыцы Кобрынскага раёна) у сялянскай сям'і. Працоўную дзейнасць пачаў у бацькоўскай гаспадарцы. З 1944 года знаходзіўся на фронце ў радах Савецкай арміі, удзельнічаў у разгроме гітлераўскай Германіі. У пасляваенныя гады адным з першых уступіў у калгас, дзе шмат гадоў узначальваў жывёлагадоўчую ферму ў калгасе «XXI з'езд КПСС». За высокія паказчыкі ў развіцці грамадскай жывёлагадоўлі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР у 1971 годзе ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

**Ардэнаносцы. Гілеціч Якаў Трафімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Яков Трофимович Гилетич** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Гилетич Яков Трофимович** // Хидры - первый агрогородок на Кобринщине : информационно - аналитический очерк / Кобринская центральная районная библиотека, отдел обслуживания и информации ; сост. Светлана Курачук, гл. библиограф. – Кобрин, 2007. – С. 40. – (Наша гордость, наша слава).



**ГРЫЦУК Васілій Міхайлавіч**. Нарадзіўся ў 1913 годзе ў вёсцы Осаўцы Кобрынскага павета (цяпер Осаўцы Кобрынскага раёна). Да 1940 года працаваў у бацькоўскай гаспадарцы. У 1940 годзе прызваны ў Чырвоную армію. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. За ратныя подзвігі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За адвагу». З 1948 года працаваў у калгасе імя Леніна. Быў старшынёй праўлення калгаса, намеснікам старшыні, з 1967 года - брыгадзір комплекснай брыгады. 16 гадоў узначальваў паляводчую брыгаду, якая па выніках працы была лепшай у раёне.

Яго ратная і працоўная доблесць высока ацэнены. Сярод мірных заслуг ветэрана Вялікай Айчынай вайны В. М. Грыцука - ордэн Чырвонай Зоркі, два ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга і многія іншыя ўзнагароды. У 1978 годзе за поспехі, дасягнутыя ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве па павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве прадукцыі сельскай гаспадаркі, удастоены вышэйшай узнагароды Радзімы - ордэна Леніна.

**Ардэнаносцы. Грыцук Васіль Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Бялоў, Д.** Перажываюць подзвігі герояў / Дзмітрый Бялоў // Героическая Брестчина. – Брест, 2015. - С. 55-58. – (Славим тех, кто Победу ковал).

Сярод мірных заслуг Грыцука В. М. - ордэн Леніна, ордэн Чырвонай Зоркі, два ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга і іншыя ўзнагароды.

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Василий Михайлович Грицук** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Бялоў, Д.** Перажываюць подзвігі герояў / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2015. – 11 лютага. – С. 4.

Сын ветэрана Вялікай Айчынай вайны В. М. Грыцука ўспамінае аб ваенных і працоўных гадах свайго бацькі.

**Бялоў, Д.** На пярэднім краі / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2009. – 29 ліпеня.

Пра Васіля Міхайлавіча Грыцука з в. Асаўцы, ветэрана Вялікай Айчыннай і першага старшыню калгаса «30 гадоў Кастрычніка».

**Сацук, А.** Першы старшыня / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 1998. - 14 сакавіка.

За выдатныя працоўныя заслугі жыхар в. Осаўцы В. М. Грыцук узнагароджаны ордэнам Леніна і двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**ГУК Павел Гаўрылавіч**. Нарадзіўся ў 1936 годзе ў вёсцы Батчы Кобрынскага павета (цяпер Батчы Кобрынскага раёна). Пасля вайны паспяхова закончыў Батчынскую школу, курсы трактарыстаў у Маларыце. Па размеркаванні працаваў у калгасе імя Сталіна механізатарам, потым - у Кобрынскай сельгастэхніцы. З 1962 года быў механізатарам калгаса «Запаветы Ільіча» (цяпер ААТ «Батчы»). Сорак тры гады служыў механізацыі, штогод дасягаў высокіх вытворчых паказчыкаў, неаднаразова з'яўляўся пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод механізатараў калгаса і раёна. За сваю ўдарную працу П. Г. Гук узнагароджаны ў 1971 годзе ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, а ў 1973-м - ордэнам Леніна. Ён уладальнік шматлікіх Ганаровых грамат і падзяк за добрасумленную працу ў сельскай гаспадарцы.



**Ардэнаносцы. Гук Павел Гаўрылавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Павел Гаврилович Гук** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Мельнік, Р**. Яркая падзея мінулай эпохі / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2011. – 5 лістапада. – С. 1, 3.

Уладальнік ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга за добрасумленную працу ў сельскай гаспадарцы, былы механізатар Павел Гук адзначыў 76 дзень нараджэння.

**Піліпава, Г.** Паляводы – жывёлагадоўлі / Г. Піліпава // Камуністычная праца. – 1978. – 13 ліпеня. – С. 1.

У калгасе «Запаветы Ільіча» паспяхова працуе звяно па корманарыхтоўцы, якое ўзначальвае механізатар Павел Гаўрылавіч Гук.

**ДАВІДЗЮК Марыя Емяльянаўна**. Нарадзілася ў 1930 годзе ў вёсцы Бяроза Кобрынскага павета (цяпер Бяроза Кобрынскага раёна). З 1952 года працавала жывёлаводам у калгасе «Перамога» Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Пакроўскі»). Член КПСС з 1966 года. Майстэрства і якасць працы М. Е. Давідзюк неаднаразова былі адзначана высокімі ўзнагародамі Радзімы: медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга - у 1971 годзе, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1975), ордэнам Леніна (1977). Выбіралася дэпутатам мясцовага Савета.



**Ардэнаносцы. Давідзюк Марыя Емяльянаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Мария Емельяновна Давидюк** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Давідзюк, М.** Чалавек, слаўны працай / М. Давідзюк // Камуністычная праца. – 1981. – 21 февраля. - За дасягненне высокіх вынікаў у працы жывёлавод калгаса «Перамога» М. Давідзюк узнагароджана ордэнам Леніна.



**ДАМЕНІКАН Мікалай Уладзіміравіч**. Нарадзіўся 1 сакавіка 1932 года ў вёсцы Грускова Нясвіжскага павета Навагрудскага ваяводства (цяпер Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці). Закончыў Ленінградскі ветэрынарны інстытут (1955), Мінскую ВПШ (1971). З 1955 года працаваў ветэрынарным урачом, старшынёй калгаса «Чырвоная Зара», наменнікам дырэктара саўгаса «Зеляневічы» Ружанскага раёна. У 1965-1971 гадах - першы намеснік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення сельскай гаспадаркі. З 1971 па 1973 год - старшыня Кобрынскага, з 1991 па 1995 год - Баранавіцкага райвыканкамаў, у 1973-1991 гадах - першы сакратар Баранавіцкага райкама КПБ, з 1995 года працаваў галоўным спецыялістам Баранавіцкага райвыканкама. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена за поспехі ў вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі ў зімовы перыяд (1984-1985) і датэрміновае выкананне заданняў XI пяцігодкі. Дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у 1975-1996 гадах. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (двойчы), Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы), «Знак Пашаны», залатым, 3 сярэбранымі і 3 бронзавымі медалямі ВДНГ СССР і іншымі ўзнагародамі.

**Даменікан Мікалай Уладзіміравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 451-452. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**[Доменикан Николай Владимирович**] : [некролог] // Заря. – 2012 - 18 февраля. – С. 4. - Доменикан Н. В. с 1971 по 1973 год возглавлял Кобринский районный исполнительный комитет.



**ДЗЕМІДЗЮК Дзмітрый Мікалаевіч**. Нарадзіўся ў 1935 годзе ў вёсцы Ушкавіца Кобрынскага павета (цяпер Ушкавіца Кобрынскага раёна). З 1954 па 1957 год служыў у Савецкай арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у калгасе на будоўлі. З 1961 года - механізатар калгаса «XXI з’езд КПСС». Неаднаразова выходзіў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод механізатараў раёна. За сваю ўдарную працу ў 1973 годзе быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У 1976 годзе ўдастоены вышэйшай узнагароды Радзімы - ордэна Леніна.

**Ардэнаносцы. Дземідзюк Дзмітрый Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Дмитрий Николаевич Демидюк** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Демидюк Дмитрий Николаевич** // Хидры - первый агрогородок на Кобринщине : информационно-аналитический очерк / Кобринская центральная районная библиотека, отдел обслуживания и информации ; сост. Светлана Курачук, гл. библиограф. - Кобрин, 2007. – С. 41. – (Наша гордость, наша слава).

**ДЗМІТРУК Ганна Якаўлеўна**. Нарадзілася ў 1922 годзе ў вёсцы Барысава Кобрынскага павета (цяпер в. Барысава Кобрынскага раёна). У 1948 годзе адной з першых уступіла ў калгас. Працавала даяркай на жывёлагадоўчай ферме больш за 30 гадоў. Неаднаразова з'яўлялася пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод жывёлаводаў гаспадаркі. За сваю ўдарную працу ўзнагароджана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», у 1971 годзе - вышэйшай узнагародай Радзімы - ордэнам Леніна.



**Ардэнаносцы. Дзмітрук Ганна Якаўлеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Анна Яковлевна Дмитрук** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**ЗАРЭЦКІ Ананій Максімавіч** (1895-1980). Нарадзіўся ў вёсцы Навасёлкі Кобрынскага павета (цяпер Навасёлкі Кобрынскага раёна). Удзельнік Грамадзянскай вайны. У 1921 годзе дэмабілізаваўся. Быў арыштаваны польскімі ўладамі, зняволены ў канцлагер у г. Познань. У 1923 годзе вярнуўся ў родную вёску. У 1939 годзе выбраны старшынёй Акцябрскага сельсавета. У 1941-1946 гадах працаваў на ваенным заводзе ў Самары (Расія). З 1946 па 1955 год - старшыня Іласкага сельсавета, потым старшыня калгаса «Праўда» Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Племзавод «Дружба»). Узнагароджаны ордэнам Леніна, іншымі ўзнагародамі.

**Ардэнаносцы. Зарэцкі Ананій Максімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**ЗАХАРЭВІЧ Валянціна Пятроўна**. Нарадзілася 17 лютага 1925 года ў вёсцы Камароўка Тульскай вобласці. У 1946 годзе закончыла Гур'еўскі тэхналагічны тэхнікум малочнай прамысловасці па спецыяльнасці «тэхналогія малака і малочных прадуктаў». З 1946 па 1950 год працавала ў Дзівіне на малочным заводзе - спачатку старшым лабарантам, потым тэхнолагам. У 1951 годзе назначана тэхнолагам Жабінкаўскага масласырзавода. На гэтай пасадзе працавала да 1956 года. З 1 чэрвеня 1956 года В. П. Захарэвіч - майстар-масларob на Кобрынскім масласырзаводзе. У 1957 годзе назначана на пасаду мікрабіёлага, потым стала загадчыкам лабараторыі завода. У 1969 годзе Валянціна Пятроўна займае пасаду загадчыка вытворчасці, з 1973 года - галоўнага тэхнолага прадпрыемства. На Кобрынскім масласырзаводзе Валянціна Пятроўна працавала 24 гады. За доўгую і паспяховую працу ўзнагароджана ордэнам Леніна, медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», медалём «Ветэран працы», шматлікімі ганаровымі граматамі.



**Корбут, В.** Ветераны Кобринского маслодельно-сыродельного завода. Люди и судьбы [Валентина Петровна Захаревич] / Вячеслав Корбут // ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод». 70 лет (1939-2009) / Вячеслав Корбут. – Минск, 2010. – С. 56.

**Корбут, В.** Их труд отмечен Родиной / Вячеслав Корбут // ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод». 70 лет (1939-2009) / Вячеслав Корбут. – Минск, 2010. – С. 51-52.



**ІАЎЧУК Міхаіл Трыфанавіч** (1908-1990). Нарадзіўся 19 лістапада 1908 года ў вёсцы Завужоўе Кобрынскага павета (цяпер Завужоўе Кобрынскага раёна). Закончыў філасофскае аддзяленне Акадэміі камуністычнага выхавання (1931). У 1936-1939 гадах - кіраўнік кафедраў дыялектычнага матэрыялізму марксізму-ленінізму Маскоўскага хіміка-тэхналагічнага інстытута імя Мендзялеева і Маскоўскай сельскагаспадарчай акадэміі імя Ціміразева. У 1939-1941 гадах - на партыйнай рабоце ў Выканкаме Камінтэрна. У 1941-1947 гадах - ва ўпраўленні прапаганды і агітацыі ЦК ВКП(б), з 1947 па 1949 год - сакратар ЦК КП(б)Б па прапагандзе і агітацыі, член бюро ЦК КП(б)Б. З 1949 па 1970 год вёў навукова-выкладчыцкую работу ў Маскоўскім, Уральскім універсітэтах, Інстытуце філасофіі АН СССР. У 1970-1978 гадах ён рэктар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС, рэдагаваў часопіс «Філасофскія навукі». З 1978 года кансультант Інстытута марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1941-1950 гадах. Узнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі СССР: ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1975), два ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга (1945; 27.03.1954), ордэн Дружбы народаў (20.11.1978), ордэн Чырвонай Зоркі (20.04.1944), ордэн «Знак Пашаны» (12.12.1968), медалі. У 1948 годзе ўзнагароджаны ордэнам Леніна. Прафесар (1939), доктар філасофскіх навук (1946), член-карэспандэнт АН СССР (1946), замежны член Балгарскай АН (1975), партыйны дзеяч. Памёр 9 студзеня 1990 года.

**Иовчук, М. Т.** Философские и социологические взгляды Н. П. Огарева / М. Т. Иовчук. - М., 1957.

**Иовчук, М. Т**. История философии как наука, её предмет, метод и значение / М. Т. Иовчук. - М., 1960.

**Іаўчук** Міхаіл Трыфанавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1998. – Т. 7. – С. 142.

**Іаўчук** Міхаіл Трыфанавіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1972. - Т.5. - С. 26-27.

**Іаўчук** Міхаіл Трыфанавіч // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1981. – Т. 5 : біяграфічны даведнік. – С. 248, 249.

**Іаўчук** Міхаіл Трыфанавіч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 435. – (Імі ганарацца землякі).

**Иовчук** Михаил Трифонович // Большая советская энциклопедия : [в 30 т.]. – М., 1972. – Т. 10. – С. 366.

**Иовчук** Михаил Трифонович // Регионы Беларуси : эницклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская обл. : в 2-х кн. - Минск, 2009. - Кн.1. - С. 431.

**Иовчук** Михаил Трифонович // Философский энциклопедический словарь. - Москва, 1983. – С. 220.

**Корнилович, Э. А.** Политики и учёные. Иовчук Михаил Трифонович / Э. А. Корнилович // Беларусь: созвездие политических имён : историко-биографический справочник / Э. А. Корнилович. – Минск, 2009. – С. 342-343 : фото.

**Іаўчук Міхаіл Трыфанавіч** (1908, Кобр. р-н – 1990), вучоны ў галіне філасофіі, член-карэспандэнт АН СССР, замежны член Балгарскай АН – 110 гадоў з дня нараджэння // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. – 2017. - № 9. – С. 19. – (Дадатак. Беларускі каляндар, 2018 год).

**Іаўчук Міхаіл Трыфанавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук. - Кобрын, 2017. - С. 49-51.

**КАЗЛОВІЧ Віталій Кірылавіч**. Нарадзіўся ў 1932 годзе ў вёсцы Іласк Кобрынскага павета (цяпер Ілаўск Кобрынскага раёна). Працоўную дзейнасць пачаў у 1949 годзе. Пасля службы ў Савецкай арміі (1951-1954) вярнуўся ў калгас «Праўда» Кобрынскага раёна, дзе больш за 20 гадоў узначальваў паляводчую брыгаду. Віталій Кірылавіч шмат зрабіў для павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, укаранення ў вытворчасць дасягненняў навукі і перадавога вопыту. За поспехі, дасягнутыя ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці, ён узнагароджаны ў 1970 годзе медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», у 1971 годзе - ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У 1972 годзе Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР адзначаны вышэйшай узнагародай Радзімы - ордэнам Леніна.



**Ардэнаносцы. Казловіч Віталь Кірылавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Виталий Кириллович Козлович** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**КАМЯЛЕЎСКАЯ Ганна Сяргееўна**. Нарадзілася ў 1922 годзе ў вёсцы Андронава Кобрынскага павета (цяпер Андронава Кобрынскага раёна). Перад Вялікай Айчыннай вайной пераехала ў Казахстан, дзе працавала даяркай у адным з саўгасаў. Пасля вайны вярнулася ў родную вёску і працавала ў калгасе, з 1962 года - на Кобрынскай птушкафабрыцы. Працоўная дзейнасць Г. С. Камялеўскай адзначана высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. У 1970 годзе яна ўзнагароджана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», у 1971-м - ордэнам Леніна, у 1973-м - ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.



**Ардэнаносцы. Камялеўская Ганна Сяргееўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Анна Сергеевна Камелевская** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**КАРАНЧУК Павел Рыгоравіч** (1924-2012). Нарадзіўся 11 кастрычніка 1924 года ў вёсцы Магдалін Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Магдалін Кобрынскага раёна) у сям'і сялян. Да вайны атрымаў сямігадовую адукацыю. Па заканчэнні рускамоўнай школы ў горадзе Кобрыне атрымаў у сельскім савеце накіраванне на вучобу ў ФЗА г. Магілёва. Аднак вучыцца не прыйшлося: у самым пачатку лета памёр бацька, а праз два тыдні пачалася Вялікая Айчынная вайна. Пасля вызвалення родных мясцін ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Павел Каранчук быў адпраўлены на аднаўленне Дняпроўска-Бугскага канала. З 1947 па 1948 год ён сакратар камсамольскай арганізацыі Кіселявецкага сельскага Савета. У 1949 годзе ўступіў у рады камуністычнай партыі. З 1948 года (у 23 гады) Павел Каранчук быў выбраны першым старшынёй калгаса «Новы шлях» Кобрынскага раёна, які нязменна ўзначальваў на працягу 36 гадоў. Калгас «Новы шлях» быў у ліку тых гаспадарак, на базе якіх праводзіліся рэспубліканскія семінары па сельскай гаспадарцы. Павел Рыгоравіч неаднаразова выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, чатыры скліканні выбіраўся дэпутатам Кобрынскага раённага Савета народных дэпутатаў, шмат разоў - дэпутатам Кіселявецкага сельскага Савета народных дэпутатаў. Яркі і плённы працоўны шлях П. Р. Каранчука адзначаны



**ВІШНЕЎСКІ Станіслаў Станіслававіч**. Працаваў качагарам вытворчых печаў Кобрынскага хлебакамбіната абласнога вытворчага аб'яднання хлебапякарнай прамысловасці. У 1975 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров пред¬приятий и организаций Министерства пищевой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1375-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Вишневского Станислава Станиславовича - кочегара производственных печей Кобринского хлебокомбината областного производственного объединения хлебопекарной промышленности - орденом Трудовой Славы III степени.

**ВОБЛІКАВА Ганна Цімафееўна**. Працавала каландроўшчыцай на Кобрынскай ткацкай фабрыцы «Чырвоны сцяг». У 1976 годзе ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций местной промышленности : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 2 марта 1976 г., № 3539-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Вобликову Анну Тимофеевну – каландровщицу Кобринской ткацкой фабрики «Красное знамя» - орденом «Знак Почёта».

**ВОРАН Васілій Еўдакімавіч** (1907-1997). Нарадзіўся ў вёсцы Літвінкі Кобрынскага павета (цяпер Літвінкі Батчынскага сельсавета Кобрынскага раёна) у сям'і сялян. У 1940 годзе выбраны першым старшынёй калгаса «Запаветы Ільіча» Кобрынскага раёна (ААТ «Батчы»). Пад час Вялікай Айчыннай вайны - сувязны партызанскага атрада імя Чапаева. Пасля вайны прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі калгаса. З 1948 года працаваў старшынёй калгаса «За Радзіму». З красавіка 1953 па 1978 год працаваў брыгадзірам комплекснай брыгады ў в. Літвінкі калгаса «Запаветы Ільіча». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі «За доблестную працу», «Ветэран працы», «20 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР «За поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі», іншымі граматамі. Выбіраўся дэлегатам III з'езда калгаснікаў Беларусі ў 1969 годзе. З 1950 па 1977 год выбіраўся

дэпутатам сельскага Савета народных дэпутатаў. З'яўляўся персанальным пенсіянерам мясцовага значэння.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Воран Васіль Еўдакімавіч** [Электронны рэсурс] // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - (Вызначыліся працай).

**ВОРАН Віктар Якаўлевіч.** Нарадзіўся ў 1932 годзе. Працаваў трактарыстам у ПМК-52 Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.



**Лукашик, П. И.** Прошлое и настоящее / Петр Иосифович Лукашик. – Брест : Брестская типография, 2002. – 48 с.
См. на с. 33.
**Ворон Виктор Яковлевич** : список ветеранов ПМК-52 УП «Брестводстрой», награжденных высокими правительственными наградами. – Кобрин, 2001.

**ВЫШЫНСКАЯ Надзея Іванаўна.** Нарадзілася 24 лютага 1954 года. Жыве ў вёсцы Луцэвічы Кобрынскага раёна. Працавала брыгадзірам паляводчай брыгады, загадчыкам фермы, начальнікам вытворчага ўчастка ААТ «Агра-Кобрынскае». Стараста вёскі Луцэвічы. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Сацук, А**. Подснежники у дома / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. – 2006. – 22 красавіка. - С. 1-2.
Начальник производственного участка ОАО «Агро-Кобринское» и староста деревни Луцевичи Н. И. Вышинская - чуткий и отзывчивый человек.
**З сяўбой** збожжавых управіліся // Кобрынскі веснік. - 2001. - 14 красавіка.
Начальнік участка калгаса «Кобрынскі» Надзея Вышынская добра валодае тэхналогіяй раслінаводства.

**ГАЛАВАНАВА Галіна Валянцінаўна.** Працавала закройшчыцай на Кобрынскім камбінаце бытавога абслугоўвання насельніцтва. У 1975 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий бытового обслуживания населения : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1385-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.
Голованову Галину Валентиновну - закройщицу Кобринского комбината бытового обслуживания населения - орденом Трудовой Славы III степени.

**ГАЛАШКА Аляксей Аляксандравіч.** Працаваў механізатарам у калгасе імя Мічурына Кобрынскага раёна (ААТ «Астромічы»). На ўсіх сельскагаспадарчых аперацыях хлебароб бездакорна спраўляўся з пастаўленымі задачамі. За добрасумленную і плённую працу ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнагароджаны медалямі «За доблесную працу», «Ветэран працы», ордэнам «Знак Пашаны». Дзяржаўныя адзнакі за працоўныя дасягненні зіхацяць на парадным пінжаку разам з ордэнам Айчыннай вайны III ступені, медалямі, якіх удастоены Аляксей Галашка за вайсковую службу.

**Пянко, А.** Медаль за працу і за бой / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2003. – 8 мая. – С. 2. - За добрасумленную плённую працу ў сельскагаспадарчай вытворчасці А. А. Галашка ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**ГАЛЕНКА Ганна Міхайлаўна.** Працавала аператарам свінагадоўчага комплексу ў калгасе «Зара» (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Галенка Ганна Міхайлаўна** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

Галенка Ганна Міхайлаўна ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**ГАМЯНЮК Вольга Васільеўна**. Нарадзілася 20 красавіка 1926 года. Жыла ў вёсцы Лягаты Кобрынскага раёна. Працавала свінаркай, даяркай. Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені, ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За працоўную адзнаку».

**Гамянюк Вольга Васільеўна** : інфармацыя Імянінскай інтэграванай публічнай бібліятэкі. – Імянін, 2019.

**ГАНЧАРОЎ Валянцін Барысавіч**. Нарадзіўся 11 лістапада 1940 года. Працаваў кавалём, майстрам на Кобрынскім інструментальным заводзе. У 1975 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені. Кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 24 апреля 1975 г., № 1434-IX 1975 г. // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Гончарова Валентина Борисовича - кузнеца Кобринского инструментального завода - орденом Трудовой Славы III степени.

**Амельянюк, М.** Завысокую дысцыпліну працы / М. Амельянюк // Камуністычная праца. – 1980. – 20 мая. – С. 2.

Многім рабочым даў пуцёўку ў жыццё кавалер ордэна Працоўнай Славы III ступені каваль В. Б. Ганчароў.

**ГАРАВЫ Арцём Сямёнавіч.** Нарадзіўся ў 1915 годзе ў вёсцы Кісялёўцы Кобрынскага павета (цяпер в. Кісялёўцы Кобрынскага раёна). Калі ў вёсцы арганізавалі калгас «Камунар», тры гады кіраваў калектыўнай гаспадаркай. Потым працаваў трактарыстам, брыгадзірам паляводчай брыгады, скотнікам у калгасе »Новы шлях». Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, ордэнам Чырвонай Зоркі і юбілейнымі медалямі.

**Гаравы Арцём Сямёнавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 256. - (Яны прайшлі дарогамі вайны).

**Деревнюк, М.** Спасибо за мирное небо / Мария Деревнюк // Кобрынскі веснік. – 2005. – 29 чэрвеня.

О ветеране Великой Отечественной войны А. С. Горевом.

**ГАРДЗЯЮК Якаў Раманавіч.** Працаваў трактарыстам у калгасе »Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Гардзяюк Якаў Раманавіч** : інфармацыя Кіселявецкага сельсавета. – Кісялёўцы, 2019.

**ГВАЙ Мікалай Міхайлавіч**. Нарадзіўся 14 мая 1931 года ў вёсцы Парасляны Пружанскага раёна. Закончыў Брэсцкі педінстытут. Працаваў у калгасе «Усход» настаўнікам. У 1955-1959 гадах - другі сакратар Шарашоўскага, потым першы сакратар Пружанскага райкамаў ЛКСМБ. Пасля заканчэння ў 1963 годзе Мінскай ВПШ працаваў у апараце абласнога камітэта КПБ. З 1966 года першы сакратар Ганцавіцкага РК КПБ, у 1977-1985 гадах - Кобрынскага гаркама КПБ. З 1981 па 1985 год - старшыня Брэсцкага абласнога савета прафсаюзаў. У 1991-1994 гадах - у апараце абласнога Савета народных дэпутатаў. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР X склікання. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай рэвалюцыі, «Знак Пашаны», медалямі.



**Гвай Мікалай Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 451. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Гвай Николай Михайлович** : [некролог] // Кобрынскі веснік. – 2011. – 22 кастрычніка. – С. 3.

**ГЕЛЯМЕНТ Ніна Андрэеўна.** Нарадзілася 21 ліпеня 1954 года ў вёсцы Рыбна Кобрынскага раёна. Працавала брыгадзірам жывёлагадоўчай брыгады ў калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» (1986), ордэнам Працоўнай Славы III ступені, медалём ВДНГ СССР (1987).

**Гелемент Нина Андреевна** : список ветеранов ОАО «Киселевцы», награжденных высокими правительственными наградами. – Киселевцы, 2012.

**ГІЛЕВІЧ Валянціна Аляксееўна**. Нарадзілася 24 кастрычніка 1946 года. Працавала на Кобрынскай швейнай фабрыцы. Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Гилевич Валентина Алексеевна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**ГІЛЁВА Надзея Дзмітрыеўна**. Нарадзілася 4 лістапада 1944 года. Жыла ў вёсцы Імянін Кобрынскага раёна. Працавала цялятніцай, даяркай. Была першай даяркай у саўгасе, якая надаіла ад групы кароў 1000 цэнтнераў малака. За шматгадовую самаадданую працу даяркай на малочнатаварнай ферме вёскі Імянін узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, ордэнам «Знак Пашаны».

**Дабрагост, І.** Па працы і пашана / Ірына Дабрагост // Камуністычная праца. – 1986. – 1 чэрвеня.

За шматгадовую самаадданую працу даяркай на малочнатаварнай ферме вёскі Імянін Н. Д. Гілёва ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

**Гілёва Надзея Дзмітрыеўна** : інфармацыя Імянінскай інтэграванай публічнай бібліятэкі. – Імянін, 2019.

**ГЛІНСКАЯ Лідзія Мітрафанаўна.** Нарадзілася 23 чэрвеня 1935 года. Працавала ў аграфірме «Беларусь» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны».

**Глинская Лидия Митрофановна** : информация Кобринского районного совета ветеранов. – Кобрин, 2020.

**ГЛІНСКІ Іван Яўціхавіч**. Працаваў у аграфірме «Беларусь». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны».

**Глинский Иван Евтихович** : информация Кобринского районного совета ветеранов. – Кобрин, 2020.

**ГРЫБ Еўдакія Раманаўна**. Працавала даяркай Бярозаўскай малочнатаварнай фермы калгаса «Перамога» Кобрынскага раёна. Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва 1976 года, 1979 года, ударнік X пяцігодкі. Тады яе праца была высока ацэнена, да ўжо атрыманых узнагарод прыбавіўся ордэн «Знак Пашаны». Як адна з лепшых даярак раёна Е. Р. Грыб была дэлегатам IV Усесаюзнага з'езда калгаснікаў.

**Сацук, А.** З душой да справы / А. Сацук // Камуністычная праца. – 1988. – 12 красавіка. - Высока ацэнена праца даяркі Бярозаўскай малочнатаварнай фермы калгаса «Перамога» Е. Р. Грыб, да ўжо атрыманых узнагарод прыбавіўся ордэн «Знак Пашаны».

**ГРЫГОРЫК Мікіта Георгіевіч.** Нарадзіўся ў 1924 годзе ў вёсцы Завужоўе Кобрынскага павета (цяпер Завужоўе Кобрынскага раёна). Ветэран Вялікай Айчыннай вайны. 35 гадоў працаваў на Тэвельскай чыгуначнай станцыі. Быў і абходчыкам, і манцёрам, і старшым манцёрам, у апошнія гады перад пенсіяй - памочнікам брыгадзіра. Апроч ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга і мноства юбілейных медалёў за добрасумленную працу, ёсць у Мікіты Георгіевіча і медалі «За адвагу», «За Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне», а таксама ордэн Чырвонай Зоркі.

**Тимошук, А.** Трудолюбивый монтер и военный снайпер / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2017. - 4 студзеня. - С. 5.

**ГРЫНЕВІЧ Мікалай Кірылавіч.** Ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Час работы галоўным аграномам у былым калгасе «Шлях Леніна» быў адзначаны высокімі ўраджаямі льну, што і пацверджана ордэнам «Знак Пашаны». У 1969 годзе прызначаны дырэктарам племсаўгаса «Дружба».

**Хільчук, М.** Так трымаць, ветэран! / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2005. – 9 лютага – С. 2 : фат.

**ГРЫЦУК Васілій Аляксеевіч**. Працаваў трактарыстам у калгасе «Сцяг Леніна» Кобрынскага раёна (ААТ «Навасёлкаўскі»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ў 1972 годзе.

**Грыцук Васіль Аляксеевіч** : інфармацыя Навасёлкаўскай публічнай бібліятэкі. – Навасёлкі, 2019.

**ГРЫЦУК Міхаіл Сцяпанавіч**. Працаваў трактарыстам у калгасе «Зара» (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Грыцук Міхаіл Сцяпанавіч** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

**ГРЫЦУК Павел Сцяпанавіч.** Нарадзіўся 17 чэрвеня 1939 года ў вёсцы Барысава Кобрынскага павета (цяпер в. Барысава Кобрынскага раёна). Працаваў трактарыстам у калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973).

**Грицук Павел Степанович** : список ветеранов ОАО «Киселевцы», награжденных высокими правительственными наградами. – Киселевцы, 2012.

**ГРЫШКО Кацярына Дзямідаўна.** Працавала швачкай-матарысткай на Кобрынскай швейнай фабрыцы. Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций Министерства легкой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 4 марта 1976 г., № 3554-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Гришко Екатерину Демидовну - швею-мотористку Кобринской швейной фабрики – орденом Трудовой Славы III степени.

**ГУБЕНСКІ Мікалай Пятровіч** (1933-2018). Нарадзіўся 8 мая 1933 года ў вёсцы Варатынічы Кобрынскага павета (цяпер в. Варатынічы Кобрынскага раёна. З 1951 па 1956 год працаваў паляводам у калгасе «Кастрычнік», з 1957 года – жывёлаводам. За выдатныя паказчыкі па адкорму бычкоў мае знакі «Ударнік пяцігодкі» за 1985 год, 1987 год, быў занесены на раённую Дошку Гонару. За працоўныя поспехі ў 1975 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. За дасягнутыя поспехі ў развіцці народнай гаспадаркі СССР Галоўны камітэт ВДНГ СССР узнагародзіў М. П. Губенскага бронзавым медалём.



**Губенскі Мікалай Пятровіч** : інфармацыя Акцябрскай публічнай інтэграванай бібліятэкі. – Акцябр, 2019.

**ГУЛЬ Аляксандр Андрэевіч**. Працаваў брыгадзірам слесараў Кобрынскага інструментальнага завода. У 1975 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 24 апреля 1975 г., № 1434-IX 1975 г. // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Гуля Александра Андреевича - бригадира слесарей Кобринского инструментального завода - орденом Трудовой Славы III степени.

**ГУРСКІ Віталій Веньямінавіч.** Працаваў токарам ў Кобрынскай райсельгастэхніцы. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка.

Токар райсельгастэхнікі В. В. Гурскі ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**ГУРЫШ Мікалай Васільевіч**. Нарадзіўся 27 студзеня 1931 года. Працаваў на племзаводзе «Дружба». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Гуриш Николай Васильевич** : списки ветеранов РУСП «Племенной завод «Дружба», награжденных правительственными наградами. – Лука, 2008.

**ГУЦАЎ Анатолій Емяльянавіч** (1935-1996). Нарадзіўся 31 студзеня 1935 года ў



вёсцы Мільча Гомельскага раёна. З адзнакай закончыў школу, затым - Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. Малады навуковец-аграном працаваў на Шэрашаўскай МТС, затым ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі Пружанскага райвыканкама. Вучыўся ў аспірантуры, пісаў кандыдацкую дысертацыю. З 1958 па 1975 год працаваў старшынёй калгаса «Зара» Кобрынскага раёна (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). За гады сваёй працы адсталую гаспадарку зрабіў передавым сельгаспрадпрыемствам не толькі ў маштабах Кобрынскага раёна, але і Брэсцкай вобласці. Пісьменны, энергічны, мэтанакіраваны, адважны кіраўнік, ён не баяўся брацца за маштабныя задачы і даводзіў пачатую справу да канца, укараняў у практыку передавыя ідэі і тэхналогіі, клапаціўся пра побыт і адпачынак калгаснікаў. А. Е. Гуцаў шмат зрабіў для сваёй гаспадаркі і яе работнікаў. Дзякуючы яго намаганням і ініцыятыве першай у Кобрынскім раёне была газіфікавана веска Хідры, пабудаваны свінагадоўчы комплекс, каўбасны цэх, наладжана вытворчасць будаўнічых матэрыялаў і г. д. У 1971 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Гуцев Анатолий Емельянович** // Хидры - первый агрогородок на Кобринщине : информационно - аналитический очерк / Кобринская центральная районная библиотека, отдел обслуживания и информации ; сост. Светлана Курачук, гл. библиограф. – Кобрин, 2007. – С. 41. – (Наша гордость, наша слава).

**Васюк, Н.** Турнир имени Анатолия Гуцева / Наталья Васюк // Кобрин-информ. – 2009. – 5 февраля.

**Мельнік, Р.** Добрае імя не забываецца / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2009. – 4 лютага.

У в. Хідры прайшоў міжнародны турнір па міні-футболу памяці былога старшыні калгаса «Зара» А. Гуцава.

**Вслед** за «Икаром» // Кобрин-информ. – 2005. – 17 февраля. – С. 3.

Отзывы читателей газеты «Кобрин-информ» на публикацию о бывшем пред¬седателе колхоза «Заря».

**Сущук, А**. Икар эпохи социализма / Алексей Сущук // Кобрин-информ. – 2005. – 27 января (№ 4). – С. 3.

Трагическая судьба Анатолия Гуцева, принявшего под свое руководство отстающий колхоз «Заря».

**Сущук, А**. Опередивший время / Алексей Сущук // Белорусская нива. – 2005. – 17 мая. – С. 2.

Об Анатолие Емельяновиче Гуцеве.

**ДАВІДОВІЧ Віталій Іванавіч** (1926-1997). Нарадзіўся 18 жніўня 1926 года ў вёсцы Вуліца Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. 25 красавіка 1944 года быў вывезены ў Германію, дзе знаходзіўся ў лагеры да 30 сакавіка 1945 года. У 1949 годзе закончыў Жыровіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум. З 1951 па 1953 год - намеснік старшыні калгаса імя Андрэева, старшы аграном раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі і нарыхтовак Антопальскага раёна. З 1961 па 1978 год - старшыня калгаса «Праўда» Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Племзавод «Дружба»). Старшыня раённай арганізацыі непаўналетніх вязняў фашызму, старшыня арганізацыі ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл калгаса «Праўда». Працоўная дзейнасць Віталя Іванавіча высока ацэнена дзяржавай. Ён узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», двума медалямі, Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

**Виталий Иванович Давидович** : [некролог] // Кобрынскі веснік. – 1997. - 25 студзеня. - С. 3.

Ушел из жизни В. И. Давидович, кавалер ордена «Знак Почёта», Трудового Красного Знамени.

**ДАМБРОЎСКІ Андрэй Мікалаевіч**. Працаваў у бульбаводчым звяне калгаса «Сцяг Леніна» Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Навасёлкаўскі»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка.

Працаўнік бульбаводчага звяна калгаса «Сцяг Леніна» А. М. Дамброўскі ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**ДАРОЖКІНА Вера Іванаўна**. Працавала аграномам у калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Дарожкіна Вера Іванаўна** : інфармацыя Кіселявецкага сельсавета. – Кісялёўцы, 2019.

**ДЗЕМЯНЧУК Аляксей Максімавіч**. Нарадзіўся ў вёсцы Багуславічы (цяпер Залуззе) Жабінкаўскага раёна. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў партызанам атрада імя Фрунзе, потым сувязістам у палку сувязі. За доўгія гады працы, дзесяць з якіх пасля афіцыйнага выхаду на пенсію, працаваў у Кобрынскім раённым вузле электрычнай сувязі. За працоўныя дасягненні памочнік начальніка ўчастка раённага вузла сувязі А. М. Дземянчук узнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы ІІІ і ІІ ступені, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

**Хільчук, М.** З адданасцю Айчыне – у час вайны і міру / Марыя Хількевіч // Кобрынскі веснік. – 2004. – 17 ліпеня. – С. 4.

За працоўныя дасягненні памочнік начальніка ўчастка Кобрынскага раённага вузла электрычнай сувязі А. М. Дземянчук узнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы ІІІ і ІІ ступені, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

**ДЗЕНІСЮК Мікалай Васільевіч**. Закончыўшы Мяфёдавіцкую базавую школу, Мікалай Дзенісюк пайшоў працаваць сакратаром Гарадзецкага сельвыканкама, які пазней і ўзначаліў. Далей была тэрміновая служба ў арміі. Вярнуўшыся ў родныя Мяфёдавічы, прымаў непасрэдны ўдзел у аднаўленні калгаса імя Дзяржынскага. Яго лідарскія рысы

яшчэ больш праявіліся на новай пасадзе — брыгадзіра паляводчай брыгады. Працы на зямлі ён аддаў 44 гады. Пад кіраўніцтвам свайго брыгадзіра паляводы дабіваліся высокіх стабільных ураджаяў. Мікалай Дзенісюк атрымаў прафесію агранома ў Пружанскім саўгас-тэхнікуме. Працавітасць, уменне гуртаваць людзей і адстойваць сваю пазіцыю - не толькі гэтыя якасці выклікалі пашану вяскоўцаў да Мікалая Дзенісюка. Ён быў выдатным спеваком, іграў на баяне, удзельнічаў у хоры калгаснікаў, кіраўніком якога была жонка і які выступаў са сваімі канцэртамі нават на ўсесаюзных пляцоўках. М. В. Дзенісюк - кавалер такіх высокіх узнагарод, як ордэн «Знак Пашаны», ордэн «Працоўнага Чырвонага Сцяга».

**Дубіна, Л.** Хто, калі не ты / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2018. — 15 жніўня. — С. 4.

Жыхар в. Мяфёдавічы М. В Дзенісюк — уладальнік ордэна «Працоўнага Чырвонага Сцяга», ордэна «Знак пашаны».

**Дзенісюк Мікалай Васільевіч** : інфармацыя Гарадзецкай публічнай бібліятэкі-філіяла. – Гарадзец, 2019.

**ДЗМІТРУК Васілій Васільевіч**. Нарадзіўся ў 1929 годзе. З 1950 па 1963 год



працаваў паляводам у калгасе «Шлях да камунізму», з 1964 по 1974 – конюхам, з 1975 года - даглядчыкам жывёлы па адкорму маладняка КРС. Узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку». Ударнік камуністычнай працы. У 1988 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Дмитрук Василий Васильевич** // История колхоза «Путь к коммунизму». – 1986.

**ДЗМІТРУК Марыя Савельеўна**. Працавала намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце сярэдняй школы № 5 г. Кобрына. У 1976 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**О награждении** орденами и медалями СССР работников народного образования Министерства просвещения СССР : Указ Верховного Совета СССР, 15 марта 1976 г., № 3682-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Дмитрук Марию Савельевну - заместителя директора по учебно-воспитательной работе средней школы № 5 – орденом Трудового Красного Знамени.

**ДЗМІТРУК Фёдар Рыгоравіч**. Нарадзіўся 15 студзеня 1932 года ў вёсцы Кісялёўцы Кобрынскага павета (цяпер в. Кісялёўцы Кобрынскага раёна). Працаваў трактарыстам-машыністам у калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), медалём «За доблесную працу» (1970). Неаднаразовы пераможца сацыялістычнага спаборніцтва.

**Дмитрук Федор Григорьевич** : список ветеранов ОАО «Киселевцы», награжденных высокими правительственными наградами. – Киселевцы, 2012.

**ДЗ’ЯКАЎ Іван Гаўрылавіч.** Нарадзіўся 30 чэрвеня 1937 года. Працаваў у Кобрынскім райспажыўсаюзе. Пражывае ў в. Астромічы Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1971).

**Дьяков Иван Гаврилович** : список награжденных работников Кобринского райпо. – Кобрин, 2012.

**ДРЫК Сцяпан Іларыёнавіч.** Працаваў трактарыстам-машыністам у калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1976).

**Дрык Сцяпан Іларыёнавіч** : інфармацыя Кіселявецкага сельсавета. – Кісялёўцы, 2019.

**ДРЫК Яфімія Аляксееўна.** Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Дрык Яфімія Аляксееўна** : інфармацыя Кіселявецкага сельсавета. – Кісялёўцы, 2019.

**ДУБАЧ Марыя Матвееўна.** Нарадзілася 23 студзеня 1950 года. Працавала на племзаводзе «Дружба» Кобрынскага раёна (цяпер КСУП «Племянны завод «Дружба»). Пражывае ў вёсцы Смалярня Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**Дубач Мария Матвеевна** : списки ветеранов РУСП «Племенной завод «Дружба», награжденных правительственными наградами. – Лука, 2008.

**ДУБІНА Іван Рыгоравіч**. Нарадзіўся 10 чэрвеня 1930 года. Пражывае ў вёсцы Дубіны Кобрынскага раёна. Працаваў у калгасе імя Кірава. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны».

**Дубина Иван Григорьевич** : информация Кобринского районного совета ветеранов. – Кобрин, 2020.

**ДУБІНКА Іван Іванавіч**. Працаваў слесарам у калгасе «Зара» Кобрынскага раёна (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Дубінка Іван Іванавіч** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

**ДУБІНКА Марыя Паўлаўна.** Працавала галоўным заатэхнікам у калгасе «Зара» Кобрынскага раёна (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Дубінка Марыя Паўлаўна** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

**ДУБЧУК Фёдар Сцяпанавіч.** Нарадзіўся ў вёсцы Залессе Кобрынскага раёна. Сем класаў Залескай сярэдняй школы закончыў з пахвальнай граматай. Паступіў у Кіеўскі геолагаразведачны тэхнікум, на аддзяленне геафізікі. Пасля заканчэння тэхнікума ў 1956 годзе размеркаваўся ў г. Новасібірск. У сувязь прыйшоў у 1962 годзе. Тады ж паступіў ва Усесаюзны завочны электратэхнічны інстытут сувязі ў Маскве. Вучыўся і працаваў: акумулятаршчыкам, старшым электрамеханікам, начальнікам лінейна-тэхнічнага ўчастка гарадской тэлефоннай сувязі, начальнікам ЭТУС, які абслугоўваў чатыры раёны. У 1987 годзе ўзначаліў раённы вузел сувязі, у 1997-м - раённы вузел электрычнай сувязі. Пачынаючы з 1997 года, Кобрынскі РВЭС па выніках дзейнасці сістэматычна выходзіў на першае месца ў вобласці. Сам Фёдар Сцяпанавіч мае таксама шмат адзнак сваёй працы, у тым ліку такія, як знак выдатніка спаборніцтва Міністэрства сувязі СССР, званне майстра сувязі. У 2001 годзе атрымаў высокую дзяржаўную ўзнагароду рэспублікі – ордэн Пашаны.

**Васюк, Н.** Связь – моя жизнь / Н. Васюк // Кобрин-информ. – 2002. – 20 июня. – С. 2.

Так говорит начальник РУЭС Ф. С. Дубчук и добавляет: «Она у меня счастливая».

**Хільчук, М.** Універсітэты Фёдара Дубчука / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2001. – 18 ліпеня. – С. 2.

**ДУДАРУК Валянцін Рыгоравіч.** Нарадзіўся 2 красавіка 1937 года. Працаваў інжынерам-тэхнолагам Кобрынскага ўпраўлення магістральных газапровадаў ААТ «Белтрансгаз», начальнікам газакампрэсарнай службы. У 2000 годзе ўзнагароджаны орэнам Пашаны.

**Аб узнагароджанні** работнікаў Беларускага дзяржаўнага прадпрыемства па транспарціроўцы і пастаўцы газу «Белтрансгаз» дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь : Указ Президента Республики Беларусь,11 ноября 2000 г., № 591 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – Минск, 2020.

Узнагародзіць ордэнам Пашаны Дударука Валянціна Рыгоравіча - інжынера-тэхнолага Кобрынскага ўпраўлення магістральных газаправодаў.

**Мельнік, Р.** Шляхам прагрэсу і сацыяльнага развіцця / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2009. – 4 лістапада. – С. 2.

Не забыты на прадпрыемстве ветэраны працы, якія сваім плёнам і намаганнямі ўнеслі важкі ўклад у развіццё Кобрынскага УМГ, сярод якіх Валянцін Дударук (узнагароджаны ордэнам Пашаны).

**Дударук Валентин Григорьевич** : список ветеранов Кобринского УМГ ОАО «Белтрансгаз», награжденных правительственными наградами. – Кобрин, 2008.

**ДУДЗІК Павел Васільевіч.** Працаваў шафёрам аўтамабіля аутакалоны № 2435 у горадзе Кобрыне. У 1976 годзе за працоўныя дасягненні ўзнагароджаны ордэнам «Знак пашаны».

**О награждении** орденам и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций автомобильного транспорта и дорожного хозяйства : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 4 марта 1976 г., № 3563-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Дудика Павла Васильевича – водителя автомобиля автоколлонны № 2435 – орденом «Знак почета».

**ДУДЗІК Уладзімір Захаравіч** (1932-2001). Нарадзіўся 27 кастрычніка 1932 года ў вёсцы Вартыцк Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1961 годзе закончыў Мінскую ВПШ. З 1952 года інструктар Пінскага абкама, з 1953 года першы сакратар Целяханскага райкама, з 1961 года інструктар Брэсцкага абкама КПБ. З 1962 года на партыйнай і савецкай рабоце ў Кобрынскім раёне: старшыня райвыканкама (1968-1971), першы сакратар райкама КПБ (1971-1974). У 1974-1991 гадах працаваў у Брэсцкім абкаме КПБ. З 1991 года - начальнік юрыдычнага аддзела ААТ «Брэсцкі электрамеханічны завод». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), «Знак Пашаны» (1974).



**Дудзік Уладзімір Захаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 452. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**ДУДКО Канстанцін Максімавіч**. Працаваў механізатарам у калгасе «Запаветы Ільіча» Кобрынскага раёна. За ўдарную шматгадовую працу ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Городецкий, В.** Из мастеров мастер / В. Городецкий // Заря. – 1981. – 1 июля. – С. 1.

Орден Трудового Красного Знамени, медали — это награды механизатора К. М. Дудко из колхоза «Заветы Ильича» за ударный многолетний труд.

**ДУЛЬКО Ганна Емельянаўна**. Нарадзілася 10 кастрычніка 1930 года. Працавала на Кобрынскай швейнай фабрыцы (цяпер філіял ААТ «Магатэкс» у г. Кобрыне). Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны».

**Дулько Анна Емельяновна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**ЖАРЫНА Надзея Іванаўна.** Нарадзілася 6 ліпеня 1949 года. Працавала на Кобрынскай швейнай фабрыцы (цяпер філіял ААТ «Магатэкс» у г. Кобрыне). Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Жарина Надежда Ивановна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**ЖДАНАЎ Аляксандр Мацвеевіч.** Працаваў токарам інструментальнага вытворчага аб'яднання. Працоўны стаж - 30 гадоў, 22 з іх - на інструментальным заводзе. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, значкамі ўдарніка дзевятай пяцігодкі, пераможца сацыялістычнага спаборніцтва 1975 года, 1976 года, 1977 года.

**Амельянюк, М.** Завысокую дысцыпліну працы / М. Амельянюк // Камуністычная праца. – 1980. – 20 мая. – С. 2.

Многім рабочым даў пуцёўку ў жыццё кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга А. М. Жданаў.

**Акімава, В.** Яго званне – рабочы / В. Акімава // Камуністычная праца. – 1978. – 13 ліпеня. – С. 2.

Токар інструментальнага вытворчага аб'яднання А. М. Жданаў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, яму аказана высокае давер'е - працаваць з асабістым кляймом.

**ЖУК Аляксандра Рыгораўна.** Жыхарка в. Павіцце. Свінарка. Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені (1975), ордэнам Працоўнай Славы II ступені (1977).

**Кузич, М. М.** Моя малая Родина – с. Повитье : исторические повествования. Жук Александра Григорьевна. Работники сельского хозяйства, награждённые орденами [Электронный ресурс] / Михаил Миронович Кузич // Одноклассники. Михаил Кузич. – Режим доступа: https://ok.ru/profile/564323201431. – Дата доступа: 28.07.2020.

**ЖУК Павел Антонавіч**. Нарадзіўся ў 1931 годзе. З 1957 па 1964 год працаваў у паляводстве, з 1965 года – шафёр у калгасе «Арэхаўскі». Неаднаразовы пераможца ў сацыялістычным спаборніцтве. Атрымаў знак «Ударнік IX пяцігодкі». У 1976 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.



**Жук Павел Антонавіч** : інфармацыя Павіццеўскай публічнай бібліятэкі. – Павіцце, 2019.

**ЖУРАЎ Мікалай Дзмітрыевіч** (1929-1997). Нарадзіўся 10 студзеня 1929 года. З 1963 па 1978 год працаваў старшынёй калгаса «Сцяг Леніна». У 1972 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Жураў Мікалай Дзмітр**ыевіч : інфармацыя Навасёлкаўскай публічнай бібліятэкі. – Навасёлкі, 2019.

**ЖЫГАР Сяргей Мікалаевіч**. Нарадзіўся 19 лістапада 1930 года. Працаваў трактарыстам-машыністам у калгасе імя Дзяржынскага. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы II ступені (07.07.1986), ордэнам Працоўнай Славы III ступені (27.12.1976), медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» (03.04.1970). Пражывае ў вёсцы Мяфёдавічы.

**Жыгар Сяргей Мікалаевіч** : інфармацыя Гарадзецкай публічнай бібліятэкі-філіяла. – Гарадзец, 2019.

**ЖЫДОВІЧ Іван Антонавіч** (1932-2006). Нарадзіўся 28 студзеня 1932 года ў



вёсцы Зады Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў г. Талочыне Віцебскай вобласці паступіў у Мінскі медыцынскі інстытут. Атрымаў вышэйшую адукацыю ў 1957 годзе, накіраваны на працу ў Брэсцкую вобласць. Тры месяцы працаваў у «хуткай дапамозе» ў абласным цэнтры, затым - накіраванне ў Тэўлі загадчыкам участковай бальніцы. Працуючы ў Тэўлях, малады ўрач прайшоў спецыялізацыю па акушэрству на базе Брэсцкага радзільнага дома і неўзабаве ўзначаліў радзільна-гінекалагічнае аддзяленне

Кобрынскай бальніцы, дзе і працаваў 12 гадоў (1959-1972). Пасля быў намеснікам галоўнага ўрача па лячэбнай частцы, затым амаль 20 гадоў (1976-1996) - галоўным урачом Кобрынскай раённай бальніцы. Веды і майстэрства Івана Антонавіча Жыдовіча былі высока ацэнены ўрадам, прафесіяналамі: ён быў удастоены ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, медаля імя Пірагова, якім узнагароджваліся хірургі.

**Жидович Иван Антонович** : некролог // Кобрынскі веснік. – 2006. – 22 ліпеня. – С. 7.

**Хільчук, М.** Па жыцці з любоўю да людзей / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2002. – 26 студзеня. – С. 2. - За веды і майстэрства І. А. Жыдовіч удастоены ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, медаля імя Пірагова.

**ЖЭШКА Марыя Іванаўна.** Працавала шліфоўшчыцай на Кобрынскім інструментальным заводзе. У 1975 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 24 апреля 1975 г., № 1434-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Жешко Марию Ивановну - шлифовщицу Кобринского инструментального завода - орденом Трудовой Славы III степени.

**ЗАВЕРЖАНЕЦ Мікалай Аляксандравіч.** Кіраўнік сельскай гаспадаркі ў вёсцы



Павіцце з 1973 па 1986 год. У 1979 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У кастрычніку 2014 года за асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце атрымаў званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна».

**Директор** совхоза Заверженец Николай Александрович // Историко-экономический очерк совхоза «Ореховский». – Повитье, 1989. – С. 45.

**Руководители** хозяйства. Заверженец Николай Александрович (1973-1986) // Земля и люди Повитья. – Повитье, 2014. – С. 27 : фота.

**ЗДАНОВІЧ Іван Паўлавіч.** Нарадзіўся ў вёсцы Турная Кобрынскага раёна. 20-гадовым хлопцам трапіў на машынна-трактарную станцыю ў вёску Ліцвінкі. Пасля вучобы ў Кобрынскай МТС пачаў працаваць на трактары. Давялося абрабляць зямлю на 12 мадэлях трактароў. Мае шэраг узнагарод, сярод якіх ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга (1972), юбілейны медаль «За доблесную працу» (1970), шмат грамат і падзяк за сумленную работу.

**Патоня, В.** Песня дапамагае жыць / Вікторыя Патоня // Кобрынскі веснік. - 2006. – 18 лістапада. – С. 8.

**ЗЕЗЕГАЎ Мікалай Аляксандравіч**. У 1976 годзе за працоўныя поспехі, дасягнутыя ў павышэнні эфектыўнасці станкабудаўнічай і інструментальнай прамысловасці фрэзероўшчык Кобрынскага інструментальнага завода М. А. Зезегаў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 3 марта 1976 г., № 3548-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Зезегова Николая Александровича - фрезеровщика Кобринского инструментального завода – орденом Трудового Красного Знамени.

**ЗІХМАНЧУК Гаўрыіл Ульянавіч**. Нарадзіўся 25 сакавіка 1925 года ў вёсцы Завужоўе Кобрынскага павета (цяпер в. Завужоўе Кобрынскага раёна). Працаваў у калгасе імя Гагарына брыгадзірам трактарнай брыгады, механікам, інжынерам па тэхніцы бяспекі. Шмат гадоў быў старастам вёскі Тэўлі. У гады Вялікай Айчыннай вайны – вязень. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Пражывае ў вёсцы Тэўлі.



**Зіхманчук Гаўрыіл Ульянав**іч : інфармацыя Тэвельскай публічнай бібліятэкі. – Тэўлі, 2019.

**ЗЯЛЕНКА Кацярына Яфімаўна.** Нарадзілася 19 верасня 1937 года. Працавала ў Кобрынскім райспажыўсаюзе. Пражывае ў вёсцы Лепясы Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1975).

**Зеленко Екатерина Ефимовна** : список награжденных работников Кобринского райпо. – Кобрин, 2012.

**ІГНАЦЮК Марыя Кузьмінічна**. Нарадзілася ў 1939 годзе. Працавала цялятніцай у калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені, медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», сярэбраным і бронзавым медалямі ВДНГ.

**Ігнацюк Марыя Кузьмінічна** : інфармацыя Кіселявецкага сельсавета. – Кісялёўцы, 2019.

**ІГНАЦЮК Пётр Філіпавіч.** Нарадзіўся 7 лістапада 1931 года. Да 1957 года працаваў трактарыстам на Кобрынскай МТС. З 1958 года – трактарыст калгаса імя Суворава Кобрынскага раёна. Працоўны стаж трактарыстам – 30 гадоў. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Неаднаразовы пераможца ў сацыялістычных спаборніцтвах.



**Ігнацюк Пётр Філіпавіч** : інфармацыя Залескай публічнай бібліятэкі. – Залессе, 2019.

Трактарыст калгаса Суворава П. Ф. Ігнацюк узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Игнатюк Петр Филиппович** : список ветеранов Залесского сельсовета, награжденных государственными наградами. – Залесье, 2012.

**КАБЫЛЕЦКАЯ Лідзія Васільеўна**. Нарадзілася 19 мая 1935 года. Працавала швачкай у Кобрынскім камбінаце бытавога абслугоўвання. Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені (04.08.1986).

**Кобылецкая Лидия Васильевна** : список ветеранов ОАО «Кобринский РКБО» награжденных высокими правительственными наградами. – Кобрин, 2008.

**КАВАЛЬЧУК Аляксандра Іванаўна**. Працавала брыгадзірам участка на Кобрынскай швейнай фабрыцы. У 1975 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий и организаций Министерства легкой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1367-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Ковальчук Александру Ивановну - бригадира участка Кобринской швейной фабрики - орденом Трудовой Славы III степени.

**КАВАЛЮК Марыя Міхайлаўна** (1928-1992). З 1950 па 1966 год працавала паляводам, з 1967 па 1983 год – даяркай у калгасе «Кастрычнік» Кобрынскага раёна (ААТ «Гарадзец-агра»). Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (06.09.1973), медалём «Ветэран працы» (06.06.1983), знакам «Ударнік дзявятай пяцігодкі» (01.12.1975).

**Кавалюк Марыя Міхайлаўна** : інфармацыя Акцябрскай публічнай інтэграванай бібліятэкі. – Акцябр, 2019.

**КАЗАК Марыя Сцяпанаўна.** Працавала даяркай у калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Казак Марыя Сцяпанаўна** : інфармацыя Кіселявецкага сельсавета. – Кісялёўцы, 2019.

**КАЗЛЮК Мікалай Фаміч.** Нарадзіўся ў 1949 годзе. Закончыў школу ў вёсцы Акцябр. З 1965 па 1966 год вучыўся ў Драгічынскім СПТВ, дзе атрымаў спецыяльнасць «трактарыст-машыніст». З 1961 па 1965 год працаваў паляводам, з 1966 года – трактарыстам. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (16.03.1981).



**Казлюк Мікалай Фаміч** : інфармацыя Акцябрскай публічнай інтэграванай бібліятэкі. – Акцябр, 2019.

**КАЛЬКО Віктар Максімавіч**. Нарадзіўся ў 1929 годе. З 1959 па 1972 год працаваў старшынёй калгаса «Труд» Кобрынскага раёна. У 1968 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Калько Віктар Максімавіч** : інфармацыя Павіццеўскай публічнай бібліятэкі – Павіцце, 2019.



**КАЛЯДКА Яфім Самуілавіч** (1914-2001). Нарадзіўся ў вёсцы Бязверхавічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці. У 1949 годзе ўзначаліў Кобрынскую райбальніцу. За вялікі ўклад у развіццё аховы здароўя Я. С. Калядка быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», Граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалямі «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.», «За працоўную адзнаку», «За працоўную доблесць», «Ветэран працы».

**Калядка** Яфім Самуілавіч : [некралог] // Кобрынскі веснік. – 2001. – 9 чэрвеня : фат.

**КАМЕНДАНТ Стафан Аляксандравіч**. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны. З 1952 года працаваў старшынёй Кобрынскага райвыканкама, з 1956 года - дырэктарам Кобрынскага масласыразавода, з 1969 года - намеснікам старшыні Кобрынскага райспажыўсаюза. З 1973 года - старшы навуковы супрацоўнік, потым архівіст I катэгорыі філіяла Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», Айчыннай вайны I ступені.

**Камендант Стафан Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 242. – (Крутымі дарогамі вайны).

**КАНАНЮК Марыя Савічна.** Нарадзілася 15 лютага 1941 года. Працавала швачкай-матарысткай на Кобрынскай швейнай фабрыцы. У 1975 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий и организаций Министерства легкой промышленности СССР. Кононюк Марию Савичну: Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1367-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

**КАНТКОЎСКІ Васілій Міхайлавіч**. Нарадзіўся 20 ліпеня 1944 года. Працаваў на племзаводзе «Дружба» (цяпер КУСП «Племзавод «Дружба» ). Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Контковский Василий Михайлович** : списки ветеранов РУСП «Племенной завод «Дружба», награжденных правительственными наградами. – Лука, 2008.

**КАРАЛЮК Марыя Іосіфаўна.** Працавала даяркай у калгасе «Зара» (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Каралюк Марыя Іосіфаўна**: інфармацыя Хідрынскай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

**КАРАСЬ Анатолій Феадосьевіч**. За добрасумленную працу шаферам у калгасе імя Леніна Кобрынскага раёна ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы II ступені, Працоўнай Славы I ступені.

**Сацук, А.** Сапраўдны майстар / А. Сацук // Камуністычная праца. – 1981. – 15 августа.

**КАРНІЕВІЧ Мікалай Іванавіч**. Нарадзіўся ў 1941 годзе ў в. Будзішча Гомельскай вобласці. У 1965 годзе пачаў вучобу ў Мінскай школе МУС і з таго часу прысвяціў сябе службе ў органах аховы правапарадку. 15 гадоў узначальваў органы



ўнутраных спраў у Кобрынскім РАУС. Узнагароджаны медалямі «За доблесную працу», «50 гадоў Савецкай міліцыі», «Ветэран працы». У 1986 годзе за ўмелую арганізацыю работы аддзела ўнутраных спраў па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Палкоўнік у адстаўцы, старшыня Савета ветэранаў Кобрынскага РАУС.

**Храним** традиции брестской милиции : 1939-2014 / под общ. ред. Ф. Ф. Балейко. – Брэст : Альтернатива, 2014. – 124 с. : ил.

См. на с. 94.

**Савчук, М.** Когда зажигают звезды... / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2012. - 12 января. - С. 4. - 70-летний юбилей отметил полковник в отставке, председатель Совета ветеранов Кобринского РОВД Н. И. Корниевич.

**КАСАБУЦКІ Васілій Фёдаравіч.** Нарадзіўся 31 лістапада 1930 года ў вёсцы Кісялёўцы Кобрынскага павета (цяпер Кісялёўцы Кобрынскага раёна). Працаваў трактарыстам-машыністам у калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1978), медалём «За працоўную адзнаку» (1971).

**Кособуцкий Василий Федорович** : список ветеранов ОАО «Киселевцы», награжденных высокими правительственными наградами. – Киселевцы, 2012.

**КАЦЮГА Валянціна Фёдараўна.** Нарадзілася 6 студзеня 1936 года. Працавала швачкай на Кобрынскім камбінаце бытавога абслугоўвання. Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені (04.08.1986).

**Котюга Валентина Федоровна** : список ветеранов ОАО «Кобринский РКБО» награжденных высокими правительственными наградами. – Кобрин, 2008.

**КАЧАН Уладзімір Вікенцьевіч.** Нарадзіўся 4 чэрвеня 1929 года. Працаваў на Кобрынскай швейнай фабрыцы (цяпер філіял ААТ «Магатэкс» у г. Кобрыне). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Качан Владимир Викентьевич** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**КАЧУРКА Ганна Афанасьеўна**. Нарадзілася 24 лютага 1925 года. Працавала на Кобрынскай швейнай фабрыцы (цяпер філіял ААТ «Магатэкс» у г. Кобрыне). Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Кочурко Анна Афанасьевна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**КІРЫЕЎСКАЯ Вера Сцяпанаўна**. За самаадданую працу, высокія дасягненні жывёлавод калгаса «Новы шлях» Кобрынскага раёна В. С. Кірыеўская ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка. - Цялятніца В. Кірыеўская ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**КІРЫЛЮК Васілій Іванавіч.** Працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады ў вёсцы Авады Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.



**Кірылюк Васілій Іванавіч** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

**КІРЫЛЮК Васілій Рыгоравіч**. Нарадзіўся 8 мая 1945 года. Працаваў трактарыстам у калгасе імя Дзяржынскага Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (26.04.1971), ордэнам «Знак Пашаны» (21.12.1973).

**Кірылюк Васілій Рыгоравіч** : інфармацыя Гарадзецкай публічнай бібліятэкі-філіяла. – Гарадзец, 2019.

**КІРЫЛЮК Лізавета Іванаўна**. Працавала даяркай у калгасе «Зара» Кобрынскага раёна (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**Кірылюк Лізавета Іванаўна** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

**КІРЫЛЮК Ніна Васільеўна**. Нарадзілася 11 мая 1947 года. Працавала даяркай у калгасе імя Чкалава (цяпер ААТ «Раданежскае»). Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені (1977).

**Кирилюк Нина Васильевна** : списки ветеранов производства, имеющих правительственные награды, ордена, медали по СПК «Верхолесский» на 25 октября 2007 года. – Верхалессе, 2007.

**КЛІМЕНКА Барыс Пятровіч.** Працаваў дырэктарам Кобрынскай нафтабазы. У 1976 годзе ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**О награждении** орденами и медалями СССР работников предприятий и организаций по транспорту и снабжению нефтепродуктами : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 4 марта 1976 г., № 3562-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Клименко Бориса Петровича - директора Кобринской нефтебазы – орденом «Знак Почёта».

**КОЗАК Вольга Мікалаеўна**. Працавала майстрам на Кобрынскім інструментальным заводзе. У 1976 годзе ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 3 марта 1976 г., № 3548-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 502. - Козак Ольгу Николаевну - орденом «Знак Почёта».

**КОЗАК Любоў Лаўрэнцьеўна.** Нарадзілася 27 лютага 1941 года. Працавала птушкаводам на Кобрынскай птушкафабрыцы з 1963 па 1996 год. За добрасумленную працу ў 1971 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Козак Любовь Лаврентьевна** : список ветеранов ОАО «Кобринская птицефабрика», награжденных высокими правительственными наградами. – Кобрин, 2012.

**КОРЖ Іван Сяргеевіч.** Нарадзіўся 9 кастрычніка 1950 года. Працаваў шафёрам у калгасе «Сцяг Перамогі» (цяпер ААТ «Раданежскае»). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1980).

**Корж Иван Сергеевич** : список ветеранов производства, имеющих правительственные награды, ордена, медали по СПК «Радонежский». – 2012.

**КРАЎЧАНКА Яўгенія Іосіфаўна**. Працавала даяркай малочнатаварнай фермы вёсцы Лука племсаўгаса «Дружба» Кобрынскага раёна (цяпер КУСП «Племзавод «Дружба»). У 1982 годзе ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка.

Даярка племсаўгаса «Дружба» Я. І. Краўчанка ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

[**Яўгенія Іосіфаўна Краўчанка**] // Камуністычная праца. – 1982. – 29 красавіка. – С. 3.

Даярка малочнатаварнай фермы в. Лука племсаўгаса «Дружба» Я. І. Краўчанка.

**КРАЎЧУК Ніна Фёдараўна.** Нарадзілася 7 чэрвеня 1941 года ў вёсцы Чадзель Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці ў шматдзетнай сям'і. З лістапада 1978 года працавала даяркай у саўгасе «Дружба» Кобрынскага раёна. За высокае майстэрства і дасягнутыя поспехі ў працы ў 1986 годзе ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», бронзавым медалём ВДНГ СССР.

**Кравчук Нина Федоровна** : информация Лукской публичной интегрированной библиотеки. – Лука, 2019.

**КРЫВЕЦКІ Мікалай Анатольевіч.** Нарадзіўся 5 красавіка 1949 года ў вёсцы



Малінаўка Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Магілёўскую партыйную школу, Вышэйшую Партыйную школу пры ЦК КПБ, Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працоўную дзейнасць пачынаў у сельскай гаспадарцы Драгічынскага раёна. Доўгі час знаходзіўся на адказных пасадах у органах дзяржаўнага кіравання, на партыйнай і савецкай рабоце. У 1985-1991 гадах - першы сакратар Кобрынскага гаркама КПБ. З сакавіка да снежня 1991 года ён намеснік старшыні Савета калгасаў Брэсцкай вобласці. У 1992-1996 гадах кіраваў Камітэтам па стварэнні СЭЗ «Брэст», у лістападзе 1996 года прызначаны Кіраўніком Адміністрацыі СЭЗ «Брэст». З 2008 па 2014 год Мікалай Анатольевіч - намеснік старшыні Брэсцкага райвыканкама. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншымі ўзнагародамі. У кастрычніку 2014 года за асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае

развіццё аграгарадка Павіцце Мікалай Анатольевіч Крывецкі атрымаў званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна».

**Грибенчук, С.** Испытание временем. Кривецкий Николай Анатольевич / С. Гребенчук, А. Полонский // Академики Брестчины / С. Гребенчук, А. Полонский. – Брест, 2003. – С. 119-133.

**Крывецкі** Мікалай Анатольевіч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 453 : фота. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Падлужны, П.** З гісторыі вёскі Малінаўка і яе хутароў / Пётр Падлужны // Наш край – Загородье : историко-краев. журнал Дрогичинского района. – 2017. - № 37-38. - С. 18-21.

**КУБАЙ Ганна Дзянісаўна.** Працавала на будоўлях у г. Кобрыне, потым на НПС «Кобрын». У 1971 годзе ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».



**Кубай Анна Денисовна** : информация Остромичской сельской библиотеки. – Остромичи, 2010.

**КУКСЮК Марыя Цімафееўна**. Працоўная біяграфія Марыі Куксюк цесна звязана з калгасам імя Мічурына Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Астромічы»). 24 гады яна працавала брыгадзірам спачатку паляводчай, потым комплекснай брыгады. За сумленную высокаэфектыўную працу ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За працоўную доблесць».

**Слаўная** біяграфія // Кобрынскі веснік. – 1999. - 27 лютага. - За сумленную працу брыгадзір комплекснай брыгады калгаса імя Мічурына М. Ц. Куксюк узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**КУРОЎСКАЯ Яўгенія Антонаўна**. Працавала апаратчыцай Кобрынскага кансервавага завода. У 1976 годзе ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций Министерства пищевой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 2 марта 1976 г., № 3544-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Куровскую Евгению Антоновну - аппаратчицу Кобринского консервного завода – орденом «Знак Почёта».

**ЛАЗАРЧУК Вера Сцяпанаўна.** Працавала даяркай у калгасе «Зара» Кобрынскага раёна (СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Лазарчук Вера Сцяпанаўна** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

**ЛЕАНОВІЧ Леанід Мікалаевіч**. Нарадзіўся 20 мая 1940 года. Працаваў трактарыстам-машыністам у калгасе імя Дзяржынскага Кобрынскага раёна.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені. Пражывае ў вёсцы Соўплі Кобрынскага раёна.

**Леановіч Леанід Мікалаевіч** : інфармацыя Гарадзецкай публічнай бібліятэкі-філіяла. – Гарадзец, 2019.

**ЛЕВАНЮК Міхаіл Феадосьевіч.** Нарадзіўся 6 сакавіка 1937 года ў вёсцы



Лелікава Кобрынскага павета (цяпер Лелікава Кобрынскага раёна) у сялянскай сям'і. Вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Кустанайскага педінстытута, а таксама на эканамічным Кустанайскага сельгасінстытута. Працаваў у Кустанайской вобласці настаўнікам фізікі, дырэктарам школы. У 1988 годзе - пераезд у Беларусь. З 1988 па 1997 год - праца ў Верхалескай сярэдняй школе дырэктарам. У 1976 годзе ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», у 1981-м - медалём «За працоўную адзнаку».

**Левонюк Михаил Феодосиевич** : автобиография. – Верхалесье, 2019.

**ЛІСКОВІЧ Аляксей Фёдаравіч.** Працаваў трактарыстам у калгасе «Зара» Кобрынскага раёна (СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Лісковіч Аляксей Фёдаравіч** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

**ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч** – кандыдат медыцынскіх навук, дзяржаўны



дзеяч. Нарадзіўся 4 верасня 1960 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. Прызнаны лепшым кіраўніком у сферы аховы здароўя Гродзенскай вобласці за 2006 год. Імя В. А. Лісковіча ў 2010 годзе ўнесена ў Кнігу Славы Гродзенскай вобласці, у 2011 годзе - у Вялікую міжнародную энцыклапедыю «Лепшыя людзі». Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За працоўную адзнаку».

**Каспер, А.** Его кредо - делать жизнь людей лучше / Анна Каспер // Дзянніца. – 2020. – 2 ноября.

**Рыбак, Н.** Знакомый и неизвестный Виктор Лискович / Нина Рыбак // Астравецкая праўда. — 2018.

**ЛІСКОВІЧ Уладзімір Дзмітрыевіч.** Працаваў электразваршчыкам ручной зваркі Кобрынскага ўпраўлення магістральных газаправодаў. У 2003 годзе за шматгадовую плённую працу ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Мельнік, Р.** Шляхам прагрэсу і сацыяльнага развіцця / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2009. – 4 лістапада. – С. 2. - За шматгадовую плённую працу зваршчык Кобрынскага УМГ У. Лісковіч узнагароджаны ордэнам Пашаны

**ЛІТВІНСКАЯ Ніна Сцяпанаўна.** Нарадзілася 28 красавіка 1934 года. Працавала на Кобрынскай швейнай фабрыцы (цяпер філіял ААТ «Магатэкс» у г. Кобрыне). Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Литвинская Нина Степановна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**ЛОГВІН Марыя Сідараўна.** Нарадзілася 5 студзеня 1932 года. Працавала на племзаводзе «Дружба» (цяпер КУСП «Племзавод «Дружба»). Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Логвин Мария Сидоровна** : списки ветеранов РУСП «Племенной завод «Дружба», награжденных правительственными наградами. – Лука, 2008.

**ЛУКАШУК Васілій Сцяпанавіч**. Нарадзіўся ў 1934 годзе. З 1951 па 1958 год працаваў паляводам у калгасе імя Суворава Кобрынскага раёна, з 1959 года – трактарыстам. На трактары МТЗ-82 выконваў 1450-1560 эталонных гектараў у год. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ганаровымі граматамі калгаса і саўгаса. Неаднаразовы пераможца сацыялістычных спаборніцтваў.



**Лукашук Васілій Сцяпанавіч** : інфармацыя Залескай публічнай бібліятэкі. – Залессе, 2019.

**ЛУКАШУК Лідзія Сцяпанаўна**. Працавала рабочай на Кобрынскім камбінаце камунальных прадпрыемстваў. У 1976 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций жилищно-коммунального хозяйства : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 26 апреля 1976 г., № 3899-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Лукашук Лидию Степановну орденомТрудовой Славы III степени.

**ЛУКАШУК Мікалай Сцяпанавіч**. Нарадзіўся ў 1926 годзе ў вёсцы Турная. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны. За працоўныя дасягненні ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

**Лукашук Мікалай Сцяпанавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 277. - (Яны прайшлі дарогамі вайны).

**Хільчук, М.** Час маладосці – самы лепшы час / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 29 кастрычніка (№ 129). – С. 1–2 : фат.

Дзеля лепшага жыцця калектывы, якія узначальваў М. С. Лукашук, дабіваліся выдатных поспехаў, аб чым сведчаць ордэн «Знак Пашаны», Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, узнагароды ВДНГ за высокія дасягненні ў развіцці льнаводства.

**Гурда, У.** У павергнутым Берліне свой закончылі паход / Уладзімір Гурда // Кобрынскі веснік. – 2001. – 8 мая.

**ЛУК'ЯНЮК Надзея Іванаўна**. Працавала брыгадзірам фарбавальшчыц Кобрынскай ткацкай фабрыкі «Чырвоны Сцяг». У 1975 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий и организаций местной промышленности : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 25 апреля 1975 г., № 1458-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Лукьянюк Надежду Ивановну - орденом Трудовой Славы III степени.

**ЛЯБЕДЗІЧ Пётр Аляксандравіч.** Нарадзіўся ў 1930 годзе. У калгасе імя Суворава Кобрынскага раёна пачаў працаваць з 1957 года: спачатку рознарабочым, з 1959 года – трактарыстам. На трактары Т-150К выконваў па 2400-2500 эталонных гектараў у год. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Неаднаразовы пераможца ў сацыялістычных спаборніцтвах.



**Лябедзіч Пётр Аляксандравіч** : інфармацыя Залескай публічнай бібліятэкі. – Залессе, 2019.

**ЛЯСНЯК Мікалай Піліпавіч**. Нарадзіўся 18 студеня 1933 года ў вёсцы Барысава Кобрынскага раёна. Прафесіі хлебароба прысвяціў усё сваё жыццё. Пасля вучобы на курсах механізатараў у Кобрыне ўладкаваўся працаваць трактарыстам - спачатку ў МТС, потым у калгас «Новы шлях» Кобрынскага раёна. За сумленную і актыўную працу ў снежні 1972 года ўдастоены ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. У 1981 годзе Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР за шматгадовую працу ўзнагародзіў трактарыста калгаса «Новы шлях» М. П. Лесняка ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.



**Патоня, В.** Ордэн з «Аўрорай» / В. Патоня // Кобрынскі веснік. – 2007. – 6 лістапада.

За сумленную і актыўную працу Мікалай Лясняк атрымаў ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

**Нікіфараў, І.** [Лесняк Мікалай Піліпавіч] / І. Нікіфараў // Камуністычная праца. – 1981. – 6 чэрвеня.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР за шматгадовую працу ўзнагародзіў трактарыста калгаса «Новы шлях» М. П. Лесняка ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

**ЛЯСОТА Ганна Андрэеўна**. Нарадзілася 1 ліпеня 1940 года. Працавала швачкай-матарысткай на Кобрынскай швейнай фабрыцы. У 1976 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций Министерства легкой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 4 марта 1976 г., № 3554-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 560.

Лясоту Анну Андреевну - швею-мотористку Кобринской швейной фабрики – орденом Трудовой Славы III степени.

**Лясота Анна Андреевна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**ЛЯЎЧУК Іван Усцінавіч**. Працаваў трактарыстам у калгасе «Перамога» Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Пакроўскі»). У 1982 годзе ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка.

Трактарыст калгаса «Перамога» І. У. Ляўчук узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**МАРОЗ Іван Паўлавіч.** Нарадзіўся 22 сакавіка 1945 года ў вёсцы Свішчы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Сваю працоўную дзейнасць пачаў у 1966 годзе майстрам Кобрынскага рамонтнага завода. З 1969 па 1986 год працаваў на пасадзе начальніка вытворча-дыспетчарскага аддзела Кобрынскага рамонтнага завода. У 1986 годзе прызначаны на пасаду дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Кобрынская сельгастэхніка». Пасля перайменавання ў адкрытае акцыянернае таварыства «Кобрынаграмаш» з 2003 па жнівень 2014 года працаваў дырэктарам прадпрыемства. За сваю працоўную дзейнасць, прафесіяналізм І. П. Мароз адзначаўся на самым высокім узроўні. У 1987 годзе ўзнагароджаны медалём «За працоўную доблесць», у 1989 годзе - медалём «Ветэран працы». У 1999 годзе ўдастоены ордэна Пашаны, у 2004 годзе - ордэна Айчыны III ступені (21.12.2004, № 605). Неаднаразова выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога і Кобрынскага раённага Саветаў дэпутатаў. Па выніках працы за 2007 год занесены на раённую Галерэю Працоўнай Славы ў прамысловасці. Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 13 студзеня 2015 года № 37 «Аб прысваенні звання «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» за асабісты ўклад у развіццё эканомікі раёна Марозу Івану Паўлавічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».



**Кузина, С.** Навечно сохраним / Светлана Кузина // Кобрынскі веснік. - 2018. - 6 кастрычніка. - С. 4.

Почетный гражданин Кобринского района И. Мороз подарил архиву свои документы.

**Бакун, Е.** Где дело само за себя говорит / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 5 красавіка. - С. 5.

Почетный гражданин Кобринского района И. П. Мороз прошел путь от рядового техника-механика до управляющего предприятия.

**Лесик, И.** Союз оказался прочным / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. – 2015. – 14 студзеня. – С. 4.

Заслуги И. П. Мороза, 28 лет руководившего коллективом ОАО «Кобринагромаш», отмечены орденом, медалями и уважением коллег.

**Савчук, М.** Трудовой стаж длиной в полвека / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2015. - 5 февраля. - С. 4.

Трудовой путь И. П. Мороза, 28 лет возглавлявшего коллектив сельхозтехники, отмечен званием **«**Почетный гражданин Кобринского района**»**.

**Мороз, И.** Многовекторность как фактор стабильности / [Иван Мороз ; беседовал] Юрий Бехтерев // Директор. – 2011. – 30 мая.

**МАРОЗАЎ Андрэй Ільіч** (1906-1970). У 1941-1944 гадах - баец партызанскага атрада імя Катоўскага. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі.

**Марозаў Андрэй Ільіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 244. – (Крутымі дарогамі вайны).

**МАРЧУК Васілій Іванавіч.** Працаваў звеннявым бульбаводчага звяна калгаса «Сцяг Леніна» Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Навасёлкаўскі»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка.

**МАРЧУК Ганна Мікалаеўна.** Працавала ў калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Марчук Ганна Мікалаеўна** : інфармацыя Кіселявецкага сельсавета. – Кісялёўцы, 2019.

**МАРЧУК Іван Міхайлавіч.** Нарадзіўся 2 ліпеня 1932 года. Працаваў шафёрам у калгасе «Сцяг Перамогі» (цяпер ААТ «Раданежскае»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені (1979).

**Марчук Иван Михайлович** : список ветеранов производства, имеющих правительственные награды, ордена, медали по СПК «Радонежский». – 2012.

**МАСАЙЛА Мікалай Савельевіч**. Працаваў механізатарам у калгасе «XXI з'езд КПСС» Кобрынскага раёна. У 1981 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**[Шмат** працавітых і дбайных механізатараў…] // Камуністычная праца. – 1981. – 10 кастрычніка. – М. С. Масайла ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**МАСЛІЕВІЧ Марыя Рыгораўна**. Нарадзілася 29 верасня 1928 года. Працавала швачкай-матарысткай на Кобрынскай швейнай фабрыцы. У 1976 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций Министерства легкой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 4 марта 1976 г., № 3554-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. — Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Маслиевич Марию Григорьевну - швею-мотористку Кобринской швейной фабрики – орденом Трудового Красного Знамени.

**Маслиевич Мария Григорьевна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**МАЦЫНА Валерый Міхайлавіч**. Працаваў брыгадзірам брыгады механічнай апрацоўкі клупаў на Кобрынскім інструментальным заводзе. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Мацина, В. М.** О том, что радует и тревожит / В. М. Мацина // Заря. – 1986. – 21 января. - О своей работе - бригадир комплексной бригады Кобринского инструментального завода, награжденный орденом «Знак Почета» В. М. Мацина.

**МЕХТА Аляксей Паўлавіч**. Нарадзіўся 10 студзеня 1944 года. Працаваў трактарыстам-машыністам у калгасе імя Дзяржынскага Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (19.01.1977), медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» (03.04.1970). Пражывае ў вёсцы Камень.

**Мехта Аляксей Паўлавіч** : інфармацыя Гарадзецкай публічнай бібліятэкі-філіяла. – Гарадзец, 2019.

**МІГУРА Вера Мікіцічна**. Нарадзілася 28 мая 1942 года. Працавала ткачыхай на Кобрынскай ткацкай фабрыцы «Чырвоны сцяг». У 1976 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені, у 1981 годзе - ордэнам Працоўнай Славы II ступені.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций местной промышленности: Указ Президиума Верховного Совета СССР, 2 марта 1976 г., № 3539-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Мигуру Веру Никитичну – ткачиху Кобринской ткацкой фабрики «Красное знамя» - орденом Трудовой Славы III степени.

**Мигура Вера Никитична** : список ветеранов ОАО «Кобрин-текстиль», награжденных правительственными наградами. – Кобрин, 2008.

**МІКІЦЮК Іван Міхайлавіч.** Працаваў трактарыстам калгаса «Зара» Кобрынскага раёна (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Дубінка, М.** «Быць гаспадаром на зямлі» / Міхаіл Дубінка ; [гутарыў] І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1987. – 25 ліпеня.

Сярод вопытных, працавітых трактарыстаў калгаса «Зара» - кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Іван Мікіцюк.

**Мікіцюк Іван Міхайлавіч** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

**МІКІЦЮК Мікалай Іванавіч.** Нарадзіўся 12 мая 1947 года. Працаваў у племсаўгасе «Дружба» Кобрынскага раёна (цяпер КУСП «Племзавод «Дружба»). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Микитюк Николай Иванович** : списки ветеранов РУСП «Племенной завод «Дружба», награжденных правительственными наградами. – Лука, 2008.

**МІСІЮК Мікалай Іванавіч**. Нарадзіўся 15 чэрвеня 1936 года. Працаваў шафёрам у калгасе «Сцяг Перамогі» (цяпер ААТ «Раданежскае»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені (1977).

**Мисиюк Николай Иванович** : список ветеранов производства, имеющих правительственные награды, ордена, медали по СПК «Радонежский». – 2012.

**НЕСЦЯРУК Марыя Андрэеўна**. Нарадзілася ў 1927 годзе ў вёсцы Залессе Кобрынскага павета (цяпер Залессе Кобрынскага раёна). З 1949 па 1967 год працавала паляводам у калгасе імя Суворава Кобрынскага раёна, з 1968 года да выхаду на заслужаны адпачынак - цялятніцай. З'яўлялася пераможцам у сацыялістычных спаборніцтвах, узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ганаровымі граматамі. Неаднаразова за выдатныя працоўныя дасягненні была занесена на раённую Дошку гонару.

**Несцярук Марыя Андрэеўна** : інфармацыя Залескай публічнай бібліятэкі. – Залессе, 2019.

**НІЧЫК Марыя Міхайлаўна**. Нарадзілася 1 ліпеня 1935 года. Працавала настаўнікам у сярэдняй школе № 2 г. Кобрына. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1980).

**Ничик Мария Михайловна** : список ветеранов управления образования Кобринского райисполкома, награжденных высокими правительственными наградами. – Кобрин, 2008.

**НІЧЫПАРУК Іван Іванавіч** (1923-2007). Нарадзіўся ў Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1948 года працаваў трактарыстам у саўгасе «Дружба». У 1972 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.



**Ничипорук Иван Иванович** : информация Лукской публичной интегрированной библиотеки. – Лука, 2019.

**НІЧЫПАРУК Міхаіл Серафімавіч.** Нарадзіўся ў 1938 годзе. З 1962 па 1965 год працаваў паляводам, з 1965 года доўгі час працаваў на трактары. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

**Нічыпарук Міхаіл Серафімавіч** // Наследники Победы. История развития колхоза : папка. – Мінянка, 2015.

**НЫРКОВА Любоў Васільеўна**. Працавала намеснікам начальніка Кобрынскага аддзялення Дзяржбанка СССР. У 1981 годзе за дасягнутыя поспехі ў вобласці крэдытавання і фінансавання народнай гаспадаркі, грашовага звароту ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

[**Ныркова Любовь Васильевна**] // О награждении орденами и медалями СССР работников учреждений Госбанка СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР. - Заря. – 1981. – 1 июля. – С. 3.

За достигнутые успехи в области кредитования и финансирования народного хозяйства, денежного обращения наградить Ныркову Любовь Васильевну — заместителя начальника отдела отделения Госбанка СССР – орденом «Знак Почета».

**ПАДДУБНЫ Раман Раманавіч**. Нарадзіўся 28 верасня 1938 года. У 1982 годзе старшыня калгаса «Шлях да камунізму» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка.

Старшыні калгаса «Шлях да камунізму» Р. Р. Паддубнаму ўручаны ордэн «Знак Пашаны».

**Поддубный Роман Романович** : список ветеранов КУМПП ЖКХ «Кобринское ЖКХ», награжденных правительственными наградами. – Кобрин, 2008.

**ПАЛЯЦІЛА Алена Фёдараўна**. Працавала даяркай у калгасе «Сцяг Леніна» Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Навасёлкаўскі»). Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ў 1973 годзе.

**Паляціла Алена Фёдараўна** : інфармацыя Навасёлкаўскай публічнай бібліятэкі. – Навасёлкі, 2019.

Паляціла Алена Фёдараўна узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**ПАЛЯЦІЛА Васілій Мікалаевіч.** Працаваў жывёлаводам у калгасе «Сцяг Леніна» Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Навасёлкаўскі»). У 1973 годзе ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Паляціла Васілій Мікалаевіч** : інфармацыя Навасёлкаўскай публічнай бібліятэкі. – Навасёлкі, 2019.

**ПАЛЯЦІЛА Мікалай Андрэевіч**. Працаваў трактарыстам у калгасе «За Радзіму» Кобрынскага раёна. У 1982 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка.

Трактарыст калгаса «За Радзіму» М. А. Паляціла ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**ПАНАСЮК Іван Васільевіч.** Працаваў трактарыстам у калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Панасюк Іван Васільевіч** : інфармацыя Кіселявецкага сельсавета. – Кісялёўцы, 2019.

**ПАНАСЮК Надзея Міхайлаўна**. Працавала рабочай у Кобрынскім камбінаце будаўнічых матэрыялаў. У 1975 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий и организаций местной промышленности : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 25 апреля 1975 г., № 1458-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Панасюк Надежду Михайловну - садчицу кирпича Кобринского комбината строительных материалов - орденом Трудовой Славы III степени.

**ПАПРОЦКІ Канстанцін Сцяпанавіч**. Нарадзіўся 24 лютага 1936 года. Працаваў шафёрам на Грушаўскім рамонтным заводзе (цяпер ААТ «Грушаўскі РМЗ»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені (1986).

**Папроцкий Константин Степанович** : список ветеранов ОАО «Грушевский РМЗ», награжденных высокими правительственными наградами. – Грушево, 2008.

**ПАЎЛЮЧЫК Павел Пятровіч**. Нарадзіўся 17 студзеня 1932 года. Былы супрацоўнік ААТ «Белтрансгаз». Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы II ступені і ордэнам Працоўнай Славы III ступені.



**Мельнік, Р.** Мікалай Крыпіневіч: «З адкрытым сэрцам — да кожнага ветэрана» / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2012. – 11 лютага. – С. 4.

З 80-годдзем павіншавалі ветэрана працы Кобрынскага УМГ ААТ «Белтрансгаз» П. П. Паўлючыка, які ўзнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы II і III ступеняў.

**Павлючик Павел Петрович** : список ветеранов Кобринского УМГ ОАО «Белтрансгаз», награжденных правительственными наградами. – Кобрин, 2008.

**ПАЎЛЮЧЫК Соф'я Фёдараўна**. Нарадзілася 17 лістапада 1938 года. Працавала даяркай у калгасе «Сцяг Перамогі» (цяпер ААТ «Раданежскае»). Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971).

**Павлючик Софья Федоровна** : список ветеранов производства, имеющих правительственные награды, ордена, медали по СПК «Радонежский». – 2012.

**ПАЎЛЮЧЫК Сцепаніда Фёдараўна**. Нарадзілася 18 лістапада 1933 года. Працавала паляводам у калгасе «Сцяг Перамогі» (цяпер ААТ «Раданежскае»). Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені (1975).

**Павлючик Степанида Федоровна** : список ветеранов производства, имеющих правительственные награды, ордена, медали по СПК «Радонежский». – 2012.

**ПАЦЯЮК Ніна Аляксееўна.** Нарадзілася 14 студзеня 1935 года. Працавала швачкай-матарысткай на Кобрынскай швейнай фабрыцы. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Дружбы народаў.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих объединений, предприятий и организации Министерств легкой и автомобильной промышленности СССР и Государственного комитета СССР по обеспечению нефтепродуктами : Указ Президиума Верховного Совета ССР // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186.Оп. 1. Д. 467.

Патеюк Нину Алексеевну - швею-мотористку Кобринской швейной фабрики.

**Патеюк Нина Алексеевна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**ПАШКОВІЧ Валянціна Пятроўна**. Нарадзілася 14 сакавіка 1944 года. Працавала настаўнікам Дзівінскай сярэдняй школы. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» (1986).

**Пашкович Валентина Петровна** : список ветеранов управления образования Кобринского райисполкома, награжденных высокими правительственными наградами. – Кобрин, 2008.

**ПЕТРАСЮК Аляксей Пракоф'евіч.** Нарадзіўся 5 лістапада 1928 года. Працаваў брыгадзірам трактарнай брыгады ў калгасе «Сцяг Перамогі» (цяпер ААТ «Раданежскае»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені (1974), медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» (1970).

**Петросюк Алексей Прокофьевич** : список ветеранов производства, имеющих правительственные награды, ордена, медали по СПК «Радонежский». – 2012.

**ПЕТРАСЮК Іван Пракоф'евіч.** Нарадзіўся 12 лістапада 1930 года. Працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады ў калгасе «Сцяг Перамогі» (цяпер ААТ «Раданежскае»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1972), медалём «За працоўную доблесць» (1960), медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна» (1970).

**Петросюк Иван Прокофьевич** : список ветеранов производства, имеющих правительственные награды, ордена, медали по СПК «Радонежский». – 2012.

**ПЕТРАСЮК Марыя Міхайлаўна**. Аператар машыннага даення калгаса «Сцяг Перамогі». За дасягненне высокіх вынікаў у павелічэнні вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі на аснове асваення інтэнсіўных тэхналогій і перадавых метадаў арганізацыі працы ў 1988 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Віншуем** з узнагародай! // Камуністычная праца. – 1988 – 3 верасня (№ 106). – С. 1.
Аператар машыннага даення калгаса «Сцяг Перамогі» М. М. Петрасюк узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**ПІЛІПУК Сцяпан Андрэевіч.** Нарадзіўся ў 1931 годзе. Працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады калгаса «Сцяг Леніна» Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Навасёлкаўскі»). У 1966 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Піліпук Сцяпан Андрэевіч** : інфармацыя Навасёлкаўскай публічнай бібліятэкі. – Навасёлкі, 2019.

**ПІЛІПЧУК Валянціна Фёдараўна.** Нарадзілася 1 ліпеня 1942 года. Працавала даяркай у калгасе імя Дзяржынскага Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (06.09.1973), медалём «За доблесную працу» (03.04.1970). Пражывае ў вёсцы Грушава.

**Піліпчук Валянціна Фёдараўна** : інфармацыя Гарадзецкай публічнай бібліятэкі-філіяла. – Гарадзец, 2019.

**ПІШЧЫК Соф'я Мікалаеўна**. Працавала апаратчыцай на Кобрынскім масларобна-сыраробным заводзе. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Корбут, В.** Их труд отмечен Родиной / Вячеслав Корбут // ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод». 70 лет (1939-2009) / Вячеслав Корбут. – Минск, 2010. – С. 51-52.
Пищик Софья Николаевна, аппаратчица, награждена орденом Трудового Красного Знамени.

**ПЛОТКА Пётр Якаўлевіч** (1925-2011). Нарадзіўся 6 жніўня 1925 года ў вёсцы Любашава Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут імя В. П. Чкалава (1954). У Вялікую Айчынную на 1-м Беларускім фронце. За адвагу быў адзначаны ордэнамі Айчыннай вайны І ступені (1985), Чырвонай Зоркі, медалямі. З 1946 года інструктар, першы сакратар Ганцавіцкага райкама ЛКСМБ. У 1950-1957 гадах загадчык Ганцавіцкага, Жабчыцкага районa. Працаваў намеснікам старшыні Жабчыцкага райвыканкама і сакратаром Антопальскага райкама КПБ. У 1959-1962 гадах старшыня калгаса «Новы шлях» (в. Гарадзец). З 1962 па 1965 год - старшыня, намеснік старшыні Кобрынскага райвыканкама. З 1965 года старшыня раённага камітэта народнага кантролю. Апошнія дзесяць гадоў сваёй дзейнасці (з 1976 па 1985) Пётр Якаўлевіч настаўнічаў, працаваў дырэктарам сярэдняй школы № 5 г. Кобрына. У паслужным спісе Пятра Якаўлевіча ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, шэраг медалёў і Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР.



**Плотка Пётр Якаўлевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 454. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Плотко Пётр Яковлевич** : [некролог] // Кобрынскі веснік. - 2011. - 26 лютага. - С. 3.

**Пянко, А.** Война и мир Петра Плотко / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2007. – 21 ліпеня.

**ПРАКАПУК Раіса Васільеўна**. Нарадзілася 18 студзеня 1939 года. Працавала ў Кобрынскім райспажыўсаюзе. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» (18.08.1974).

**Прокопук Раиса Васильевна** : список награжденных работников Кобринского райпо. – Кобрин, 2012.

**ПРАКАПУК Сцепаніда Андрэеўна**. Нарадзілася 5 лістапада 1931 года. Працавала на Кобрынскім хлебазаводзе. Стаж работы на прадпрыемстве – 42 гады. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Прокопук Степанида Андреевна** : список ветеранов Кобринского хлебозавода, награжденных правительственными наградами. – Кобрин, 2008.

**ПУСТАВІТ Іван Лікандравіч.** Працаваў майстрам-сыраробам на Кобрынскім масларобна-сыраробным заводзе. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Корбут, В.** Их труд отмечен Родиной / Вячеслав Корбут // ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод». 70 лет (1939-2009) / Вячеслав Корбут. – Минск, 2010. – С. 51-52.

**ПЯТРУЧЫК Васілій Сцяпанавіч** (1921–2009). Нарадзіўся ў вёсцы Навасёлкі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1942-1944 гадах - удзельнік партызанскага руху. Сувязны і партызан атрада імя Фрунзе брыгады імя Сталіна Брэсцкага партызанскага злучэння. Мабілізаваны пасля расфарміравання атрада вясной 1944 года. Дэмабілізаваны ў 1946 годзе. З 1948 года працаваў на Дзівінскай МТС (да 1958 года) і ў калгасе трактарыстам і брыгадзірам трактарнай брыгады (з 1951 года). У 1973-



1981 гадах – слесар-наладчык. Дзяржаўныя ўзнагароды: ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалі «20 лет Победы над Германией», «30 лет Победы над Германией», «50 лет Вооружённых Сил СССР», «60 лет Вооружённых Сил СССР», «За доблестный труд», «Ветеран труда». За шматгадовую і добрасумленную працу адзначаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

**Пятручык Васілій Сцяпанавіч** : інфармацыя Навасёлкаўскай публічнай бібліятэкі. – Навасёлкі, 2019.

За шматгадовую і добрасумленную працу В. С. Пятручык адзначаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**РАДЧУК Марыя Андрэеўна.** Нарадзілася 29 кастрычніка 1938 года. Працавала начальнікам цэха Кобрынскай швейнай фабрыкі. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих объединений, предприятий и организации Министерств легкой и автомобильной промышленности СССР и Государственного комитета СССР по обеспечению нефтепродуктами : Указ Президиума Верховного Совета СССР // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 212.

Радчук Марию Андреевну - начальника цеха Кобринской швейной фабрики – орденом «Знак Почёта».

**Радчук Мария Андреевна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**РАМАНЮК Іван Лявонцьевіч** (1907-1979). Нарадзіўся ў вёсцы Осаўцы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці). З 1916 да 1924 года быў парабкам. З 1925 па 1929 год - рабочы рыбнай гаспадаркі. З 1932 года - старшыня сельсавета. У гады Вялікай Айчыннай вайны прайшоў шлях ад радавога партызана да камісара партызанскага атрада імя Калініна брыгады імя Кірава Пінскага злучэння. З мая 1943 па ліпень 1944 года знаходзіўся на адказнай савецкай рабоце. З 1950 па 1954 год - старшыня калгаса. З 1958 года - персанальны пенсіянер. Узнагароджаны ордэнамі Чырво-нага Сцяга і «Знак Пашаны», медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені. Звання «Ганаровы грамадзянін горада Лунінца» І. Л. Раманюк удастоены ў 1974 годзе.



**Долготович, Б. Д.** Романюк Иван Леонтьевич / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 38-39.

**[Раманюк Іван Лявонцьевіч]** // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Лунінецкага раёна. –Мінск, 1995. - С. 347, 348,354, 391,392.

**РАСОЛ Соф'я Рыгораўна.** Нарадзілася 29 кастрычніка 1933 года ў вёсцы Кіся-лёўцы Кобрынскага павета (цяпер в. Кісялёўцы Кобрынскага раёна). Працавала аператарам машыннага даення ў калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнага-роджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1966), медалём «За доблесную працу».

**Росол Софья Георгиевна** : список ветеранов ОАО «Киселевцы», награжденных высокими правительственными наградами. – Киселевцы, 2012.

**РАЧКО Анастасія Міхайлаўна**. Нарадзілася 23 лістапада 1938 года. Працавала на племзаводзе «Дружба» (цяпер КУСП «Племзавод «Дружба»). Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Рачко Анастасия Михайловна** : списки ветеранов РУСП «Племенной завод «Дружба», награжденных правительственными наградами. – Лука, 2008.

**РЮМКО Уладзімір Мікалаевіч**. Нарадзіўся ў 1935 годзе. Працаваў у Кобрынскім райспажыўсаюзе. Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў (13.04.1981).

**Рюмко Владимир Николаевич** : список награжденных работников Кобринского райпо. – Кобрин, 2012.

**САКАЛАЧКА Яўгеній Ануфрыевіч**. Нарадзіўся ў 1930 годзе. Працаваў механізатарам калгаса «Шлях да камунізму» Кобрынскага раёна. У 1982 годзе ўзнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.



**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка.

Старэйшы механізатар калгаса «Шлях да камунізму» Я. А. Сакалачка ўзнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

**Соколачко Евгений Онуфриевич** // История колхоза «Путь к коммунизму». – 1986.

**Соколачко Евгений Онуфриевич** // «Кніга Народнай Славы» колхоза «Путь к коммунизму».

**САКАЛОЎСКІ Іван Васільевіч** (1940-2013). Нарадзіўся 15 сакавіка 1940 года ў вёсцы Павіцце Кобрынскага раёна. У 1976 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга за ўдзел у асваенні цалінных зямель на прасторы СССР.

**Сакалоўскі Іван Васільевіч** : інфармацыя Павіццеўскай публічнай бібліятэкі – Павіцце, 2019.

**САКАЛЮК Галіна Аляксандраўна**. Нарадзілася 17 верасня 1949 года. Працавала на Кобрынскай швейнай фабрыцы (цяпер філіял ААТ «Магатэкс» у г. Кобрыне). Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**Соколюк Галина Александровна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**САЛІВОНЧЫК Васілій Васільевіч**. Нарадзіўся 27 лютага 1927 года. Працаваў на племзаводзе «Дружба» (цяпер КУСП «Племзавод «Дружба»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Саливончик Василий Васильевич** : списки ветеранов РУСП «Племенной завод «Дружба», награжденных правительственными наградами. – Лука, 2008.

**САЛІВОНЧЫК Ніна Аляксандраўна**. Нарадзілася ў студзені 1946 года ў вёсцы Мацясы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1963 годзе закончыла сярэднюю школу № 4 г. Кобрына. Вучылася ў Слуцкай спецшколе майстроў масласыраробства. З 1966 года працавала зменным майстрам у сыраробным цаху, затым старшым майстрам сыраробнага цэха ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод». З гэтай пасады ў 2004 годзе пайшла на заслужаны адпачынак. За поспехі ў працы і высокія працоўныя паказчыкі ўзнагароджана ордэнамі Працоўнай Славы II ступені, Працоўнай Славы III ступені, медалём «Ветэран працы».



**О награждении** рабочих и мастеров предприятий и организаций Министерства мясной и молочной промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1377-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Соливончик Нину Александровну - рабочую Кобринского маслосырзавода - орденом Трудовой Славы III степени.

**Корбут, В.** Их труд отмечен Родиной / Вячеслав Корбут // ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод». 70 лет (1939-2009) / Вячеслав Корбут. – Минск, 2010. – С. 51-52.

Соливончик Н. А., мастер-сыродел, награждена орденами Славы II и III степени.

**Корбут, В**. Ветераны Кобринского маслодельно-сыродельного завода. Люди и судьбы. [Нина Александровна Соливончик] / Вячеслав Корбут // ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод». 70 лет (1939-2009) / Вячеслав Корбут. – Минск, 2010. – С. 60-61.

За высокие трудовые показатели Соливончик Н. А. награждена медалью «Ветеран труда».

**САЛТЫКОВА Ніна Нікіфараўна**. Нарадзілася 23 верасня 1933 года. Працавала начальнікам аддзела Кобрынскай швейнай фабрыкі. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих объединений, предприятий и организации Министерств легкой и автомобильной промышленности СССР и Государственного комитета СССР по обеспечению нефтепродуктами : Указ Президиума Верховного Совета СССР // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Солтыкову Нину Никифоровну - начальника отдела Кобринской швейной фабрики - орденом Трудового Красного Знамени.

**Солтыкова Нина Никифоровна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**САРОКА Валянціна Афанасьеўна**. Працавала рабочай на Кобрынскім масласырзаводзе. У 1976 годзе ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций Министерства мясной и молочной промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 1 марта 1976 г., № 3532-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Сороку Валентину Афанасьевну - рабочую Кобринского маслосырзавода – орденом «Знак Почёта».

**САЎЧУК Ганна Адамаўна.** Нарадзілася 28 кастрычніка 1944 года ў вёсцы Павіцце Кобрынскага раёна. У 1962 годзе паступіла ў Брэсцкі педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна на факультэт рускай і беларускай мовы. З 1967 года пачала працаваць у Павіццеўскай сярэдняй школе. Настаўнік вышэйшай катэгорыі. У 1981 годзе ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».



**[Савчук Анна Адамовна** ; Осиюк Мария Петровна] // О награждении орденами и медалями СССР работников обще-образовательных школ и других учебно-воспитательных учреждений Министерства просвещения СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР. – Заря. – 1981. – 8 июля. – С. 1.

**САЎЧУК Лук'ян Іванавіч.** Працаваў брыгадзірам спецыялізаванай перасовачнай механізаванай калоны № 134 упраўлення «Брэстсельбуд». У 1975 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров организаций и пред¬приятий Министерства сельского строительства СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1383-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502. - Савчука Лукьяна Ивановича - орденом Трудовой Славы III степени.

**САЦЭВІЧ Мальвіна Адамаўна**. У 1976 годзе другі сакратар Кобрынскага райкама КПБ М. А. Сацэвіч узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций Министерства легкой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 4 марта 1976 г., № 3554-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.
Сацевич Мальвину Адамовну - орденом «Знак Почёта».

**СВІДУНОВІЧ Антон Кузьміч.** Працаваў токарам Дзівінскай сельгастэхнікі. У 1966 годзе за павелічэнне вытворчасці і нарыхтовак збожжа-кармавых культур і высокапрадукцыйнае выкарыстанне сельскагаспадарчай тэхнікі ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**О награждении** орденами и медалями СССР … : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 23 июня 1966 года // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп.1. Д. 82. - Свидуновича Антона Кузьмича - токаря Дивинской сельхозтехники – наградить орденом Трудового Красного Знамени.

**СЕРАДА Мікалай Якаўлевіч.** У 1981 годзе за датэрміновы ўвод магутнасцяў на прадзільна-ткацкай фабрыцы ў г. Кобрыне ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».



**Середа Николай Яковлевич** // Кто есть Кто в Республике Беларусь. Строители Беларуси / под ред. И.В. Чекалова. - Минск, 2013. – С. 137.

**СІДАРУК Іван Міхайлавіч**. Нарадзіўся 8 сакавіка 1943 года. Працаваў намеснікам старшыні калгаса «Сцяг Перамогі» (цяпер ААТ «Раданежскае»). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1973).

**Сидорук Иван Михайлович** : список ветеранов производства, имеющих правительственные награды, ордена, медали по СПК «Радонежский». – 2012.

**СОЛАП Павел Васільевіч.** Працаваў старшынёй калгаса «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Солап Павел Васільевіч** : інфармацыя Кіселявецкага сельсавета. – Кісялёўцы, 2019.

**СОЎПЕЛЬ Яўгенія Рыгораўна**. Нарадзілася 19 студзеня 1936 года. Працавала даяркай у калгасе імя Дзяржынскага Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені (27.12.1977), медалём «За працоўную доблесць» (19.04.1966), медалём «За працоўную адзнаку» (28.04.1971). Пражывае ў вёсцы Худлін Кобрынскага раёна.

**Соўпель Яўгенія Рыгораўна** : інфармацыя Гарадзецкай публічнай бібліятэкі-філіяла. – Гарадзец, 2019.

**СТАРАВОЙТАЎ Аляксандр Міхайлавіч**. Нарадзіўся ў 1936 годзе ў Смаленскай вобласці (Расія). Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1958). У 1969 годзе паступіў у аспірантуру Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС у Маскве. У 1972 годзе абараніў дысертацыю, кандыдат эканамічных навук. У 1974-1977 гадах - першы сакратар Кобрынскага райкама, потым гаркама КПБ. З 1977 года намеснік міністра сельскай гаспадаркі БССР, з 1986 года - намеснік старшыні Дзяржаграпрама БССР, пазней намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. З 1994 года старшыня Камітэта па дзяржаўным выпрабаванні і ахове сартоў раслін пры Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы), «Знак Пашаны», медалямі.



**Старавойтаў Аляксандр Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 455. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**СТАРЫКОВІЧ Іосіф Георгіевіч.** Нарадзіўся ў 1901 годзе ў вёсцы Волкава на Віцебшчыне. Прымаў удзел у савецка-польскай вайне 1920 года, быў у атрадзе Часцей асобага прызначэння. У 1939 годзе накіраваны ў Брэсцкую вобласць для стварэння машынна-трактарнага парка. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў у дзеючай арміі, ваяваў на маскоўскім, сталінградскім, крымскім, закарпацкім напрамках. Закончыў вайну ў маі 1945 года ў Празе. У 1946 годзе быў дырэктарам Кобрынскага рамонтнага завода. За заслугі перад Радзімай І. Г. Стырыковіч узнагароджаны ордэнамі «Чырвонай Зоркі», «Айчыннай вайны» I і II ступеняў, дзесяццю медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

**Стырыковіч** Іосіф Георгіевіч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 245. – (Крутымі дарогамі вайны).

**СЦЕПАНЮК Любоў Іванаўна.** Працавала апаратчыцай на Кобрынскім кансервавым заводзе. У 1975 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров пред¬приятий и организаций Министерства пищевой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1375-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Степанюк Любовь Ивановну - аппаратчицу Кобринского консервного завода - орденом Трудовой Славы III степени.

**СЯЛЮК Пётр Дзянісавіч** (1939-2010). Нарадзіўся 12 ліпеня 1939 года ў вёсцы



Філіповічы Капаткевіцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1957 годзе, скончыўшы 8 класаў сярэдняй школы № 2 г. Кобрына, пачаў сваю працоўную біяграфію аўтаслесарам пры вайсковай часці ў п. Мачулішчы Мінскага раёна. У студзені 1958 года П. Сялюк пераехаў у горад Кобрын. У 1961 годзе ён закончыў школу працоўнай моладзі. З верасня 1959 года і да апошняга дня Пётр Дзянісавіч працаваў на Кобрынскім рамонтным заводзе. Пачынаў з падсобнага рабочага, потым быў слесарам, токарам, наладчыкам. За высокія паказчыкі ў працы П. Д. Сялюк узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны» (1977), Працоўнай Славы II і III ступеняў (1986, 1975), медалём «За доблесную працу» (1970), «Ветэран працы»(1984). Пётр Дзянісавіч актыўна ўдзельнічаў у жыцці завода, быў членам бюро гарадскога камітэта КПБ і партбюро завода, дэлегатам XXVIII з'езда КПБ і XXVI з'езда КПСС. У 1971 годзе яму прысвоена званне «Ударнік камуністычнай працы». Неаднаразова П. С. Сялюк быў пераможцам сацыялістычных спаборніцтваў, прызнаны лепшым па прафесіі, унёс мноства рацыяналізатарскіх прапаноў. Узнагароджаны нагрудным знакам «Настаўнік моладзі» (1976). У 1978 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік працоўнай моладзі Беларускай ССР». Удзельнік выстаў ВДНГ СССР (1971) і ВДНГ БССР (1979). У год святкавання 700-годдзя Кобрына прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына».

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий и организаций Всесоюзного объединения «Сельхозтехника» Совета Министров СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 22 апреля 1975 г., № 1415-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Селюка Петра Денисовича - токаря Кобринского ремонтного завода - орденом Трудовой Славы III степени.

**Долготович, Б. Д.** Селюк Петр Денисович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32.

**Селюк Петр Денисович** : некролог / районный исполнительный комитет, районный Совет депутатов // Кобрынскі веснік. – 2011. – 5 студзеня. – С. 3.

**Мельнік, Р.** Жыццевае крэда Пятра Селюка / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2006. – 22 ліпеня.

**Пётр Дзянісавіч Сялюк** // Кобрынскі веснік. – 2002. – 20 ліпеня. – (Кобрына Ганаровыя грамадзяне).

[**Вярнуўшыся** з XXVI з’езда КПСС] // Камуністычная праца. – 1981. – 7 сакавіка.

Вярнуўшыся з XXVI з’езда КПСС, яго дэлегат, токар рамонтнага завода Пётр Дзянісавіч Сялюк, падзяліўся з таварышамі сваімі ўражаннямі.

**Петр** Денисович Селюк, токарь Кобринского авторемонтного завода // Камуністычная праца. – 1981.

**Романов, В.** Простые истины / В. Романов // Заря. – 1981. – 17 января.

Вся рабочая биография П. Селюка связана с Кобринским авторемзаводом.

**СЯНЧУК Павел Васільевіч** (1923-1996). Нарадзіўся ў вёсцы Акцябр Кобрынскага павета (цяпер Акцябр Кобрынскага раёна). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў ВПШ пры ЦК КПБ. У пасляваенны час працаваў на гаспадарчай і партыйнай работах. За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі, у мірны час - ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

**Сянчук Павел Васільевіч**. // Памяць : гісторыка-культурная хроніка Драгічынскага раёна. – Мінск, 1997. – С. 420-421. – (Вызначыліся працай).

**ТАРАСЮК Ніна Аляксандраўна**. Нарадзілася 22 сакавіка 1942 года. Працавала ў Кобрынскім райспажыўсаюзе. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (16.07.1986), медалём «За працоўныя заслугі» (16.03.1976).

**Тарасюк Нина Александровна** : список награжденных работников Кобринского райпо. – Кобрин, 2012.

**ТАРАСЮК Ядвіга Іосіфаўна.** Працавала варшчыцай на Кобрынскім кансервавым заводзе. У 1976 годзе ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций Министерства пищевой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 2 марта 1976 г., № 3544-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп.1. Д. 502.
За успехи, достигнутые в выполнении заданий девятой пятилетки и принятых социалистических обязательств, наградить Тарасюк Ядвигу Иосифовну - варщицу Кобринского консервного завода - орденом «Знак Почёта».

**ТКАЧУК Антон Сцяпанавіч** (1945-2015). Нарадзіўся 7 студзеня 1945 года ў



вёсцы Жыдче Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Сваю працоўную дзейнасць пачаў у ліпені 1961 года загадчыкам сельскім клубам у вёсцы Хойна Пінскага раёна. У 1968 годзе закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі па спецыяльнасці «інжынер-механік». З ліпеня 1968 па ліпень 1970 года працаваў загадчыкам рамонтнымі майстэрнямі аддзялення «Сельгастэхніка» ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна. У ліпені 1970 года прызначаны галоўным інжынерам аддзялення «Сельгастэхніка». 1973-1974 гады - намеснік старшыні калгаса «Новае жыццё» Кобрынскага раёна. З сакавіка 1974 па люты 1981 года працаваў старшынёй калгаса імя Кірава Кобрынскага раёна. Шаснаццаць гадоў (з лютага 1981 па люты 1997) узначальваў саўгас «Днепра-Бугскі». На працягу шасці гадоў (з ліпеня 1997 па сакавік 2003) працаваў старшынёй Дзівінскага сельскага Савета дэпутатаў. За шматгадовую добрасумленную працу А. С. Ткачук узнагароджаны медалём «За доблесную працу», двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, шэрагам грамат. Памёр 9 чэрвеня 2015 года. У 2016 годзе ў пасёлку Арэхаўскі адбыўся мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнай дошкі памяці першага кіраўніка саўгаса «Днепра-Бугскі».

**Пашковіч, Л.** Добрая праца не забываецца / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. - 9 студзеня. - С. 1.
**Ткачук Антон Степанович** : некролог // Кобрынскі веснік. – 2015. – 13 чэрвеня. – С. 12.

**Знаёмцеся**: саўгас «Днепра-Бугскі» // Кобрынскі веснік. – 1992. – 11 лістапада. – С. 3.

Са дня стварэння саўгаса «Днепра-Бугскі» яго ўзначальвае ініцыятыўны дырэктар - Антон Сцяпанавіч Ткачук.

**Саўгас** «Днепра-Бугскі»: радкі біяграфіі // Кобрынскі веснік. – 1991. - № 20. – С. 1.

Антон Сцяпанавіч Ткачук узначаліў створаны новы саўгас «Днепра-Бугскі».

**Сацук, А.** І вечны бой… / А. Сацук // Камуністычная праца. – 1988. – 21 красавіка.

Пра Антона Сцяпанавіча Ткачука – дарэктара саўгаса «Днепра-Бугскі».

**Ткачук Антон Степанович** : список работников ОАО «Днепро-Бугское», награжденных орденами, медалями, почетными знаками. – Ореховский, 2007.

**ТРАЦЮК Вольга Аляксееўна**. Нарадзілася 16 ліпеня 1949 года. Працавала швачкай-матарысткай на Кобрынскай швейнай фабрыцы. У 1975 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий и организаций Министерства легкой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1367-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Троцюк Ольгу Алексеевну - швею-мотористку Кобринской швейной фабрики - орденом Трудовой Славы III степени.

**Троцюк Ольга Алексеевна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**ТРУБЧЫК Соф'я Антонаўна**. Нарадзілася ў 1954 годзе. Працавала брыгадзірам комплекснай брыгады калгаса «Шлях да камунізму» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Трубчик Софья Антоновна** // Книга Народной Славы колхоза «Путь к коммунизму». Трубчик Софья Антоновна. – 1986.

**ТУР Фёдар Аляксеевіч**. Нарадзіўся 16 красавіка 1941 года. Працаваў начальнікам службы ГРС і ГІС ААТ «Белтрансгаз» (цяпер «Кобрынскае ўпраўленне магістральных газаправодаў ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь»). У 1974 годзе ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**Тур Федор Алексеевич** : список ветеранов Кобринского УМГ ОАО «Белтрансгаз», награжденных правительственными наградами. – Кобрин, 2008.

**ТУРУБЧУК Пётр Аляксеевіч**. Працаваў аператарам свінагадоўчага комплексу ў калгасе «Зара» Кобрынскага раёна (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Турубчук Пётр Аляксеевіч** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

**ТЫШКО Вольга Іосіфаўна**. У 1975 годзе муляр перасовачнай механізаванай калоны № 70 упраўлення «Брэстсельбуд» В. І. Тышко ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров организаций и пред¬приятий Министерства сельского строительства СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1383-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Тышко Ольгу Иосифовну - каменщицу передвижной механизированной колонны № 70 управления «Брестсельстрой» - орденом Трудовой Славы III степени.

**ФЕДАРУК Мікалай Пятровіч.** Нарадзіўся 15 сакавіка 1941 года ў вёсцы Казішчы Кобрынскага раёна. Працаваў у калгасе імя Гагарына трактарыстам. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Пражывае ў вёсцы Тэўлі.

**Федарук Мікалай Пятровіч** : інфармацыя Тэвельскай публічнай бібліятэкі. – Тэўлі, 2019.

**ФІЛІПЧУК Надзея Уладзіміраўна**. Працавала рабочай ліцейнага цэха Кобрынскага інструментальнага вытворчага аб’яднання. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**[Філіпчук Надзея Уладзіміраўна]** // Камуністычная праца. – 1980.

Рабочая ліцейнага цэха Кобрынскага інструментальнага вытворчага аб’яднання Н. У. Філіпчук узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**ХАХЛОЎ Яўгеній Рыгоравіч**. Нарадзіўся 28 лютага 1926 года ў горадзе Дзяржынску Ніжагародскай вобласці (Расія). Закончыў Балахнінскі торфатэхнікум (1947), спецыяльную школу № 301 КДБ СССР у Магілёве (1954), ВПШ пры ЦК КПСС (1960). З 1956 года - дырэктар торфапрадпрыемства «Агдэмер» Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1961-1970 гадах старшыня Іванаўскага райвыканкама, першы сакратар Іванаўскага, Кобрынскага райкамаў КПБ. У 1972-1986 гадах - намеснік міністра паліўнай прамысловасці БССР. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы), Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, медалямі.

**Хахлоў Яўген Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 455. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**ЦЕЦЯРУК Іван Мікалаевіч.** Нарадзіўся 28 чэрвеня 1954 года ў вёсцы Павіцце



Кобрынскага раёна. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1968 годзе працаваў трактарыстам. Пасля службы ў арміі вярнуўся на сваю малую радзіму, пайшоў працаваць трактарыстам. 36 гадоў працаваў у мясцовай гаспадарцы, 33 з іх – механізатарам. У 1987 годзе выбраны мясцовым дэпутатам. У 1988 годзе І. М. Цецярук узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені. Сышоў на пенсію, але працягвае працаваць. З 2009 года па цяперашні час Іван Мікалаевіч працуе ў рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Званец», размешчаным на тэрыторыі Драгічынскага і Кобрынскага раёнаў. За асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё аграгарадка Павіцце ў верасні 2016 года Івану Мікалаевічу Цецеруку прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна».

**Трудный** путь перемен [Тетерук Иван Николаевич] // Земля и люди Повитья. – Повитье, 2014. – С. 29.

**Пашкович, Л.** Из механизаторов - в научные сотрудники / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2017. — 22 красавіка. — С. 4.

В 2016 году И. Н. Тетерук стал Почетным гражданином Повитья.

**Сацук, А.** Каб стала ніва ўраджайнай / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 1998. – 22 красавіка.

Значна перавыконвае даведзеныя нормы на ўнясенні арганікі механізатар І. М. Цецярук.

**ЦЕЦЯРУК Надзея Іванаўна.** Нарадзілася ў 1949 годзе. 33 гады працавала



даяркай у калгасе «40 гадоў Кастрычніка» (саўгас «Арэхаўскі», цяпер ДСУП «Сяльгас-Павіцце»). Тройчы была ўдарнікам камуністычнай працы і пераможцам сацыялістычных спаборніцтваў Х і ХІ пяцігодак. У 1986 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**Цецярук** Надзея Іванаўна : інфармацыя Павіццеўскай публічнай бібліятэкі. – Павіцце, 2019.

**ЦІМАШУК Марыя Іванаўна.** Нарадзілася 20 снежня 1938 года. Працавала птушкаводам на Кобрынскай птушкафабрыцы з 1968 па 1994 год. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» (1981).

**Тимошук Мария Ивановна** : список ветеранов ОАО «Кобринская птицефабрика», награжденных высокими правительственными наградами. – Кобрин, 2012.

**ЦЫПРЫНЮК Вера Іванаўна**. Працавала швачкай-матарысткай на Кобрынскай швейнай фабрыцы. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ІІІ ступені.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих объединений, предприятий и организации Министерств легкой и автомобильной промышленности СССР и Государственного комитета СССР по обеспечению нефтепродуктами : Указ Президиума Верховного Совета СССР // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Цыпринюк Веру Ивановну - швею-мотористку Кобринской швейной фабрики – орденом Трудовой Славы III степени.

**ЧАЙКОЎСКАЯ Ніна Рыгораўна**. Працавала брыгадзірам участка Кобрынскага льнозавода. У 1975 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий и организаций Министерства легкой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1367-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502. - Чайковскую Нину Григорьевну - бригадира участка Кобринского льнозавода - орденом Трудовой Славы III степени.

**ЧАКВІНА Вера Іванаўна.** Працавала даяркай у калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Чаквіна Вера Іванаўна** : інфармацыя Кіселявецкага сельсавета. – Кісялёўцы, 2019.

**ЧАПЯЛЕВІЧ Васілій Паўлавіч**. Працаваў брыгадзірам комплекснай брыгады Кобрынскага рамонтна-будаўнічага ўпраўлення абласнога рамонтна-будаўнічага трэста. У 1975 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий и организаций жилищно-коммунального хохяйства : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 12 мая 1975 г., № 1598-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Чепелевича Василия Павловича - бригадира комплексной бригады Кобринского ремонтно-строи¬тельного управления областного ремонтно - строительного треста - орденом Трудовой Славы III степени.

**ЧАТЫРБОК Зінаіда Пятроўна**. Нарадзілася ў 1920 годзе. Жыла ў вёсцы Луцэвічы Кобрынскага раёна. Працавала свінаркай, даяркай у калгасе імя Жданава Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Чатырбок Зінаіда Пятроўна** : інфармацыя Імянінскай інтэграванай публічнай бібліятэкі. – Імянін, 2019.

**ЧОПІК Павел Сідаравіч**. Працаваў брыгадзірам тынкоўшчыкаў спецыялізаванай перасовачнай механізаванай калоны № 75 упраўлення «Брэстсельбуд». У 1975 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров организаций и пред¬приятий Министерства сельского строительства СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1383-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Чопика Павла Сидоровича - бригадира штукатуров специализированной передвижной механизированной колонны № 75 управления «Брестсельстрой» - орденом Трудовой Славы III степени.

**ЧУРАКОВА Надзея Сцяпанаўна**. Працавала аператарам часальных машын на Кобрынскай прадзільна-ткацкай фабрыцы. У 1986 годзе ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих объединений, предприятий и организации Министерства легкой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 23 мая 1986 г., № 4737-XI // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186.Оп. 4. Д. 103.

Наградить Чуракову Надежду Степановну – оператора чесальных машин Кобринской прядильно-ткацкой фабрики – орденом «Знак Почета».

**ЧЭРНІК Міхаіл Іванавіч**. Працаваў механізатарам калгаса «Новае жыццё» Кобрынскага раёна. У 1956 годзе закончыў курсы трактарыстаў. Першы ордэн Працоўнай Славы III ступені атрымаў у 1975 годзе, праз дзесяць гадоў ветэран гаспадаркі, хлебароб удастоены ордэна Працоўнай Славы II ступені.

**Дабрагост, І.** Слава па працы / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1987. – 28 ліпеня.

Механізатар калгаса «Новае жыццё» М. І. Чэрнік – кавалер ордэна Працоўнай Славы ІІІ ступені, ордэна Працоўнай Славы ІІ ступені.

**ШАПЯЦЮК Ірына Васільеўна.** Працавала цялятніцай у калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**Шапяцюк** Ірына Васільеўна : інфармацыя Кіселявецкага сельсавета. – Кісялёўцы, 2019.

**ШВАЙ Ніна Мікалаеўна.** Нарадзілася ў 1938 годзе. З 1953 па 1970 год працавала паляводам, з 1970 года – даяркай калгаса «Звязда» Кобрынскага раёна (цяпер ААТ «Пакроўскі»). Атрымлівала сярэдні надой ад каровы па 3540-3550 кг малака ў год. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэнам «Знак Пашаны».

**Швай Ніна Мікалаеўна** : інфармацыя Мінянскай публічнай інтэграванай бібліятэкі // Наследники Победы. История развития колхоза : папка. – Мінянка, 2015.

**ШВАЙКО Ганна Міхайлаўна.** Нарадзілася 24 лютага 1945 года. Працавала швачкай-матарысткай на Кобрынскай швейнай фабрыцы. Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені (1975), ордэнам Працоўнай Славы ІІ ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий и организаций Министерства легкой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 21 апреля 1975 г., № 1367-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Швайко Анну Михайловну - швею-мотористку Кобринской швейной фабрики - орденом Трудовой Славы III степени.

**Швайко Анна Михайловна** : список ветеранов труда РУП «Лона», награжденных орденами. – Кобрин, 2008.

**ШВАЙКО Леанід Фёдаравіч**. За дасягненне высокіх вынікаў у павелічэнні вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі на аснове асваення інтэнсіўных тэхналогій і передавых метадаў арганізацыі працы вадзіцель аўтамабіля калгаса «За Радзіму» Л. Ф. Швайко ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**Віншуем** з узнагародай! // Камуністычная праца. – 1988 – 3 верасня (№ 106). – С. 1.

Вадзіцель аўтамабіля калгаса «За Радзіму» Л. Ф. Швайко ўзнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы ІІІ ступені.

**ШВАРКО Ігнат Васільевіч.** Нарадзіўся 10 лістапада 1943 года ў вёсцы Кісялёўцы Кобрынскага раёна. Працаваў трактарыстам у калгасе «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1981), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1970).

**Шварко Игнат Васильевич** : список ветеранов ОАО «Киселевцы», награжденных высокими правительственными наградами. – Киселевцы, 2012.

**ШВАРКО Соф'я Іванаўна**. Працавала ў Кобрынскім райспажыўсаюзе. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» (1977).

**Шварко Софья Ивановна** : список награжденных работников Кобринского райпо. – Кобрин, 2012.

**ШПЕНДЗІК Лідзія Андрэеўна**. Працавала матальшчыцай на Кобрынскай ткацкай фабрыцы «Чырвоны Сцяг». У 1975 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**О награждении** рабочих и мастеров предприятий и организаций местной промышленности : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 25 апреля 1975 г., № 1458-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Шпендик Лидию Андреевну - мотальщицу кобринской ткацкой фабрики «Красное Знамя» - орденом Трудовой Славы III степени.

**ШУБІЧ Васілій Мікалаевіч.** Нарадзіўся 16 студзеня 1940 года. Пражывае ў вёсцы Магдалін Кобрынскага раёна. Працаваў у калгасе «Магдалінскі». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны».

**Шубич Василий Николаевич** : информация Кобринского районного совета ветеранов. – Кобрин, 2020.

**ШУМІЛІН Барыс Ціханавіч**. Франтавік. У 1942 годзе быў узнагароджаны



ордэнам Чырвонай Зоркі. Пасля заканчэння Вышэйшай партыйнай школы ВКП(б) і аспірантуры Беларускага Дзяржаўнага ўніверсітэта па запрашэнні П. М. Машэрава працаваў загадчыкам аддзелам прапаганды і агітацыі Брэсцкага абкама кампартыі Беларусі (1955-1957). Са снежня 1957 па май 1961 года ўзначальваў Кобрынскі райкам КПБ. Праз чатыры гады працы на Кобрыншчыне стаў наменікам загадчыка аддзелам партыйных органаў ЦК КПБ, затым быў выбраны членам Цэнтральнага камітэта партыі, выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У студзені 1967 года быў наменікам міністра Міністэрства аховы грамадскага парадку ўнутраных спраў СССР, дзе прапрацаваў да 1983 года, курыруючы ўсю міліцэйскую службу велізарнай краіны і расійскія структуры ўнутраных спраў. Памёр генерал-палкоўнік у Маскве 15 мая 2003 года. Сярод узнагарод Б. М. Шуміліна - 10 ордэнаў і 30 медалёў, у тым ліку ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыннай вайны I ступені, чатыры ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга і шматлікія іншыя ўзнагароды. Нягледзячы на невялікі тэрмін працы на Кобрыншчыне, добрая памяць пра Барыса Ціханавіча і дагэтуль жыве ў сэрцах жыхароў краю.

**Шумілін Барыс Ціханавіч** // Памяць. Кобрынскі раён: гісторыка-дакументальная хроніка. — Мінск, 2002. – С. 456. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Брежнев, М.** Борис Шумилин. От партизана до заместителя Министра / Максим Брежнев // Милиция Беларуси. - 2015. — № 4. — С. 24—29.

О заместителе Министра внутренних дел СССР генерал-полковнике внутренней службы Б. С. Шумилине (1922-2003).

**Белов, Д.** Из когорты «машеровской» школы / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2011. – 26 сакавіка. – С. 4.

Борис Тихонович Шумилин с 1957-го по 1961 год возглавлял Кобринский райком партии.

**Борис Шумилин.** От партизана до замминистра [Электронный ресурс] **//** Звезда. **–** Режим доступа: http:// zvezda-r.ru/ vspomogatelnoe-2012/ 2614-shumilin.html. – Дата доступа: 09.01.2020.

Четырежды кавалер ордена Трудового Красного Знамени Б. Т. Шумилин с 1957 года занимал должность первого секретаря Кобринского райкома КПБ.

**Шумилин Борис Тихонович** [Электронный ресурс] // Международный объединенный Биографический Центр. – Режим доступа: http://wwii-soldat. narod.ru /200/ ARTICLES/ BIO/shumilin_bt.htm. – Дата доступа: 09.01.2020.

С декабря 1957 по май 1961 год Б. Т. Шумилин возглавлял Кобринский райком партии.

**ШЫМАНКА Анатолій Барысавіч**. Працаваў фрэзероўшчыкам на Кобрынскім інструментальным заводзе. У 1976 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга III ступені.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 3 марта 1976 г., № 3548-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Шиманко Анатолия Борисовича - фрезеровщика Кобринского инструментального завода – орденом Трудового Красного Знамени III степени.

**ШЫМАНОВІЧ Віктар Сяргеевіч.** Нарадзіўся 13 кастрычніка 1937 года. Працаваў старшынёй прафсаюзнай арганізацыі саўгаса «Дружба». У 1971 годзе ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Шиманович Виктор Сергеевич** : списки ветеранов РУСП «Племенной завод «Дружба», награжденных правительственными наградами. – Лука, 2008.

**ШЫМАНСКІ Леанід Карнілавіч**. Нарадзіўся 4 студзеня 1934 года. Працаваў на племзаводзе «Дружба» (цяпер КУСП «Племзавод «Дружба»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга III ступені.

**Шиманский Леонид Корнилович** : списки ветеранов РУСП «Племенной завод «Дружба», награжденных правительственными наградами. – Лука, 2008.

**ШЭМЧУК Сцяпан Арцёмавіч.** Працаваў трактарыстам у калгасе «Зара» Кобрынскага раёна (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Шэмчук Сцяпан Арцёмавіч** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

**ШЭМЧУК Фёкла Міхайлаўна**. Працавала аператарам свінагадоўчага комплексу ў калгасе «Зара» Кобрынскага раёна (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.



**Шэмчук Фёкла Міхайлаўна** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

Шэмчук Фёкла Міхайлаўна ўзнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**ЮРЭНЯ Аляксандр Станіслававіч** (1946-2010). Нарадзіўся 11 лютага 1946 года ў вёсцы Колбавічы Баранавіцкага раёна. Працоўны шлях пачаў з 17 гадоў рабочым на Кобрынскім інструментальным заводзе. З 1963 па 1969 год - электрык кампрэсарнай станцыі г. Кобрына, з 1970 па 1979 год - галоўны заатэхнік калгаса «Савецкая Беларусь», з 1979 года - дырэктар племзавода «Дружба». З 2000 года - у апараце Упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, з сакавіка 2002 па 2004 год - начальнік упраўлення Кобрынскага райвыканкама, з 2004 па люты 2007 года - намеснік начальніка сельгасупраўлення Кобрынскага райвыканкама. У 1970 годзе закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут. У 1994 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю і атрымаў вучонае званне кандыдата сельскагаспадарчых навук. За бездакорную працу ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».



**Часовитина, Н.** Объединенные «Дружбой» / Наталья Часовитина // Сельская газета. - 2019. — 26 января. — С. 28-29.

Директор племзавода «Дружба» А. С. Юреня защитил диссертацию, стал кандидатом сельхознаук.

**Александр Юреня**: «Наши планы строились не на пустом месте» / Александр Юреня // Белорусская нива. – 2003. – 27 февраля.

Александр Станиславович Юреня – кандидат сельскохозяйственных наук.

**Сацук, А**. Тут зноў курлычуць жураўлі / А. Сацук // Кобрынксі веснік. – 1999. – 11 верасня.

Па ініцыятыве А. С. Юрэні ля в. Лука на тэрыторыі племзавода створана штучнае возера.

**Юреня Александр Станиславович** : информация Лукской публичной интегрированной библиотеки. – Лука, 2019.

**ЮЦЫК Алена Аляксееўна**. Працавала свінаркай у калгасе імя Мічурына Кобрынскага раёна. За высокія дасягненні ў працы ў 1981 годзе ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**О награждении** орденами и медалями СССР передовиков сельского хозяйства Белорусской ССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 26 марта 1982 г. // Заря. - 1982. – 7 апреля.

Свинарка колхоза имени Мичурина Кобринского района Е. А. Юцик награждена орденом Трудового Красного Знамени.

**[Алена Аляксееўна Юцык]** // Камуністычная праца. – 1982. – 29 красавіка. – С. 3.

За высокія дасягненні ў працы свінарка калгаса імя Мічурына А. А. Юцык узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка.

Свінарка калгаса імя Мічурына А. А. Юцык узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Сацук, А.** Когда на душе радость / А. Сацук // Заря. - 1982.

За трудовую доблесть, проявленную в выполнении социалистических обязательств, свинарка колхоза имени Мичурина Кобринского района Е. А. Юцык награждена орденом Трудового Красного Знамени.

**ЯДАМАВА Таццяна Адамаўна.** Нарадзілася 13 студзеня 1950 года. Працавала aператарам машыннага даення ў саўгасе «Днепра-Бугскі» (цяпер ААТ «Днепра-Бугскае»). Узнагароджана ордэнам Працоўнай Славы III ступені.

**Едамова Татьяна Адамовна** : список работников ОАО «Днепро-Бугское», награжденных орденами, медалями, почетными знаками. – Ореховский, 2007.

**ЯЖОЎ Іван Фёдаравіч.** Нарадзіўся 21 верасня 1928 года ў вёсцы Пагодзіна Дзмітрыеўскага раёна Курскай вобласці (Расія). Вучыўся ў Чугуеўскім вышэйшым ваенным авіяцыйным вучылішчы (1947-1949), закончыў Мінскую ВПШ (1965). З 1951 года ў органах дзяржбяспекі, оперупаўнаважаны ў Брэсце, Шарашоўскім, Дзівінскім раёнах. З 1954 года інструктар Дзівінскага, Кобрынскага (з 1965 загадчык прамыслова-транспартнага аддзела) райкамаў КПБ. У 1969-1978 гадах старшыня Кобрынскага гарвыканкама. У 1978-1989 гадах працаваў намеснікам дырэктара птушкафабрыкі «Кобрынская». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.



**Яжоў Іван Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 456. - (Яны кiравалі горадам і раёнам).

**ЯЖУК Васілій Васільевіч.** Нарадзіўся 22 жніўня 1923 года ў вёсцы Патрыкі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1942 годзе быў сувязістам у партызанскім атрадзе імя Катоўскага. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі, медалямі «За адвагу», «За Перамогу над Германіяй». Пасля дэмабілізацыі працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады. Ветэран працы, узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць», ордэнам «Працоўнага Чырвонага Сцяга».

**Ежук Василий Васильевич** : информация Патриковской сельской библиотеки. – Патрики, 2009.



**ЯКАЎЧУК Ганна Сямёнаўна**. Нарадзілася 25 лютага 1939 года. Пасля заканчэння тэхнікума працавала галоўным заатэхнікам у калгасе імя Суворава Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За працоўную доблесць», ганаровымі граматамі калгаса.

**Якаўчук Ганна Сямёнаўна** : інфармацыя Залескай публічнай бібліятэкі. – Залессе, 2019.

**Яковчук Анна Семеновна** : список ветеранов Залесского сельсовета, награжденных государственными наградами. – Залесье, 2012.



**ЯКАЎЧУК Пётр Іванавіч**. Нарадзіўся 10 чэрвеня 1936 года. З 1957 па 1962 год працаваў шафёрам у саўгасе імя Суворава Кобрынскага раёна, з 1963 года - механікам. У 1978 годзе назначаны на пасаду галоўнага інжынера. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ганаровымі граматамі калгаса і саўгаса.

**О награждении** орденами и медалями СССР передовиков сельского хозяйства Белорусской ССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 26 марта 1982 г. // Заря. - 1982. – 7 апреля.

Главный инженер совхоза имени Суворова Кобринского района П. И. Яковчук награжден орденом Трудового Красного Знамени.

**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка.

Галоўны інжынер саўгаса імя Суворава П. І. Якаўчук узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Якаўчук Пётр Іванавіч** : інфармацыя Залескай публічнай бібліятэкі. – Залессе, 2019.

**Яковчук Петр Иванович** : список ветеранов Залесского сельсовета, награжденных государственными наградами. – Залесье, 2012.

**ЯКАЎЧЫЦ Валянціна Мікалаеўна**. Працавала прадзільшчыцай на Кобрынскай прадзільна-ткацкай фабрыцы. У 1986 годзе ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих объединений, предприятий и организации Министерства легкой промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 23 мая 1986 г., № 4737-XI // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186.Оп. 4. Д. 103.

Яковчиц Валентину Николаевну - прядильщицу Кобринской прядильно-ткацкой фабрики - орденом «Знак Почёта».

**ЯКІМУК Іосіф Іосіфавіч.** Працаваў брыгадзірам трактарнай брыгады ў калгасе «Зара» Кобрынскага раёна (цяпер СВК «Узыходзячая зара»). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Якімук Іосіф Іосіфавіч** : інфармацыя Хідрынскай публічнай бібліятэкі. – Хідры, 2019.

І. І. Якімук узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**ЯКІМУК Марыя Іванаўна**. Нарадзілася 19 кастрычніка 1936 года. Працавала даяркай у калгасе імя Чкалава (цяпер ААТ «Раданежскае»). Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» (1978), медалём «За доблесную працу» (1986).

**Якимук Мария Ивановна** : списки ветеранов производства, имеющих правительственные награды, ордена, медали по СПК «Верхолесский» на 25 октября 2007 года. – 2007.

**ЯКІМУК Марыя Міхайлаўна**. Нарадзілася ў 1938 годзе. Працавала інжынерам на ПМК-52 «Брэстводбуд» (цяпер ПМК-52 УП «Брэстводбуд»). Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За доблесную працу», сярэбраным медалём ВДНГ.

**Якимук Мария Михайловна** : список ветеранов ПМК-52 УП «Брестводстрой», награжденных высокими правительственными наградами. – Кобрин, 2001.

**ЯКУБЧЫК Віктар Якімавіч.** Працаваў тэрмістам на Кобрынскім інструментальным заводзе. У 1976 годзе ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно-технических работников и служащих предприятий и организаций Министерства станкостроительной и инструментальной промышленности СССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 3 марта 1976 г., № 3548-IX // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Якубчика Виктора Якимовича - термиста Кобринского инструментального завода – орденом «Знак Почёта».

**ЯРАШУК Мікалай Іванавіч** (1935-2016). Нарадзіўся 14 верасня 1935 года ў



вёсцы Мышчыцы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1970 годзе з адзнакай закончыў Пружанскі саўгас-тэхнікум, у 1978 годзе - Ленінградскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчы інстытут. Сваю працоўную дзейнасць пачаў юнгай на грамадзянскім флоце. Пасля службы ва Узброеных Сілах быў накіраваны на працу ў Міністэрства дзяржаўнай бяспекі, а затым прызначаны начальнікам радыёпрыёмнага цэнтра штаба паветранай знішчальнай дывізіі. З 43 гадоў працоўнага стажу Мікалай Іванавіч 38 аддаў аграпрамысловаму комплексу. Адбыўся як спецыяліст ва Узброеных Сілах і аграпрамысловым комплексе. На заслужаны адпачынак выйшаў з пасады кіраўніка саўгаса «Патрыкі» Кобрынскага раёна, які ўзначальваў амаль 20 гадоў. Пасля выхаду на пенсію 10 гадоў кіраваў пансіянатам ветэранаў вайны і працы. Імя Мікалая Ярашука занесена ў энцыклапедычнае выданне «Хто ёсць хто ў Рэспубліцы Беларусь», прысвечанае 70-годдзю Вялікай Перамогі. За шматгадовую і добрасумленную працу ўзнагароджаны медалём «За доблесную працу», ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, трыма юбілейнымі медалямі Узброеных Сіл БССР, «Выдатнік сацыялістычнай сельскай гаспадаркі».

**Николай Иванович Ярошук** : [некролог] // Кобрынскі веснік. – 2016. – 9 ліпеня. – С. 2.

Ушел из жизни Н. И. Ярошук - житель г. Кобрина, награжденный медалью «За доблестный труд», орденом Трудового Красного Знамени.

**Дубіна, Л.** Выдатніку працы - 80 / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2015. — 16 верасня. — С. 4.

Імя М. І. Ярашука занесена ў энцыклапедычнае выданне «Хто ёсць хто ў Рэспубліцы Беларусь», ён - кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга і іншых узнагарод.

**Лесик, И**. «Взрослеть пришлось не по годам» / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. – 2015. – 14 студзеня. – С. 3.

Н. И. Ярошук за работу в агропромышленном комплексе награжден орденом Трудового Красного Знамени и медалью «За доблестный труд».

**Ярашук Мікалай Іванавіч** : інфармацыя ААТ «Кобрынская птушкафабрыка». – Кобрын, 2019.

Дырэктар аграфірмы-калгаса «Патрыкі» М. І. Ярашук узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**ЯЎЧУК Лідзія Аляксандраўна.** Нарадзілася 28 кастрычніка 1940 года. Працавала фармоўшчыкам на Кобрынскім СБК (цяпер ААТ «Кобрынскі СБК»). Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга III ступені (1986).

**Евчук Лидия Александровна** : список награжденных ветеранов ОАО «Кобринский ССК». – Кобрин, 2008.

**ЯЧНІК Мікалай Гаўрылавіч**. Працаваў брыгадзірам слесараў Кобрынскага льнозавода. У 1971 годзе за добрасумленную працу ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Хільчук, М.** Пасада простая – рабочы / М. Хільчук // Камуністычная праца. – 1985. – 1 мая.

За добрасумленную працу брыгадзір слесараў Кобрынскага льнозавода М. Г. Ячнік узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

# ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Ганаровыя званні Рэспублікі Беларусь – гэта форма ўзнагароды, прызнання заслуг і заахвочвання выдатных дзеячаў працы, навукі, мастацтва, сацыяльнай сферы, фізічнай культуры і спорту, ваеннай справы.**

## ЗАСЛУЖАНЫ АГРАНОМ БЕЛАРУСКАЙ ССР

***ЗАСЛУЖАНЫ АГРАНОМ БЕЛАРУСКАЙ ССР***, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным аграномам калгасаў, саўгасаў, навукова-даследчых устаноў сельскай гаспадаркі, сельскагаспадарчых органаў за выдатныя заслугі ў развіцці сельскай гаспадарцы. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР 16.12.1953.

*Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т.*
*Мінск, 1971. Т. 4. С. 508.*

**ДРОЗД Аляксандр Сцяпанавіч.** Працаваў аграномам калгаса «Праўда» Кобрынскага раёна. 5 кастрычніка 1966 года прысвоена ганаровае званне «Заслужаны аграном Беларускай ССР».

**Список** лиц, удостоенных почетных званий // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 186.

Дрозд Александр Степанович, 5.10.1966 г., агроном колхоза «Правда» Кобринского района.

# ЗАСЛУЖАНЫ БУДАЎНІК БЕЛАРУСКАЙ ССР

***ЗАСЛУЖАНЫ БУДАЎНІК БЕЛАРУСКАЙ ССР***, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР работнікам будаўнічых і праектных арганізацый, прадпрыемстваў будаўнічых матэрыялаў, канструкцый і дэталяў, навукова-даследчых устаноў у галіне будаўніцтва за вялікія заслугі па ўкараненні новай тэхнікі, перадавых метадаў працы, паляпшэнні якасці, зніжэнні кошту будаўніцтва. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР 11.06.1960.

*Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. Мінск, 1971. Т. 4. С. 509.*

**БАЯРЧУК Сцяпан Цімафеевіч**. Працаваў мулярам Кобрынскага рамонтна-будаўнічага ўпраўлення Брэсцкага абласнога рамонтна-будаўнічага трэста. У 1976 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны будаўнік Беларускай ССР».

**О присвоении** почетных званий Белорусской ССР работникам предприятий и организаций промышленности, транспорта, связи, энергетики, строительства, торговли и бытового обслуживания населения : Указ Указ Президиума Верховного Совета БССР, 5 мая 1976 года // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 502.

Заслуженного строителя Белорусской ССР Боярчуку Степану Тимофеевичу - каменщику Кобринского ремонтно-строительного управления Брестского областного ремонтно-строительного треста.

**ВЕРАМЯЮК Міхаіл Аляксандравіч.** Працаваў брыгадзірам комплекснай будаўнічай брыгады Кобрынскай міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі. У 1976 годзе прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР. У 1980 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны будаўнік Беларускай ССР». Памёр у 2019 годзе.



**Заслужаны** будаўнік Беларускай ССР. 1980. **Верамеюк М. А.** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1998. - Т. 6. - С. 551.

**Веремеюк Михаил Александрович** // Кто есть Кто в Республике Беларусь. Строители Беларуси / под ред. И.В. Чекалова. - Минск, 2013. – С. 32.

**Лаўрэаты** Дзяржаўнай прэміі БССР. **Верамяюк Міхаіл Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 428. – (Вызначыліся працай).

**КЛІМУК Павел Іванавіч.** Працаваў абпальшчыкам цэглы цагельнага завода «Лепясы» Кобрынскага райпрамкамбіната. У 1966 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны будаўнік Беларускай ССР».

**Список** лиц, удостоенных почетных званий // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 166. - Климук П. И., обжигальщик кирпича кирпичного завода «Лепесы» Кобринского райпромкомбината (13.08.1966).

**СЕЛІВОНІК Пётр Васільевіч.** Нарадзіўся 17 верасня 1928 года ў вёсцыКівацічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Муляр будтрэста № 7 Мінгарсельбуда БССР (1954-1957), пячнік (1966-1971), плітачнік (1971-1988) Брэсцкага аблсельбуда. Ударнік IX пяцігодкі. Узнагароджаны Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалямі «За доблесную працу. У адзначэнне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», «Ветэран працы», ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Леніна. У 1980 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны будаўнік БССР».



**Селивоник Петр Васильевич** // Кто есть Кто в Республике Беларусь. Строители Беларуси / под ред. И. В. Чекалова. - Минск, 2013. – С. 135.

**СЕРАДА Мікалай Якаўлевіч.** У 1981 годзе за датэрміновы ўвод магутнасцяў на прадзільна-ткацкай фабрыцы ў г. Кобрыне ўзнагароджаны ордэнам Знак Пашаны. У 2001 годзе прысвоена званне «Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь».



**Середа Николай Яковлевич** // Кто есть Кто в Республике Беларусь. Строители Беларуси / под ред. И.В. Чекалова. - Минск, 2013. – С. 137.

# ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ***. Ганаровае званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь» прысвойваецца высокапрафесійным рэжысёрам, балетмайстрам, дырыжорам, хормайстрам, кампазітарам, драматургам, мастакам, архітэктарам, дызайнерам, мастацтвазнаўцам і іншым дзеячам мастацтваў, якія працуюць у вобласці мастацтва пятнаццаць і больш гадоў, за вялікія заслугі ў падрыхтоўцы працаўнікоў культуры, стварэнні навуковых прац.

*О государственных наградах Республики Беларусь : Закон Республики Беларусь, 18 мая 2004 года, № 288-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. Минск, 2019.*



**КУЗЬМІЧ Мікалай Пятровіч**. У сучасным беларускім дэкаратыўна-прыкладным мастацтве атрымала прызнанне творчасць заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Мікалая Пятровіча Кузьміча, які вывучыў і аднавіў унікальную тэхніку старажытна-візантыйскай перагародчатай эмалі. Нарадзіўся майстар 28 лістапада 1950 года ў вёсцы Патрыкі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Спецыяльную адукацыю атрымаў у Мінскім мастацкім вучылішчы імя А. Глебава ў 1982 годзе. Пасля быў размеркаваны на працу на Брэсцкі мастацкі камбінат. Праз некалькі гадоў, убачыўшы ювелірныя вырабы з эмаллю, «загарэўся» гэтай справай, якая стала галоўнай у жыцці майстра. Пачынаў сваю творчую дзейнасць Мікалай Кузьміч з невялікіх ювелірных аздабленняў з медзі, мельхіёру і бронзы. Працаваў мастаком на Брэсцкім камбінаце «Мастацтва», з 1998 года - мастак у Мінскай епархіі. Імя Мікалая Пятровіча Кузьміча зараз добра вядома ў культурным асяродку не толькі нашай краіны. Працуючы ў даволі рэдкім для беларускага выяўленчага мастацтва стылі - тэхніцы перагародчатай эмалі і вырабляючы арыгінальныя ювелірныя ўпрыгажэнні, ён займеў высокае прызнанне як сярод знатакоў, так і прыхільнікаў прыгожага майстэрства. Сусветную ж вядомасць мастаку прынёс, бадай што, галоўны на сёння яго твор - адноўлены ім паводле ўзору старажытнага Крыж прападобнай Еўфрасінні Полацкай, які ўжо больш за 850 гадоў з'яўляецца адной са святыняў беларускага народа, нягледзечы на тое, што быў страчаны ў 1941 годзе. Работа над аднаўленнем нацыянальнай рэліквіі заняла ў Мікалая Кузьміча каля пяці гадоў і, як ён сам прызнаецца, не толькі пакінула адметны след на яго жыццёвым шляху, але і прымусіла істотна перагледзець свае адносіны да многіх з'яў, грамадскіх працэсаў і нават некаторых агульначалавечых каштоўнасцей. А гэта, у сваю чаргу, не магло не аказаць уплыву на далейшую творчасць майстра. Пазней М. Кузьміч працаваў над стварэннем стаўратэкі для крыжа. Сумесна з дактарамі Расійскай акадэміі навук А. Аляксеевым і Т. Макаравай мастак у 1998 годзе выдаў кнігу «Крыж - прыгажосць царквы» (аб крыжы Еўфрасінні, яго гісторыі і тэхніцы ўзнаўлення). 2002 год для М. Кузьміча стаў пачаткам работы над новым заказам Беларускай праваслаўнай царквы - ракай Еўфрасінні Полацкай, па памерах падобнай на невялікі каўчэг. Рака, завершаная ў 2007 годзе, стала аўтарскім творам мастака, які выявіў погляд чалавека нашага стагоддзя на падзеі далёкай мінуўшчыны.

На працягу ўсёй творчай дзейнасці М. П. Кузьміч звяртаецца да стварэння работ у тэхніцы гарачай эмалі. Творы незвычайна вобразныя і выразныя. Сярод іх - эмаль

«Беларуская Атлантыда», серыі «Вежы», «Кветкавы рай», дэкаратыўныя кампазіцыі «Блакітныя сны», «Купалле», «Слуцкія паясы», «Рэгата», «Свята», «Салют», «Бабіна лета», «Мір табе, планета Зямля», «Памяць», «Прастора і час», «Рух». Полацкія матывы, помнікі даўніны, твары беларускіх святых і яркія летнія асацыяцыі - тэмы невялікіх, але экспрэсіўных работ. Аўтар ажыўляе мінулае і стварае гармонію духу і майстэрства. Ён уводзіць у традыцыйныя тэмы новыя эксперыментальныя матывы, узбагачае іх сучаснымі прачытаннямі. Творы М. Кузьміча знаходзяцца ў музеях Масквы, Вільнюса, Клайпеды, Германіі, ЗША, Іспаніі і ў асабістых калекцыях. Шмат твораў мастака прадстаўлена ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі. М. П. Кузьміч - член Беларускага саюза мастакоў з 1987 года. З 2004 года ён узначальвае Брэсцкае абласное аддзяленне Беларускага саюза мастакоў. Узнагароджаны ордэнамі Святога Уладзіміра III ступені і Еўфрасінні Полацкай, ордэнам Крыжа Еўфрасінні Полацкай (2002), медалямі князя Канстанціна Астрожскага (Польшча) і Беларускага саюза мастакоў «За заслугі ў выяўленчым мастацтве». Мікалай Кузьміч - лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998), прэмій «За духоўнае адраджэнне» (1997), «Берасцейская зорка» (1997). Ён стаў Чалавекам года - 1997. У 2007 годзе прысвоена званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь». Бібліяграфічны цэнтр Кембрыджскага ўніверсітэта прысвоіў мастаку званне «Чалавек стагоддзя». У 2019 годзе да 1000–годдзя Брэста М. П. Кузьміч стаў Ганаровым грамадзянінам горада Брэста.

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 565.

**Кузьмич Николай Петрович** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1.- С. 514.

**Кузьмич Николай Петрович** // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. – Минск, 2007. – Т. 4. - С. 339.

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: У. Ю. Аляксандраў (гал. рэд.). – Мінск, 2013. - Т. 4. - С. 618.

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. – С. 436. – (Імі ганарацца землякі).

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Сучаснае беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва XXI стагоддзе = Современное белорусское декоративно-прикладное искусство XXI век=Modern Belarustar ats and crats XXI century: альбом / аўтар тэксту, склад., пераклад на бел. мову К. С. Аксёнава. - Мінск: Беларуская энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. – С. 104-105.

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Мастакі Брэстчыны. – Брэст, 2019. – С. 48-49.

**Мацяш, Н.** Прыгожая доля : верш / Ніна Мацяш // У прыгаршчах ветру : вершы, пераклады,эсэ / Ніна Мацяш. – Мінск, 2009. – С. 52.

Верш прысвечаны мастаку М. П. Кузьмічу.

**Мікалай Кузьміч** // Мастакі Брэстчыны. - Брэст, 2010. - С. 70.

**Николай Кузьмич** // Художники Брестчины : альбом-каталог на русском и английском языках. – Брест, 1997. - С. 50.

**Художник Н. П. Кузьмич**, воссоздавший Крест Евфросинии Полоцкой // Современная Беларусь : энциклопедический справочник : в 3 т. – Минск, 2007. - Т. 3. Культура и искусство. – С. 342 : фото.

**Кузьмич, Н. П**. 24-25 сентября брестчане поклонятся Кресту Евфросинии Полоцкой / [Николай Кузьмич ; беседовал] Сергей Мощик // Вечерний Брест. - 2020. — 25 сентября (№ 39). — С. 3 : фот.

**Беларускі** каляндар. 2020 год Кузьміч Мікалай Пятровіч // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. – 2019. - № 9. – С. 21 (дадатак).

**Кузьмич, Н.** В моем лице наградили культуру / Николай Кузьмич ; [беседовал] Александр Седнев // Вечерний Брест. – 2019. – 23 августа. – С. 1, 3.

Интервью с новоиспеченным Почетным гражданином Бреста Николаем Кузьмичем.

**Кузьмич, Н.** «В моем лице наградили культуру» / Николай Кузьмич; [беседовал] Александр Седнев // Духовный вестник. - 2019. - № 11. – С. 3.

Беседа с художником-ювелиром, Почетным гражданином г. Бреста Н. Кузьмичем.

**Лосич, П.** Мастеру – почёт / П. Лосич // Советская Белоруссия. – 2019. - 27 августа. – С. 7.

Художник-эмальер Николай Кузьмич стал почетным гражданином Бреста.

**Николай** Кузьмич - Почетный гражданин города Бреста // Вечерний Брест. – 2019. – 23 августа. – С. 3.

**По заказу** митрополита Павла // Вечерний Брест. - 2019. - 4-5 января (№ 1). — С. 5.

По заказу митрополита Павла Н. Кузьмичу удалось восстановить ризу чудотворной иконы Красностокской Божьей Матери.

**Глушко, Х.** Работа — просто золото / Христина Глушко // Рэспубліка. - 2018. — 15 снежня. — С. 8.

Художник-ювелир Н. Кузьмич возродил уникальную технику древневизантийской перегородчатой эмали.

**Орлова, И.** Кузьмичёва Воля / Ирина Орлова // Заря. – 2018. – 20 марта. – С. 5.

В деревне Патрики Кобринского района 28 ноября 1950 года появился на свет будущий художник Н. П. Кузьмич.

**Хокимова, А.** «Курган» до Парижа доведёт / Антонина Хокимова // Вечерний Брест. – 2018. – 23 марта. – С. 4.

Художник-эмальер Н. Кузьмич примет участие в выставке, посвященной 100-летию БНР.

**Шеламова, Т.** Топ-7 культурного Олимпа: Брест. Эмальер Николай Кузьмич / Татьяна Шеламова // Вечерний Брест. - 2018. — 12 октября. — (Приложение: Экспресс-Вечерний Брест. - № 40. - С. 5).

Художник-эмальер Н. Кузьмич представлял Беларусь на Международном форуме современного искусства в Париже.

**Гоголь, С.** Признание таланта / Светлана Гоголь // Заря. – 2017. – 23 мая. – С. 1.

Н. Кузьмич стал победителем Национальной премии в области изобразительного искусства.

**Кузьмич, Н.** «Несите свой крест со смирением…» / [Николай Кузьмич ; беседовал Геннадий Левчук] // Духовный вестник. – 2017. - № 8 (август). – С. 3.

**Кузьмич** Николай Петрович // Духовный вестник. – 2017. - № 8 (август). – С. 3.

**Левчук, Г.** Крест Евфросинии Полоцкой (1161 г.). 20 лет воссозданию / Геннадий Левчук // Духовный вестник. – 2017. - № 8 (август). - С. 2.

Воссоздание креста Евфросинии Полоцкой поручено брестскому ювелиру-эмалировщику, члену Союза художников Белоруссии Н. П. Кузьмичу.

**Ролич, О.** Крест Евфросинии Полоцкой / Ольга Ролич // Заря. – 2017. – 10 августа. – С. 11.

Ювелиром-эмалировщиком Николаем Кузьмичем была изготовлена полноразмерная копия креста преподобной Евфросинии Полоцкой.

**Хокимова, А.** Брестский художник-ювелир Николай Кузьмич стал лауреатом Национальной премии / Антонина Хокимова // Вечерний Брест. – 2017. – 24 мая. – С. 2.

**В гости** к Николаю Кузьмичу // Вечерний Брест. – 2016. – 20 января. – С. 8.

В Национальном центре современных искусств открыта выставка художественных эмалей Николая Кузьмича.

**Кузьміч, М.** Ювелір, які не літуе ланцужкі і прагне канкурэнцыі / [Мікалай Кузьміч; гутарыў Пётра Васілеўскі] // Культура. - 2016. - 2 красавіка. - С. 8, 9, 14.

**Хокимова, А.** «Візантный» мастера / Антонина Хокимова // Вечерний Брест. – 2016. – 24 августа. – С. 3.

Николай Кузьмич открывает авторскую галерею в историческом центре г. Бреста.

**Хокимова, А.** От библейских сюжетов до портрета / Антонина Хокимова // Вечерний Брест. – 2016. – 24 июня. – С. 12.

На выставке эмали в Испании представлены работы художника Николая Кузьмича.

**Кузьмич, Н.** Уникальных дел мастер / [Николай Кузьмич ; беседовала] Елена Синявская // Брестский вестник. – 2015. – 26 ноября. – С. 12.

**Сіняўская, А.** Юбілейная «Кропка» Мікалая Кузьміча / Алена Сіняўская // Брестский вестник. – 2015. – 3 декабря. – С. 2.

Адбылося адкрыццё юбілейнай выставы таленавітага мастака-ювеліра Мікалая Кузьміча.

**Славін, В.** Багатая душа і залатыя рукі / Віктар Славін // Народная трыбуна. – 2015. – 6 лістапада. – С. 7.

Мастак М. Кузьміч узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны.

**Кондрашук, Н.** Николай Петрович Кузьмич / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. – 2014. – 16 октября. – С. 3.

**Кондрашук, Н.** Портреты – встречи / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. – 2014. – 16 октября. – С. 3.

О художниках Кобринщины из книги Л. Волосюка «Непрыдуманыя партрэты»: Н. П. Кузьмиче, Н. Ващуке, И. А. Крусе, Л. А. Довбуше.

**Кузьмич, Н. П.** «На воссоздание святынь меня благословил Митрополит Филарет» / [Николай Петрович Кузьмич ; беседовал Александр Курец] // Сельская газета. – 2014. – 9 августа. – С. 11.

Беседа с художником-эмальером, ювелиром, членом Белорусского союза художников, заслуженным деятелем искусств Беларуси, лауреатом премии Президента Республики Беларусь «За духовное возрождение» Н. П. Кузьмичем.

**Мальчевская, Е**. Невыразимое и бесконечное / Елена Мальчевская // Неман. - 2013. - № 4. - С. 142-143.

О работе Н. П. Кузьмича по восстановлению Креста Евфросинии Полоцкой.

**Галоўка, С.** Мікалай Кузьміч: «Я быў звычайным савецкім атэістам» / Сяргей Галоўка // Беларуская думка. - 2011. - № 10. – С. 78-86.

**28 лістапада -** 60 гадоў з дня нараджэння (1950) М. П. Кузьміча, мастака-ювеліра // Новыя кнігі.- 2010. - № 10. - С. 17-18.

**Шаранговіч, Н**. Руплівец на ніве спадчыны / Наталля Шаранговіч // Роднае слова. - 2010. - № 10. - С. 106-108.

**Богданова, К.** Загадка «Белорусской Атлантиды» / Екатерина Богданова // Вечерний Брест. - 2009. - 16 сентября. - С. 8.

Эмальер Н. Кузьмич подарил Художественному музею около 40 своих работ.

**Кузьмич, Н**. Надо работать, а не ждать, когда придет вдохновение / Николай Кузьмич // Заря.- 2009. - 3 декабря. - С. 18-19.

**Кузьміч, М.** Каб шчасце прыйшло як заслуга / М. Кузьміч, гутарыла Алена Капачова // ЛіМ. – 2008. – 3 мая. - С. 10.

**М. Кузьміч**. «Мець чыстую душу і маліцца свайму богу…» / Мікалай Кузьміч // Мастацтва. - 2008. - № 6. - С. 39-41.

**70 гадоў** з дня нараджэння М. П. Кузьміча (1950) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 141-142.

**Мікалай Пятровіч Кузьміч**: чалавек стагоддзя : біябібліяграфічны паказальнік / УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага» ; склад. Т. С. Філіпава, В. А. Гарбачэўская. – Брэст : Паліграфія, 2011. - 52 с.

# ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.*** Ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь» прысвойваецца выдатным вучоным, якія маюць вучоную ступень доктара навук, за заслугі ў распрацоўцы прыярытэтных напрамкаў навукі і тэхнікі, стварэнні навуковых школ, выхаванні і падрыхтоўцы навуковых кадраў.

*О государственных наградах Республики Беларусь : Закон Республики Беларусь, 18 мая 2004 года, № 288-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. Минск, 2019.*



**ДЗЯМЧУК Міхаіл Іванавіч** (1946-2016). Вядомы дзяржаўны грамадскі дзеяч, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР. Беларускі вучоны, спецыяліст у галіне навуковага прыборабудавання і квантавай радыёфізікі. Рэктар Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР. За ўсім гэтым - адзін чалавек, наш зямляк Міхаіл Іванавіч Дзямчук, ураджэнец вёскі Дзевяткі Кобрынскага раёна, выпускнік СШ № 2. Нарадзіўся 28 мая 1946 года ў простай сялянскай сям'і. Вучыўся ў школе ў вёсцы Рынкі, потым у СШ № 2 горада Кобрына, якую закончыў з залатым медалём. У 1963 годзе паступіў на фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна (БДУ), які закончыў у 1968 годзе, паступіў у аспірантуру кафедры ядзернай фізікі. Сваю працоўную дзейнасць пачаў малодшым навуковым супрацоўнікам БДУ ў 1970 годзе. У 1970-1976 гадах працаваў у БДУ малодшым, старшым навуковым супрацоўнікам. З 1976 па 1984 год - загадчык лабараторыі Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем БДУ, у 1983-1985 гадах – загадчык кафедры аўтаматызацыі навуковых даследаванняў і сакратар парткома Белдзяржуніверсітэта. Доктар фізіка-матэматычных навук (1983), прафесар (1985). З 1985 па 1988 год - загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ, з 1988 года - міністр народнай адукацыі БССР. З 1991 года – намеснік старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, курыраваў пытанні адукацыі, навукі, культуры, аховы здароўя. З ліпеня 1994 года - рэктар Беларускай політэхнічнай акадэміі (БДПА). У 2000-2001 гадах – намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. З 2001 года – дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу БДПА, з 2002 года – рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ, з 2014 года ўзначальваў інфармацыйна-аналітычную работу інстытута. Сфера навуковых інтарэсаў Міхаіла Іванавіча Дземчука: прыбора-і машынабудаванне, сістэмны аналіз і арганізацыйнае праектаванне. Ён развіў новы напрамак у эксперыментальнай і тэхнічнай фізіцы, быў кіраўніком шэрагу праектаў і праграм, накіраваных на фарміраванне ў рэспубліцы высокаэфектыўнай сістэмы трансферу тэхналогій, арганізацыю эканамічных зон высокай інавацыйнай актыўнасці і навукова-вытворчых комплексаў і прадпрыемстваў высокай тэхналагічнай культуры. Створаныя ім прыборы і сістэмы ёсць больш чым у 30 навуковых цэнтрах Беларусі, Расіі, Германіі, ЗША і іншых краін. Аўтар больш 300 навуковых прац, у тым ліку 40 вынаходніцтваў і 3 манаграфій. Падрыхтаваў 10 кандыдатаў і дактароў навук.

Навуковыя дасягненні М. І. Дземчука атрымалі шырокае прызнанне. Ён лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі 1979 года і лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне навукі і тзхнікі 1986 года. Дзяржаўная прэмія БССР 1986 года прысуджана М. І. Дземчуку за распрацоўку і ўкараненне ў практыку оптыка-фізічных даследаванняў статыстычных метадаў часавага аналізу хуткапераменных патокаў светлавога выпраменьвання. Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Рэспублікі Беларусь, мае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь» (1996). У 1986-1990 гадах ён дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, з 1989 па 1991 год - дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.

26 ліпеня 2016 года Міхаіл Іванавіч Дзямчук пайшоў з жыцця. Пахаваны на ўсходніх могілках у Мінску. Заслужана ў гонар нашага земляка названа адна з вуліц горада Кобрына - вуліца Дземчука.


**Демчук, М. И**. Высшая школа в стратегии инновационного развития Республики Беларусь / М. И. Демчук. – Минск : РИВШ, 2006.

**Демчук, М. И.** Республика Беларусь: системные принципы устойчивого развития / М. И. Демчук, А. Т. Юркевич. – Минск : РИВШ БГУ, 2003.

**Демчук, М. И.** Системная методология инновационной деятельности: учебное пособие / М. И. Демчук, А. Т. Юркевич – Минск : РИВШ, 2007.

**Дзямчук Міхаіл Іванавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш. ]. – Мінск, 1998. - Т. 6. – С. 149.

**Дзямчук Міхаіл Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 434. – (Імі ганарацца землякі).

**Демчук Михаил Иванович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2006. - Т. 3. – С. 332.

**Демчук Михаил Иванович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 321-322.

**Демчук Михаил Иванович** // Большой белорусский энциклопедический словарь. – Минск, 2011. – С. 111.

**Демчук Михаил Иванович** // Национальная академия наук Беларуси : энциклопедический справочник. – Минск, 2017. - С. 144-145.

**Демчук Михаил Иванович** // Национальная Академия наук Беларуси : персональный состав. - Минск, 2003.

**Мешечко, Е. Н.** Демчук Михаил Иванович / Е. Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Нёмана, Западного Буга и Припяти / Е. Н. Мешечко. – Брест, 2012. – С. 225-226.

**Дзямчук Міхаіл Іванавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 40-43 : фат.

**Да 70-годдзя** з дня нараджэння М. І. Дземчука // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 11.

**Курачук, С.** Таленты роднага краю / Святлана Курачук, Ксенія Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. - 1 ліпеня. – С. 10.

У рамках праекта «Людзі навукі нашага краю» – артыкул пра М. І. Дземчука.

**Демчук Михаил Иванович** : [некролог] // Советская Белоруссия. - 2016. - 28 июля. - С. 3.

**Кузич, В.** Время неумолимо... / Владимир Кузич // Кобрынскі веснік. - 2016. - 6 жніўня. – С. 4.

26 июля 2016 года ушел из жизни М. И. Демчук - доктор физико-математических наук, профессор, член-корреспондент Национальной АН Беларуси.

**Светлай памяці** калегі і выдатнага чалавека М. І. Дземчука : [некралог] // Настаўніцкая газета. - 2016. - 28 ліпеня. - С. 16.

**Этот день в истории** : 28 мая 1946 г. // Советская Белоруссия. - 2016. - 28 мая. – С. 24.

О Михаиле Демчуке, ученом, уроженце д. Девятки Кобринского района.

**Дзямчук, М.** «Маё сэрца назаўсёды застаецца тут» / Міхаіл Дзямчук // Кобрынскі веснік. – 2013. – 20 ліпеня. – С. 9.

Віншаванне прафесара, доктара фізіка-матэматычных навук, заслужанага дзеяча навукі РБ М. Дземчука з Днём вызвалення г. Кобрына.

**Этот** день в истории // Советская Белоруссия. – 2011. – 28 мая. – С. 30.

**Министр** учился в средней школе № 2 : ими гордится Кобрин // Кобрин-информ. - 2009. - 17 сентября. – С. 26.

**Кушнер, В.** Шлях адолее толькі той, хто ідзе наперад / Васіль Кушнер // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. - № 2. – С. 3–10.

Рэспубліканскаму дзяржаўна-грамадскаму аб'яднанню «Беларускае таварыства «Веды», якое с 1988 г. па 1993 г. узначальваў М. Дзямчук – 60 гадоў.

**Михаил** Иванович Демчук (К 60-летию со дня рождения) // Изв. НАН Беларуси. Сер. физ.-матем. наук. - 2006. - № 2.

**Славутыя** землякі // Кобрынскі веснік. - 2004. - 28 лютага. - С. 4.

**Акадэмія** сацыяльнага аптымізму // Звязда. - 1998. - 18 лістапада. – С. 3.

Гутарка з М. Дзямчуком па тэме «Студэнт на рубяжы стагоддзяў: адчуванне перспектывы».

**Дзямчук, М**. «Мы павінныісці да перадавой мадэлі развіцця вышэйшай школы» / М. Дзямчук // Настаўніцкая газета. - 1998. - 31 сакавіка. – С. 2.

**ПАДПАЛАЎ Уладзіслаў Паўлавіч.** Нарадзіўся 9 жніўня 1958 года ў вёсцы Імянін Кобрынскага раёна. Закончыў Віцебскі медыцынскі інстытут (1981). З 1981 па 1983 год вучыўся ў клінічнай ардынатуры на кафедры прапедэўтыкі ўнутраных хвароб Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. З 1983 года працаваў урачом у Віцебскім абласным кардыялагічным дыспансеры. У 1985 годзе паступіў у вочную аспірантуру па тэрапіі пры кафедры прапедэўтыкі ўнутраных хвароб. З 1988 года працаваў асістэнтам, з 1994-га - дацэнтам, з 1996 па 1997 год - прафесарам кафедры шпітальнай тэрапіі. За гады яго працы прарэктарам Віцебскага медыцынскага інстытута (1997-2005) распрацоўваліся і ўкараняліся новыя канцэптуальныя падыходы развіцця аховы здароўя і ўдасканалення медыцынскай адукацыі. З'яўляўся намеснікам старшыні працоўнай групы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па падрыхтоўцы і рэалізацыі нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь на 2007-2010 гады. На падставе паглыбленага аналізу стану здароўя насельніцтва і дзейнасці лячэбна-прафілактычных устаноў г. Віцебска і Віцебскай вобласці пад кіраўніцтвам У. П. Падпалава распрацавана «Канцэпцыя ўмацавання здароўя насельніцтва Віцебскай вобласці і праграмныя кірункі яе рэалізацыі да 2015 года». Прайшоў курс навучання па тэрапіі і кардыялогіі Карнуэльскага ўніверсітэта (ЗША, 1996), курс прафесійнай перападрыхтоўкі на факультэце сацыяльнай медыцыны, арганізацыі і кіравання аховай здароўя БЕЛМАПА (2000-2002), на факультэце педагогікі і псіхалогіі ВДМУ (2002-2005). Знаёміўся з арганізацыяй аховы здароўя Італіі (2001), Чэхіі (2002), Нідэрландаў (2005) і Швецыі (2007). Уладзіслаў Паўлавіч мае вышэйшыя



кваліфікацыйныя катэгорыі ўрача-тэрапеўта і ўрача-арганізатара аховы здароўя. Ён з'яўляецца галоўным пазаштатным кардыёлагам Кіравання аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама. З 1999 года і па цяперашні час У. П. Падпалаў з'яўляецца загадчыкам кафедры тэрапіі № 1 ФПК і ПК Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. У 2000 годзе ён арганізаваў і ўзначаліў Беларускае грамадскае аб'яднанне па артэрыяльнай гіпертаніі. Пад яго кіраўніцтвам праведзена 8 міжнародных канферэнцый па гэтай праблеме, у якіх прымалі ўдзел навукоўцы больш чым з 20 краін свету, у тым ліку з Расіі, ЗША, Канады, Нідэрландаў, Швецыі, Польшчы, Грэцыі, Латвіі, Літвы, Філіпін, Сірыі і іншых краін. Уладзіслаў Паўлавіч мае навуковыя працы па дэмаграфічнай бяспецы ў Рэспубліцы Беларусь і ролі ў ёй сардэчна-сасудзістай паталогіі ў насельніцтва, у прыватнасці, у пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС; па распрацоўцы медыкамянтозных і немедыкамянтозных метадаў карэкцыі. Кіруе фундаментальнымі і прыкладнымі навуковымі даследаваннямі ў вобласці аховы здароўя, дэмаграфіі, прафілактычнай медыцыны і кардыялогіі. Аўтар больш 350 навуковых і навукова-метадычных прац, 7 вынаходстваў, 6 з якіх абаронены патэнтамі. Член экспертнай камісіі Навуковага медыцынскага Савета Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, член рэдакцыйных саветаў двух замежных і трох айчынных часопісаў. Неаднаразова прымаў удзел з дакладамі на вядучых міжнародных і еўрапейскіх кангрэсах, канферэнцыях і з'ездах, як у Рэспубліцы Беларусь, так і ў Расіі, Канадзе, Японіі, Францыі, Італіі, Іспаніі, Швецыі, Чэхіі, Галандыі, Польшчы, Грэцыі і іншых краінах. Ён мае публікацыі ў англамоўных часопісах. Беларускі вучоны ў вобласці клінічнай медыцыны, выдатнік аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук (1996), прафесар (2005). За ўклад у практычную дзейнасць па ахове здароўя насельніцтва ў 2001 годзе прафесару У. П. Падпалаву была ўсталявана персанальная надбаўка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Навуковец узнагароджаны медалём «Францыска Скарыны», нагрудным знакам «Выдатнік аховы здароўя», памятным медалём «За заслугі развіцця ВДМУ», медалём «Сто гадоў прафсаюзам», ганаровымі граматамі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта і Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў. У 2014 годзе прысвоена званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь».

**Подпалов, В. П.** Прогнозирование развития и прогрессирования артериальной гипертензии : [монография] / В. П. Подпалов, В. П. Сиваков. – Витебск : ВГМУ, 2005.

**Подпалов Владислав Павлович** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. - Минск, 2009. - Т. 1, кн. 2. - С. 245–246.

**Подпалов Владислав Павлович** // Республика Беларусь : энциклопедия : в 7 т. - Минск, 2008. - Т. 6. - С. 129.

**Падпалаў Уладзіслаў Паўлавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2000. - Т. 11. - С. 504.

**Падпалаў Уладзіслаў Паўлавіч** (1958, Кобр. р-н), вучоны ў галіне клінічнай медыцыны, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік аховы здароўя – 60 гадоў з дня нараджэння // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. - 2017. - № 9. - С. 8. - (Дадатак да бюлетэня. Беларускі каляндар. 2018 год).

**60 гадоў** з дня нараджэння Падпалава Уладзіслава Паўлавіча // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 71.

**Падпалаў Уладзіслаў Паўлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2017. - С. 104–106.



**СВІДУНОВІЧ Мікалай Аляксандравіч -** доктар тэхнічных навук, прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, прэзідэнт Расійска-Беларускай навукова-тэхнічнай асацыяцыі «Сумесныя праекты», віцэ-прэзідэнт асацыяцыі «Чарнобыль і экалогія» (ЗША). Нарадзіўся 29 красавіка 1940 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння ў 1962 годзе Беларускага політэхнічнага інстытута (БПІ) па спецыяльнасці «Машыны і тэхналогіі ліцейных вырабаў» працаваў інжынерам на Мінскім трактарным заводзе. 1964-1967 – гады вучобы ў аспірантуры пры БПІ. У 1967 годзе М. Свідуновіч абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1980 годзе - доктарскую дысертацыю па тэме «Легіраванне і мадыфіцыраванне ліцейных сплаваў з выкарыстаннем нізкатэмпературнай плазмы». З 1968 года працуе ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце: асістэнт, дацэнт, намеснік дэкана, загадчык кафедры матэрыялазнаўства і тэхналогіі металаў (1980-2007), з 2007 года - прафесар кафедры матэрыялазнаўства і тэхналогіі металаў. Ен чытаў лекцыі ў вядучых універсітэтах свету ў ЗША, Францыі, Вялікабрытаніі і іншых краінах. Падрыхтаваў 15 кандыдатаў навук. М. А. Свідуновічам сумесна з П. А. Віцязем упершыню ў Рэспубліцы Беларусь выдадзены вучэбны дапаможнік «Основы нанотехнологий и наноматериалов». М. А. Свідуновіч - аўтар 15 замежных патэнтаў, у тым ліку такіх краін, як ЗША, Японія, ФРГ, Італія, Швецыя, Вялікабрытанія, 60 аўтарскіх пасведчанняў СССР, 200 апублікаваных прац, з іх 2 манаграфій. Яго навуковыя інтарэсы: высокатэмпературныя тэхналогіі: плазмафурменны і дуплексфурменны працэсы (запатэнтаваны ў 15 краінах Захаду, паспяхова выкананы 2 міжнародныя кантракты, устаноўкі працуюць у Расіі, Украіне, Балгарыі), высокатэмпературная перапрацоўка адходаў (выкарыстоўваецца ў Рэспубліцы Беларусь); нанатэхналогіі і нанаматэрыялы, распрацавана ўнікальная тэхналогія выкарыстання фулерэнзмяшчальных матэрыялаў для атрымання спецыяльных сталей і сплаваў. За апошні час М. А. Свідуновіч выканаў шэраг праектаў, якія звязаны з высокатэмпературнай перапрацоўкай металазмяшчальных адходаў. Ён адкрыў новы напрамак па ўплыву фулеронаў на ўласцівасці спецыяльных сталей і сплаваў. Узнагароджаны медалём СССР «За працоўную доблесць» (1979), граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР (1980), Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2000), Сусветным медалём Свабоды (The World Medal of Freedom) Амерыканскага біяграфічнага інстытута (2006). 2 кастрычніка 2015 года М. А. Свідуновічу прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь».

**Міляшкевіч, Я. Г.** Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч / Я. Г. Міляшкевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 14. – С. 257.

**Свидунович Николай Александрович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 6. - – С. 589.

**Свидунович Николай Александрович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 334.

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Гапанович, А. Н.** Николай Александрович Свидунович / Афанасий Гапанович // Дивин - древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 76. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 47-49.

# ЗАСЛУЖАНЫ МЕЛІЯРАТАР БЕЛАРУСКАЙ ССР

***ЗАСЛУЖАНЫ МЕЛІЯРАТАР БЕЛАРУСКАЙ ССР***, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным інжынерам-меліяратарам, тэхнікам-меліяратарам, механізатарам меліярацыйных машын і іншым работнікам меліярацыйных прадпрыемстваў і арганизацый, калгасаў, саўгасаў і навукова-даследчых устаноў, якія працавалі па спецыяльнасці не менш як 10 гадоў і маюць вялікія заслугі ў галіне праектавання, будаўніцтва і эксплуатацыі меліярацыйных сістэм і высокаэфектыўнага выкарыстання асушаных зямель. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 07.03.1963.

*Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т.*
*Мінск, 1971. Т. 4. С. 512.*

**СЕЛІВАНЮК Васілій Раманавіч** (1923-2002). Нарадзіўся ў горадзе Высокае Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Працаваў машыністам гусенічнага крана ПМК-52 Кобрынскага раёна.



У 1973 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны меліяратар Беларускай ССР».

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Селіванюк Васіль Раманавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Лукашик, П. И.** Прошлое и настоящее / Петр Иосифович Лукашик. – Брест : Брестская типография, 2002. – 48 с.

См. на с. 33.

**Кукас, Я.** Слова пра земляка / Я. Кукас // Камуністычная праца. – 1987. – 5 лютага.

Званне «Заслужаны меліяратар БССР» прысвоена машыністу экскаватара Васілю Раманавічу Селівоніку, а Якаву Раманавічу Кузьмічу і Івану Георгіевічу Саўчуку ўручаны вышэйшыя ўзнагароды — ордэны Леніна.

# ЗАСЛУЖАНЫ МЕХАНІЗАТАР СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

***ЗАСЛУЖАНЫ МЕХАНІЗАТАР СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР***, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным інжынерам і тэхнікам калгасаў, саўгасаў, машынарамонтных майстэрняў, навукова-даследчых устаноў і іншых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, якія працавалі ў сельскай гаспадарцы па спецыяльнасці не менш як 10 гадоў і маюць вялікія заслугі ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі. Установлена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 28.03.1961.

*Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т.*
*Мінск, 1971. Т. 4. С. 512-513.*

**БАНДАРУК Міхаіл Канстанцінавіч.** Працаваў звеннявым калгаса «Шлях Леніна» Кобрынскага раёна. 22 лютага 1962 года прысвоена ганаровае званне «Заслужаны механізатар сельскай гаспадаркі Беларускай ССР».

**Список** лиц, удостоенных почетных званий // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 212.

Бондарук Михаил Константинович 22.02.62 г. Звеньевой колхоза «Путь Ленина» Кобринского района.

**МАЛОЧКА Аляксандр Філіпавіч.** Працаваў кіраўніком Кобрынскага раённага аб'яднання «Сельгастэхніка». 27 сакавіка 1968 года прысвоена ганаровае званне «Заслужаны механізатар сельскай гаспадаркі Беларускай ССР».

**Список** лиц, удостоенных почетных званий // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 212.

Заслуженный механизатор сельского хозяйства БССР Молочко Александр Филиппович 27.03.68 г. Управляющий Кобринским районным объединением «Сельхоз-техника».

# ЗАСЛУЖАНЫ НАСТАЎНІК БЕЛАРУСКАЙ ССР
# ЗАСЛУЖАНЫ НАСТАЎНІК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***ЗАСЛУЖАНЫ НАСТАЎНІК БЕЛАРУСКАЙ ССР***, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР за выдатныя поспехі ў галіне народнай асветы і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці настаўнікам і кіраўнікам пачатковых, васьмігадовых, сярэдніх, спецыяльных школ, школьным інспектарам і загадчыкам аддзелаў народнай асветы, выкладчыкам і дырэктарам педагагічных вучылішчаў, загадчыкам педагагічных кабінетаў, якія маюць стаж работы ў сістэме народнай асветы не менш як 10 гадоў. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР 04.06.1940.

*Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. Мінск, 1971. Т. 4. С. 513.*

***ЗАСЛУЖАНЫ НАСТАЎНІК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,*** ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафесійным настаўнікам, выкладчыкам, выхавальнікам і іншым работнікам дашкольных устаноў, агульнаадукацыйных устаноў усіх відаў, устаноў пазашкольнага выхавання і навучання, устаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, дзіцячых дамоў, якія працуюць па спецыяльнасці пятнаццаць і больш гадоў, за заслугі ў педагагічнай і выхаваўчай дзейнасці, якая забяспечвае атрыманне навучэнцамі і выхаванцамі глыбокіх ведаў, развіццё і ўдасканаленне іх творчага патэнцыялу.

*О государственных наградах Республики Беларусь : Закон Республики Беларусь, 18 мая 2004 года, № 288-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – Минск, 2019.*

**АМЕЛЬЯНЮК *Людміла Мікалаеўна*.** Нарадзілася 16 верасня 1950 года ў вёсцы Стрыгава Кобрынскага раёна. У 1972 годзе закончыла Мінскі педагагічны інстытут замежных моў. Працуе ў Брэсце: з 1972 года ў сярэдняй школе № 3, з 1977 года - у СШ № 2, з 1988 года намеснік дырэктара па навучальна-выхаваўчай працы, з 1997 года – дырэктар СШ № 2. З 1999 года ў гімназіі № 5 (да 2017 дырэктар). Дэпутат Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў у 2003-2006 гадах. Званне «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь» прысвоена ў 2012 годзе.



**Кабайда, Г. И.** Омельянюк Людмила Николаевна / Г. И. Кабайда // Брест. Брэст. Brest. 1000 / сост. А. Н. Вабищевич . – Минск, 2019. – С. 363. – (Заслуженные учителя и работники образования).

**АМЕЛЬЯНЮК Ніна Васільеўна**. Нарадзілася ў 1939 годзе ў вёсцы Лешня Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Закончыла гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Працавала настаўніцай у вёсцы Азяты, у вячэрняй школе і СШ № 1 горада Кобрына. У 1979-1982 гадах - завуч, у 1982-1996 гадах - дырэктар СШ № 1 горада Кобрына. Выбіралася дэпутатам гарадскога Савета. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1978 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Амельянюк Ніна Васільеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**БАГАЦЮК Ніна Іванаўна**. Нарадзілася ў 1936 годзе ў вёсцы Акцябр Кобрынскага павета (цяпер Акцябр Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці). Пасля заканчэння Брэсцкага педвучылішча ў 1954 годзе была накіравана настаўніцай пачатковых класаў Пігановіцкай пачатковай школы, дзе працавала да выхаду на пенсію ў 1992 годзе. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1977 годзе.

**Заслужаныя** настаўнікі. **Багацюк Ніна Іванаўна** // Памяць. Драгічынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 1997. - С. 424. – (Заслужаныя работнікі Рэспублікі Беларусь).

**БУКАЧ Антон Васільевіч** (1937-2016). Нарадзіўся 7 красавіка 1937 года ў вёсцы Гайкоўка Кобрынскага павета (цяпер Гайкоўка Кобрынскага раёна) у шматдзетнай сялянскай сям'і. Працоўную біяграфію пачаў у 15 гадоў памочнікам каваля ў калгасе «Зара» (цяпер СВК «Узыходзячая зара») і адначасова вучыўся ў вячэрняй школе. З 1956 па 1959 год служыў у пагранічных войсках. Пасля звальнення ў запас і да 1961 года быў супрацоўнікам аддзела міліцыі, узнагароджаны медалём «За выдатную службу па ахове грамадскага парадку» (1967). З 1961 па 1968 год працаваў акумулятаршчыкам, машыністам па рамонту электраабсталявання, аператарам КВПіА ў ЛВУ магістральных газаправодаў. У 1964 годзе закончыў Кобрынскую завочную сярэднюю школу рабочай моладзі, у 1965 годзе паступіў на завочны факультэт Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі, які закончыў у 1971 годзе па спецыяльнасці «інжынер-электрык». У гэтыя гады ў працоўнай біяграфіі А. В. Букача - работа інструктарам Кобрынскага гаркама КПБ, намеснікам дырэктара, а затым дырэктарам СПТВ-102 будаўнікоў. З 1982 года ён - дырэктар прафтэхвучылішча № 105 народных мастацкіх промыслаў, дзе і прапрацаваў да 2003 года. З ліпеня 2003 па ліпень 2007 года працаваў намеснікам дырэктара па вытворчым навучанні УА «Кобрынскі дзяржаўны мастацкі прафесійна-тэхнічны каледж». У 2000 годзе А. В. Букачу прысвоена званне «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь». Узнагароджаны медалямі «Ветэран працы» (1987), Францыска Скарыны (2000); юбілейным медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» (1970); ганаровымі граматамі Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў СССР па прафтэхадукацыі. А. В. Букач занесены ў ганаровую кнігу «Хто ёсць хто. Дзелавы свет СНД».



**Букач Антон Васильевич** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 48.

**Антон Васильевич Букач** : [некролог] // Кобрынскі веснік. - 2016. — 16 сакавіка. — С. 3.

**Памяти** коллеги : [некролог] // Заря. – 2016. – 12 марта. – С. 14.

**Елизарова, Ж.** Если молод душой человек… / Жанна Елизарова // Кобрин информ. – 2010. – 22 июля. – С. 30.

О первом директоре Кобринского художественного училища А. В. Букаче.

**Букач Антон Васільевіч** // Кобрынскі веснік. – 1995. – 31 мая. – С. 2.

Аб кандыдаце ў дэпутаты абласнога Савета А. В. Букачы, яго прадвыбарчая праграма.

**ВАЛАСЮК Пётр Мікалаевіч**. Нарадзіўся ў 1927 годзе ў вёсцы Дзеткавічы



Драгічынскага раёна. У 1963 годзе закончыў тры курсы Беларускага інстытута фізкультуры, у 1967 годзе – Брэсцкі педагагічны інстытут. Працаваў настаўнікам ваеннай і фізічнай падрыхтоўкі ў г.п. Антопаль, у вёсцы Дзеткавічы. У 1958 годзе інструктар у школе ДТСААФ у Кобрыне. З 1959 года працаваў выкладчыкам фізкультуры і біялогіі ў СШ № 2 г. Кобрына. У 1971-1989 гадах - дырэктар Кобрынскага Дома юных натуралістаў. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1982 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Валасюк Пётр Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 430. - (Вызначыліся працай).

**Савчук, М.** Когда-то в Кобрине открылась станция юннатов / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2017. — 16 ноября. — С. 3.

За большой вклад в воспитание школьников П. Н. Волосюк, который руководил станцией юных натуралистов с 1971 по 1987 год, получил звание «Заслуженный учитель Белорусской ССР».

**Пашковіч, Л.** Чалавек з вялікай справы / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2017. — 22 ліпеня. — С. 3.

Былы дырэктар тагачаснай станцыі юнатаў, заслужаны настаўнік БССР П. М. Валасюк адзначыў 90-гадовы юбілей.

**Симонова, И.** Призвание / Ирина Симонова, Надежда Прокопович // Кобрин-информ. - 2017. — 13 июля. — С. 2.

Коллективом Кобринского районного эколого-биологического центра (тогда Кобринской станции юных натуралистов) с 1971 по 1987 год руководил П. Н. Волосюк.

**ВОРАНАВА Вольга Іванаўна** (1928-2002). Месца нараджэння - станцыя Нахаў Калінкавіцкага раёна. Закончыла Рэчыцкае педагагічнае вучылішча. З 1952 па 1992 год працавала настаўніцай пачатковых класаў Дзівінскай сярэдняй школы. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1966 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Воранава Вольга Іванаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 430. – (Вызначыліся працай).

**ВРАГАВА Лідзія Парфенаўна**, горад Кобрын. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» Л. П. Врагавай прысвоена ў 1960 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Врагава Лідзія Парфенаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 431. - (Вызначыліся працай).

**ГЕРАШЧАНКА Ніна Пятроўна**, вёска Дзівін. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» Н. П. Герашчанка прысвоена ў 1968 годзе.

**О присвоении** Почетного звания Заслуженного учителя Белорусской ССР работникам народного образования : Указ Презизиума Верховного Совета БССР, 22 марта 1968 года // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186.Оп. 1. Д. 212.

За достигнутые успехи в деле народного образования присвоить Почетное звание Заслуженного учителя Белорусской ССР Геращенко Нине Петровне - организатору внеклассной и внешкольной работы Дивинской средней школы Кобринского района.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Герашчанка Ніна Пятроўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 431. - (Вызначыліся працай).

**ГРОЗНАВА Марыя Дзмітрыеўна**, горад Кобрын.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Грознава Марыя Дзмітрыеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 431. - (Вызначыліся працай).

**ГУРЫН Сяргей Паўлавіч**, вёска Казішча. Працаваў загадчыкам Стасюкоўскай пачатковай школы Кобрынскага раёна. Ганаровае званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1960 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Гурын Сяргей Паўлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 431. - (Вызначыліся працай).

**Список** лиц, удостоенных почетных званий // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 213.

Заслуженный учитель БССР Гурин Сергей Павлович 1.09.1960 заведующий Стасюковской начальной школой Кобринского района.

**ДЗІКОВІЧ Іван Канстацінавіч**. Працаваў дырэктарам Залескай сярэдняй школы Кобрынскага раёна. Ганаровае званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1957 годзе.

**Список** лиц, удостоенных почетных званий // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 467.

Заслуженный учитель БССР Дикович Иван Константинович 18.03.57 г. Директор Залесской средней школы Кобринского района.

**ДУДКО Надзея Ільінічна**. Нарадзілася ў 1926 годзе ў горадзе Варонежы (Расія). Закончыла Брэсцкае педагагічнае вучылішча (1949). Сваю педагагічную дзейнасць пачала ў 1945 годзе ў пачатковай школе ў вёсцы Літвінкі Кобрынскага раёна. Потым ёй давялося некалькі гадоў працаваць у пачатковай школе ў в. Турная, з 1955 года - настаўніцай пачатковых класаў у Кобрынскай сярэдняй школе № 2. За добрасумленную працу ў снежні 1968 года была ўдастоена ганаровага звання «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР».

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Дудко Надзея Ільінічна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Сіманава, І. Э.** Школьная адукацыя Кобрыншчыны ў даваенныя і першыя пасляваенныя гады / Ірына Сіманава // Карані і кроны : гісторыя Кобрыншчыны: першая палова XX стагоддзя / [укладальнікі : Ю. А. Барысюк, А. А. Мезенцэва]. - Брэст, 2017. – С. 108-134.

Гл. на с. 131.

**Елізарава, Ж.** «І дагэтуль у снах бачу школу» / Жанна Елізарава // Народная трыбуна. - 2016. — 30 верасня. — С. 10.

Заслужаны настаўнік БССР Надзея Ільінічна Дудко адзначыла 90-гадовы юбілей.

**Казакова, А.** «До сих пор мне снится школа» / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2016. — 18 августа. — С. 4.

Заслуженный учитель БССР Н. И. Дудко отметила свой 90-летний юбилей.

**Белов, Д.** Сердце учительницы / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2011. - 20 жніўня. - С. 3.

Надежда Дудко проработала в системе образования учителем начальных классов 49 лет.

**ІВАНЧЫКАВА Марыя Якаўлеўна**, вёска Стрыгава. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1962 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Іванчыкава Марыя Якаўлеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 431. - (Вызначыліся працай).

**КАВАЛЬЧУК Мікалай Арцёмавіч**. Працавала загадчыкам Целякоўскай пачатковай школы Кобрынскага раёна. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1964 годзе.

**Список** лиц, удостоенных почетных званий // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 292.

Заслуженный учитель БССР Ковальчук Николай Артемович 17.08.1964 г. заведующий Теляковской начальной школой Кобринского района.

**КАЧУРКА Вольга Рыгораўна** (1931-2012). Нарадзілася ў вёсцы Астроўе Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла Брэсцкае педагагічнае вучылішча. У 1956-1963 гадах - настаўніца Дзівінскай сярэдняй школы, з 1963 па 1983 год у сярэдняй школе в. Верхалессе, з 1983 па 1985 год - у СШ № 6 Кобрына. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1977 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі**. Качурка Вольга Рыгораўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**КІРЫЛАЎ Міхаіл Ільіч** (1912-1992). Нарадзіўся ў вёсцы Ігнацьеўка Новасібірскай вобласці, Расія. У 1936 годзе закончыў настаўніцкі інстытут у горадзе Омску. У час вайны быў у партызанскім атрадзе імя Чапаева. У 1944-1945 гадах - загадчык Кобрынскага раённага аддзела народнай адукацыі, з 1945 года - настаўнік, потым завуч СШ № 1 Кобрына, у 1963-1976 гадах - дырэктар СШ № 5. Выбіраўся дэпутатам гарадскога Савета. Друкаваўся ў часопісах «Народная асвета» (г. Масква),

«Нёман». У 1972 годзе атрымаў літаратурную прэмію за лепшую публікацыю года. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1967 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Кірылаў Міхаіл Ільіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Сіманава, І. Э.** Школьная адукацыя Кобрыншчыны ў даваенныя і першыя пасляваенныя гады / Ірына Сіманава // Карані і кроны : гісторыя Кобрыншчыны: першая палова XX стагоддзя / [укладальнікі: Ю. А. Барысюк, А. А. Мезенцэва]. - Брэст, 2017. – С. 108-134.

Гл. на с. 131.

**Литошенко, М.** «Его невозможно забыть …» / Маргарита Литошенко // Кобрин-информ. – 2012. – 18 октября. – С. 29.

**КЛАЧКОВІЧ Марыя Мікалаеўна**. Нарадзілася 9 чэрвеня 1946 года ў вёсцы Леснікі Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Настаўніцкую дзейнасць пачала ў 1965 годзе піянерскай важатай. Закончыла хіміка-біялагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. З 1969 па 1981 год працавала настаўнікам, дырэктарам Бельскай васьмігадовай школы, метадыстам па прафарыентацыі аддзела народнай адукацыі Кобрынскага райвыканкама. З 1981 года працавала ў Кобрынскім прафесійна-тэхнічным вучылішчы № 153 тэкстыльшчыкаў: намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце, з лістапада 1983 па ліпень 2007 года з'яўлялася яго дырэктарам. З 1 красавіка 2004 года вучылішча перайменавана ва УА «Кобрынскі прафесійны ліцэй сферы абслугоўвання». Пад кіраўніцтвам М. М. Клачковіч стваралася і ўмацоўвалася вучэбна-матэрыяльная база для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных рабочых. З пасады дырэктара ліцэя Марыя Мікалаеўна пайшла ў 2007 годзе, пакінуўшы пасля сябе цвёрды падмурак, які застаецца сённяшняму кіраўніцтву і працоўнаму калектыву ўмацоўваць, удасканальваць і ўтрымліваць яго высокую планку. Яшчэ амаль дзесяць гадоў М. М. Клачковіч працягвала педагагічную дзейнасць, працуючы ў якасці інспектара па кадрах і выкладчыка. Грамадская дзейнасць заўсёды была неад’емнай часткай яе жыцця: сакратар камсамольскай арганізацыі калгаса «За Радзіму», дэпутат мясцовага Савета народных дэпутатаў, прапагандыст маладзёжнага гуртка камбіната грамадскага харчавання, старшыня прафкама прафсаюзнай арганізацыі аддзела адукацыі. За высокі прафесіяналізм, творчасць і наватарскі падыход у навучанні і выхаванні працоўных кадраў Клачковіч М. М. узнагароджана значком «Выдатнік прафтэхадукацыі БССР», Ганаровым знакам «За заслугі ў развіцці прафтэхадукацыі», Ганаровымі граматамі ўпраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У 2002 годзе Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за высокае педагагічнае майстэрства, значны ўклад ва ўдасканаленне навучальна-выхаваўчага працэсу ёй прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь». У дзень 75-годдзя Кобрынскага раёна Клачковіч Марыі Мікалаеўне прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».



**Бакун, А.** Каб зерне ўзышло / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. - 28 красавіка. – С. 4. – (Год малой радзімы).

Усё жыццё Марыі Клачковіч, Ганаровага грамадзяніна Кобрынскага раёна, заслужанага настаўніка Рэспублікі Беларусь, - гэта несупынная самаадданая праца.

**Бакун, А.** Калі шчасце - велічыня пастаянная / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 6 мая. - С. 15.

Актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Кобрыншчыны прымае М. М. Клачковіч, узнагароджаная высокімі тытуламі «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь» і «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

**Клачковіч, М.** Найперш патрабуючы з сябе... / [М. М. Клачковіч ; запісаў] Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2015. - 15 красавіка. - С. 4.

**Савчук, М**. Директор с неиссякаемой энергией / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 29 января. – 2015. – С. 4.

**Сталі грамадзянамі**. Ганаровымі // Народная трыбуна. – 2015. – 23 студзеня. – С. 3.

Звання «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» ўдастоены Марыя Клачковіч, Уладзімір Кузіч і Іван Мароз.

**Віншуем** з узнагародай! // Заря. – 2002. – 8 августа.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за высокае педагагічнае майстэрства ганаровае званне «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь» прысвоена Клачковіч Марыі Мікалаеўне - дырэктару Кобрынскага прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча № 153 тэкстыльшчыкаў.

**Дзюрич, Э.** «Здравствуйте, Мария Николаевна» / Эмма Дзюрич // Заря. – 2002. – 17 октября.

**Прэм'ер-міністр** уручыў дзяржаўныя ўзнагароды // Настаўніцкая газета. – 2002. – 28 верасня.

Звання «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь» удастоена дырэктар Кобрынскага прафтэхвучылішча № 153 тэкстыльшчыкаў Марыя Клачковіч.

**Пянко, А.** Настаўніцкае шчасце / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2002. – 17 жніўня.

**Клюйко, А.** Лідэр : партрэт кіраўніка / А. Клюйко // Настаўніцкая газета. – 2001. – 6 снежня. – С. 2.

Пра дырэктара Кобрынскага ПТВ № 153 М. Клачковіч.

**КОРШУК Серафіма Іосіфаўна**, горад Кобрын. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1971 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Коршук Серафіма Іосіфаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 431. - (Вызначыліся працай).

**КРАВЕЦ Надзея Кузьмінічна**. Нарадзілася ў 1932 годзе ў вёсцы Луцэвічы Кобрынскага раёна. Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Вістыцкай васьмігадовай школе. У 1966 годзе ўзнагароджана медалём «За працоўную доблесць». Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1972 годзе.

**Заслужаны** настаўнік Рэспублікі Беларусь. **Кравец Надзея Кузьмінічна** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Брэсцкага раёна. – Мінск, 1998. – С. 475.

**ЛОСЬ Вольга Сцяпанаўна**. Нарадзілася ў 1928 годзе ў вёсцы Рашын Драгічынскага раёна. Закончыла Брэсцкі настаўніцкі інстытут (1950), Брэсцкі педагагічны інстытут (1964). У 1950-1953 гадах працавала настаўніцай у Дзівінскай сярэдняй школе, з 1953 года ў вячэрняй школе Кобрына, з 1964 па 1969 год - настаўніца беларускай мовы і літаратуры ў Кобрынскай сярэдняй школе № 5. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1974 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Лось Вольга Сцяпанаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**МЕЛЬНІКАВА Кіра Іванаўна**. Нарадзілася ў 1929 годзе ў горадзе Лепель Віцебскай вобласці. У 1949 годзе закончыла Брэсцкае педагагічнае вучылішча. Працавала настаўніцай у няпоўнай сярэдняй школе в. Запруды, загадчыцай школы ў в. Перкі, настаўніцай пачатковых класаў у кобрынскіх сярэдніх школах № 3, № 2, № 5. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1965 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Мельнікава Кіра Іванаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Сіманава, І. Э.** Школьная адукацыя Кобрыншчыны ў даваенныя і першыя пасляваенныя гады / Ірына Сіманава // Карані і кроны : гісторыя Кобрыншчыны: першая палова XX стагоддзя / [укладальнікі : Ю. А. Барысюк, А. А. Мезенцэва]. - Брэст, 2017. – С. 108-134.

Гл. на с. 131.

**ПЛОТКА Надзея Антонаўна**. Нарадзілася 17 мая 1926 года ў вёсцы Стукачоўка Гомельскага раёна. Закончыла фізіка-матэматычны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута. Працавала настаўніцай, завучам СШ у г.п. Антопаль, настаўніцай у СШ № 1 і СШ № 5 Кобрына, з 1973 па 1978 год - завуч СШ № 6 г. Кобрына. Доўгі педагагічны лёс прынёс шэраг узнагарод: «Выдатнік народнай асветы», медаль «За працоўную доблесць», «Ветэран працы» (1982). Была дэлегатам Усебеларускага з’езда настаўнікаў. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1967 годзе.



**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Плотка Надзея Антонаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Пашкович, Л.** З вялікай літары Настаўнік... / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. - 1 чэрвеня. - С. 2.

90-гадовы юбілей адзначыла заслужаная настаўніца БССР Н. А. Плотка.

**ПРЫВАЛАВА Марыя Раманаўна**. Працавала настаўніцай Аніскавіцкай сярэдняй школы. За дасягнутыя поспехі ў справе народнай адукацыі ў 1967 годзе прысвоена званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР».

**Список** лиц, удостоенных почетных званий // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф.186. Оп. 1. Д. 213.

Указом Президиума Верховного Совета Белорусской ССР от 1 сентября 1967 года за достигнутые успехи в деле народного образования присвоено Почетное звание Заслуженного учителя Белорусской ССР Приваловой Марии Романовне - учительнице Онисковичской средней школы.

**САКАЛОВА Надзея Дзмітрыеўна**, горад Кобрын.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Сакалова Надзея Дзмітрыеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 431. - (Вызначыліся працай).

**САМЦОВА Таццяна Іванаўна** (1922-2003). Нарадзілася ў вёсцы Навіны Бярэзінскага раёна. Закончыла Брэсцкі настаўніцкі інстытут. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў партызанскім атрадзе № 212 брыгады імя Караля. Працавала настаўніцай у сярэдніх школах Брэста, Беразіно, намеснікам дырэктара ў СШ № 5 Кобрына. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна». Член Беларускага рэспубліканскага Савета ветэранаў вайны і працы. У сувязі з 30-годдзем Перамогі ў 1975 годзе занесена ў кнігу Народнай славы Кобрынскага раёна. Двойчы выбіралася дэпутатам раённага Савета. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1976 годзе.



**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Самцова Таццяна Іванаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Самцова Татьяна Ивановна** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 306.

**Самцова Татьяна Ивановна** : [некролог] // Кобрынскі веснік. - 2003. - 14 мая. - С. 4.

**Гурда, В.** Когда Родина в опасности / Владимир Гурда // Заря. – 2002. – 30 июля.

Имена кобринчанок Е. Д. Рабчинской (Семенюк) и Т. И. Самцовой, ветеранов войны, партизанок (у каждой орден Отечественной войны и по 11 медалей) занесены в энциклопедию «Кто есть кто в Республике Беларусь».

**СЕМЯНЮК Кацярына Дзям'янаўна** (1922-2013). Нарадзілася 29 кастрычніка 1922 года ў вёсцы Качышча Ельскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыла Мазырскі настаўніцкі інстытут (1946). У гады Вялікай Айчыннай вайны - у партызанскім атрадзе «Бальшавік». З 1946 года працавала настаўніцай у няпоўнай сярэдняй школе ў вёсцы Залессе, з 1946 па 1962 год - завуч Залескай сярэдняй школы. У 1962-1985 гадах настаўніца ў СШ № 5 і СШ № 2 г. Кобрына. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», «За перамогу над Германіей», юбілейнымі медалямі. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1970 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Семянюк Кацярына Дзям'янаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Семенюк Екатерина Демьяновна** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание / под ред. И. В. Чекалова. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 311.

**Сіманава, І. Э.** Школьная адукацыя Кобрыншчыны ў даваенныя і першыя пасляваенныя гады / Ірына Сіманава // Карані і кроны : гісторыя Кобрыншчыны: першая палова XX стагоддзя / [укладальнікі : Ю. А. Барысюк, А. А. Мезенцэва]. - Брэст, 2017. – С. 108-134.

Гл. на с. 131.

**Семенюк Екатерина Демьяновна** : [некролог] // Кобрынскі веснік. – 2013. – 3 красавіка. – С. 2.

Е. Д. Семенюк - заслуженный учитель БССР, ветеран войны и педагогического труда, ушла из жизни 22 марта 2013 года.

**Шевченко, А.** Юность, опаленная войной… / Алла Шевченко // Кобрин-информ. – 2007. – 10 мая. – С. 3.

**Гурда, В.** Когда Родина в опасности / Владимир Гурда // Заря. – 2002. – 30 июля.

Имена кобринчанок Е. Д. Рабчинской (Семенюк) и Т. И. Самцовой, ветеранов войны, партизанок (у каждой орден Отечественной войны и по 11 медалей) занесены в энциклопедию «Кто есть кто в Республике Беларусь».

**СІДЗЮК Клаўдзія Афанасьеўна**. Нарадзілася ў 1921 годзе ў вёсцы Казелец Тамбоўскай вобласці (Расія). Закончыла Тамбоўскае педагагічнае вучылішча (1944). З 1948 года працавала ў Кобрыне настаўніцай пачатковых класаў у СШ № 1 і СШ № 3. Друкавалася ў часопісах. У маі 1957 года прысвоена званне «Выдатнік народнай адукацыі БССР», 22 сакавіка 1968 года - званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР».



**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Сідзюк Клаўдзія Афанасьеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Сіманава, І. Э.** Школьная адукацыя Кобрыншчыны ў даваенныя і першыя пасляваенныя гады / Ірына Сіманава // Карані і кроны : гісторыя Кобрыншчыны: першая палова XX стагоддзя . - Брэст, 2017. – С. 108-134.

Гл. на с. 131-133.

**СТАШЭЎСКАЯ Ганна Антонаўна**. Нарадзілася ў 1928 годзе ў вёсцы Конань Рэчыцкага раёна. Закончыла Рэчыцкае педагагічнае вучылішча. Працавала выхавацелем Антопальскага дзіцячага дома, завучам Гарадзецкага дзіцячага дома. З 1961 па 1972 год - выхавацель Гарадзецкай школы-інтэрната, выхавацель групы прадоўжанага дня Гарадзецкай СШ (1972-1983). Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1965 годзе.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Сташэўская Ганна Антонаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Хільчук, М.** З любоўю да людзей і справы / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1998. – 10 чэрвеня. – С. 3.

Уклад Г. А. Сташэўскай высока ацэнены дзяржавай.

**ФІЛЮТОВІЧ Вера Львоўна**. Нарадзілася 12(25) кастрычніка 1899 года ў горадзе Тэрэспаль Бяла-Падляскага раёна (Польшча). У 1904 годзе сям'я пераехала ў Брэст-Літоўск. У 1908 годзе вучылася ў Брэсцкай жаночай гімназіі. Закончыла сярэднюю школу ў 1918 годзе ў горадзе Малаяраславец Калужскай вобласці. У 1922 годзе ў Кобрыне паступіла на польскія настаўніцкія курсы, пасля заканчэння якіх працавала ў Кобрынскай пачатковай школе (1922-1924). З 5 снежня 1924 па 15 верасня 1926 года - у Хабовіцкай пачатковай школе, з 1 лютага 1944 па 15 чэрвеня 1944 года - у Кобрынскай украінскай пачатковай школе. У 1946 годзе закончыла завочна Пружанскую настаўніцкую семінарыю. Працавала загадчыцай Барысаўскай пачатковай школы Кобрынскага раёна (1924, 1926-1944, 1944-1959). 12 мая 1958 года прысвоена званне «Заслужаны настаўнік школы Беларускай ССР».



**Список** лиц, удостоенных почетных званий // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 166.

Филютович Вера Львовна 12.05.1958 г. Заведующая Борисовской начальной школой Кобринского района.

**ХРАМАВА Вольга Мікалаеўна**, горад Кобрын.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. Заслужаныя настаўнікі. **Храмава Вольга Мікалаеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 431. - (Вызначыліся працай).

# ЗАСЛУЖАНЫ НАСТАЎНІК ПРАЦУЮЧАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

***ЗАСЛУЖАНЫ НАСТАЎНІК ПРАЦУЮЧАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСКАЙ ССР***, ганаровае званне, якое прысвойвалася ў 1976-1981 гадах высокакваліфікаваным настаўнікам працоўнай моладзі за вялікія заслугі ў навучанні юнакоў і дзяўчат прафесійнаму майстэрству і выхаванні ў іх камуністычных адносін да працы, высокіх ідэйных і маральных якасцей. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 10.06.1975.

*Беларуская энцыклапедыя : у 18 т.*
*Мінск, 1998. Т. 6. С. 555.*

**СЯЛЮК Пётр Дзянісавіч**. Узнагароджаны нагрудным знакам «Настаўнік моладзі» (1976). У 1978 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік працоўнай моладзі Беларускай ССР».



Гл. с. 76

**Долготович, Б. Д.** Селюк Петр Денисович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32.

**Заслужаныя** настаўнікі працуючай моладзі Беларускай ССР. **1978. П. Д. Сялюк** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1998. - Т. 6. - С. 555.

**Мельнік, Р.** Жыццевае крэда Пятра Селюка / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2006. – 22 ліпеня.

**Пётр Дзянісавіч Сялюк** // Кобрынскі веснік. – 2002. – 20 ліпеня. – (Кобрына Ганаровыя грамадзяне).

[**Вярнуўшыся** з XXVI з’езда КПСС] // Камуністычная праца. – 1981. – 7 сакавіка.

Вярнуўшыся з XXVI з’езда КПСС, яго дэлегат, токар рамонтнага завода Пётр Дзянісавіч Сялюк, падзяліўся з таварышамі сваімі ўражаннямі.

**Петр Денисович Селюк**, токарь Кобринского авторемонтного завода // Камуністычная праца. – 1981.

**Праводзілі** делегата на з'езд // Камуністычная праца. – 1981. – 21 лютага.

Урачыста праводзілі на XXVI з'езд КПСС токара рамонтнага завода Пятра Дзянісавіча Селюка яго таварышы па працы.

**Романов, В.** Простые истины / В. Романов // Заря. – 1981. - 17 января.

Вся рабочая биография Петра Денисовича Селюка связана с Кобринским авторемзаводом.

# ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.*** Ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» прысвойваецца высокапрафесійным навукова-педагагічным і іншым работнікам устаноў адукацыі, органаў кіравання сістэмы адукацыі, якія працуюць па спецыяльнасці 15 і больш гадоў, за заслугі ў педагагічнай і выхаваўчай рабоце, арганізацыі навучальна-вытворчага працэсу, яго навукова-метадычным забеспячэнні.

*О государственных наградах Республики Беларусь : Закон Республики Беларусь, 18 мая 2004 года, № 288-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. Минск, 2019.*

**КАЧУРКА Васілій Іванавіч**. Нарадзіўся 27 верасня 1950 года ў вёсцы Стры Кобрынскага раёна. Закончыў Мінянскую сярэднюю школу. У 1967 годзе паступіў у Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Пасля заканчэння акадэміі займаў розныя кіраўнічыя пасады на прадпрыемствах Магілёўскай вобласці. Працаваў галоўным аграномам у адной з найбуйных гаспадарак. Сем гадоў кіраваў эксперыментальнай базай «Пагодзіна» (Гарэцкі раён Магілёўскай вобласці). Працуючы кіраўніком гаспадаркі, абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1983 годзе быў пераведзены на пасаду першага намесніка начальніка абласнога кіравання сельскай гаспадаркі, потым год працаваў у абкаме партыі намеснікам загадчыка сельскагаспадарчага аддзела. З 1985 па 1990 год узначальваў партыйную арганізацыю горада Крычава. У 1990 годзе працаваў у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі выкладчыкам, у маі 1991 года яго прызначылі дэканам аграномічнага факультэта. Факультэт быў адным з самых буйных - больш тысячы студэнтаў. 12 гадоў В. І. Качурка - дэкан аграномічнага факультэта БСХА ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці. У снежні 2002 года абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Асаблівасці тэхналогіі апрацоўкі высокіх ураджаяў зімавой трыцікале». Потым паступіла прапанова ўзначаліць ізноў створаны дзяржуніверсітэт у Баранавічах. Дарэчы, БарДУ - першая дзяржаўная навучальная ўстанова, створаная ва ўмовах сувярэннай Беларусі. З 2004 года В. І. Качурка - рэктар Баранавіцкага ўніверсітэта. Акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі (2005), Міжнароднай акадэміі навук педагагічнай адукацыі (2009), Акадэміі эканамічных навук Украіны (2014). Беларускі навуковец у вобласці сельскай гаспадаркі, доктар сельскагаспадарчых навук (2003), прафесар (2003). Узнагароды: медаль «За працоўныя заслугі» (2009), ганаровыя граматы Савета Міністраў (2000), Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці (2000), Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2010), ЦК Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі (2009) і інш. Ганаровага звання «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» удастоены ў 2015 годзе.



**Кочурко, В. И.** Технология хранения, переработки и стандартизация продукции растениеводства : учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по агрономическим специальностям / Г. А. Жолик [и др.] ; рец.: В. И. Кочурко, Н. Н. Петюшев. – Минск : ИВЦ Минфина, 2014. – 574 с.

**Кочурко, В. И.** Основы органического земледелия : пособие / В. И. Кочурко, Е. Э. Абарова, В. Н. Зуев. – Минск : Донарит, 2013. – 173 с. : ил.

**Кочурко, В. И.** Рациональное природопользование и природоохранные технологии на производстве : учеб.-метод. пособие для студентов высш. учеб. заведений / В. И. Кочурко, В. Н. Зуев, С. К. Рындевич. – Барановичи : РИО БарГУ, 2010. – 238 с. : ил.

**Кочурко, В. И.** Формирование элементов продуктивности и урожайности озимой тритикале в зависимости от предшественников / В. И. Кочурко // Сб. ст. Акад. наук Польши. - Вып. 538. – Щетин, 2009. – С. 111–117.

**Кочурко, В. И.** Роль микроэлементов в формировании урожайности сои / В. И. Кочурко, Е. Э. Абарова // Земледелие. – 2014. – № 8. – С. 30–32.

**Кочурко, В. И.** На пути к признанию и успеху : Барановичскому государственному университету 10 лет / В. И. Кочурко // Вышэйшая школа. – 2014. – № 3. –С. 39–43.

**Кочурко Василий Иванович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2006. – Кн. 2. - С. 506.

**Кочурко Василий Иванович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 6 т.]. – Минск, 2007. – Т. 4. – С. 257.

**Василий Иванович Кочурко** : биобиблиографический указатель / учреждение образования «Барановичский государственный университет», библиотека ; сост. Л. В. Горбунова, Т. В. Громова. – Барановичи, 2015. – 55 с.

**Качурка, В.** «Першыя крокі рабіліся тут» / Васіль Качурка // Кобрынскі веснік. – 2013. – 20 ліпеня. – С. 4.

Віншаванне доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара В. Качуркі (нар. у в. Стрыі Кобрынскага раёна) з Днём вызвалення г. Кобрына.

**Кочурко, В. И.** Мы смело смотрим в будущее / [Василий Иванович Кочурко ; беседовал]
А. К. Щербацевич // Хозяин. – 2005. – № 7. – С. 2-3.

**Кочурко, В.** Барановичи – университетские / [Василий Кочурко ; беседовала] Людмила Бунеева // Вечерний Брест. - 2004. – 13 августа. – С. 1-2.

**Пянко, А.** Настоящее дело для молодых / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2004. – 3 красавіка – С. 4.

Кочурко В. И. - доктор сельскохозяйственных наук, профессор, декан агрономического факультета Белорусской государственной ордена Октябрьской Революции и ордена Трудового Красного Знамени сельскохозяйственной академии, уроженец д. Стрии Кобринского района.

**70 гадоў** з дня нараджэння В. І. Качурка (1950) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 139.

**Качурка Васілій Іванавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 68-70 : фат.

**Кочурко, Василий Иванович** [Электронный ресурс] // База данных Ученые Беларуси. – Режим доступа: http://unicat.nlb.by/scient/pls/dict.-prn_ref?tu. – Дата доступа: 05.10.2017.

# ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК АХОВЫ ЗДАРОЎЯ БЕЛАРУСКАЙ ССР

# ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,*** ганаровае званне, якое прысвойваецца ўрачам, навуковым супрацоўнікам, сярэдняму і малодшаму медыцынскаму персаналу, правізарам, фармацэўтам, інжынерна-тэхнічным работнікам, абслуговаму персаналу лячэбна-прафілактычных, санітарна-прафілактычных, санаторна-курортных, аптэчных устаноў, органаў аховы здароўя, навукова-даследчых, медыцынскіх і фармацэўтычных інстытутаў, прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў і аб'яднанняў незалежна ад ведамаснай падпарадкаванасці, якія працуюць у галіне аховы здароўя 15 і больш гадоў, за заслугі ў ахове здароўя насельніцтва, павышэнні якасці медыцынскай дапамогі і лекавага забеспячэння. Устаноўлена законам ад 13.04.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 29.10.1971 існавала званне ***заслужанага работніка аховы здароўя БССР,*** якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР.

*Беларуская энцыклапедыя : у 18 т.*
*Мінск, 1998. Т. 6. С. 561-562.*

**ШАЎЧУК Ганна Рыгораўна**. Нарадзілася ў 1933 годзе ў вёсцы Нятрэба Кобрынскага павета (цяпер Нятрэба Кобрынскага раёна). Закончыла Брэсцкую фельчарска-акушэрскую школу. Працавала фельчарам, выконваючым абавязкі галоўнага ўрача Дзмітравіцкай участковай бальніцы Камянецкага раёна; акушэркай, фельчарам, выконваючым абавязкі галоўнага ўрача Гарадзецкай урачэбнай амбулаторыі. Прысвяціла медыцыне 42 гады. У 1982 годзе прысвоена званне «Заслужаны работнік аховы здароўя Беларускай ССР».




**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Шаўчук Ганна Рыгораўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Дубіна, Л.** З чуласцю да людзей / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. — 19 лістапада. — С. 3.


Жыхарка аграгарадка Гарадзец Г. Р. Шаўчук мае званне заслужанага работніка аховы здароўя БССР.

**ШПІЛЕЎСКІ Сігізмунд Іванавіч**. Нарадзіўся ў 1919 годзе ў горадзе Кобрыне. У гады Вялікай Айчыннай вайны на фронце з чэрвеня да верасня 1941 года, з лістапада 1941 да сакавіка 1944 года, з чэрвеня 1944 да мая 1945 года, старшы лейтэнант. Калі ў 1948 годзе ў мэтах актывізацыі барацьбы з сыпным тыфам і для яго прафілактыкі ў Кобрынскай санітарна-эпідэміялагічнай станцыі пачаў ствараецца супрацьэпідэмічны аддзел, першым яго кіраўнікам стаў памочнік эпідэміёлага Сігізмунд Іванавіч. У далейшым у час адсутнасці галоўнага ўрача выконваючым яго абавязкі прызначаецца С. Шпілеўскі.

У 1974 годзе С. І. Шпілеўскаму прысвоена званне «Заслужаны работнік аховы здароўя Беларускай ССР».

**Заслужаны** работнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. 1977. **С. І. Шпілеўскі** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1998. – Т. 6. – С. 561, 562.

**Шпілеўскі Сігізмунд Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 301. – (Яны прайшлі дарогамі вайны).

**Рапинчук, В. В.** Время, события, люди / В. В. Рапинчук // Кобрин-информ. – 2014. – 7 августа, 14 августа, 21 августа, 28 августа.

История становления санитарной службы Кобринского района.

# ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ГАНДЛЮ І ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ССР

***ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ГАНДЛЮ І ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ССР***, ганаровае званне, якое прысвойвалася высока-кваліфікаваным работнікам гандлю і грамадскага харчавання за працу ў сістэме дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю не менш за 10 гадоў, за асаблівыя дасягненні ў развіцці гандлю і грамадскага харчавання і ў паляпшэнні гандлёвага абслугоўвання насельніцтва. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 7.02.1966, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. Існавала да 23.11.1988.

*Беларуская энцыклапедыя : у 18 т.*
*Мінск, 1998. Т. 6. С. 562.*

**ВАШЧУК *Лідзія Аляксандраўна*.** У 1977 годзе прысвоена званне «Заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання Беларускай ССР».

**Заслужаны** работнік гандлю і грамадскага харчавання Беларускай ССР. 1977. **Л. А. Вашчук** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1998. – Т. 6. – С. 562, 563.

# ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ***, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным работнікам устаноў культуры, кінематаграфіі, тэлебачання і радыё, друку, выдавецтваў, паліграфічнай прамысловасці і кніжнага гандлю, турысцка-экскурсійных арганізацый і ўстаноў і інш., якія працавалі ў галіне культуры не менш як 10 гадоў, за заслугі ў развіцці культуры. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 29.10.1971, прысвойвалася Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР. З 13.04.1995 прысвойваецца званне ***заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь***.

*Беларуская энцыклапедыя : у 18 т.*
*Мінск, 1998. Т. 6. С. 563.*

***ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,*** ганаровае званне, якое прысвойваецца высокакваліфікаваным работнікам устаноў культуры, паліграфіі, друку, радыё і тэлебачання, іншых арганізацый, у тым ліку дзяржаўных органаў, якія ажыццяўляюць кіраванне і рэгуляванне ў сферы культуры, а таксама пісьменнікам, паэтам, удзельнікам самадзейнай творчасці, якія працуюць у галіне культуры пятнаццаць і больш гадоў, за заслугі ў развіцці культуры.

*О государственных наградах Республики Беларусь : Закон Республики Беларусь, 18 мая 2004 года, № 288-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. Минск, 2019.*

**ДЗЕМЯНЧУК Надзея Рыгораўна** (1940-2001). Нарадзілася ў вёсцы Песцянькі Кобрынскага раёна. Закончыла Гродзенскае культурна-асветнае вучылішча, Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут. Працавала загадчыцай Хадыніцкай сельскай бібліятэкі, піянерважатай Бярозаўскай школы, культарганізатарам Кобрынскага парку культуры і адпачынку імя А. В. Суворава, загадчыцай чытальнай залы Кобрынскай раённай бібліятэкі, загадчыцай Кобрынскай раённай дзіцячай бібліятэкі, дырэктарам Кобрынскага парку культуры і адпачынку імя А. В. Суворава. У 1991 годзе прысвоена званне «Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР».



**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Дземянчук Надзея Рыгораўна** // Памяць. Кобрынскі раён: гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 428-429. – (Вызначыліся працай).

**Мельнік, Р.** З паркам назаўжды / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2011. - 7 мая. - С. 4.

Важны ўклад у роскміт кобрынскага парку зрабіла былы яго дырэктар заслужаны работнік культуры БССР Н. Р. Дзямянчук.

**Березюк, Е.** По этим аллеям ходил Суворов / Е. Березюк // Рэспубліка. - 2005. - 20 верасня.

Традиции парка заложили его бывшие директора Василий Харитонюк, Николай Выморков, Надежда Деменчук.

**Илларионова, Л**. Там по ночам кричат павлины / Лара Илларионова // Вечерний Брест. – 2004. – 16 июля.

Знаменит суворовский парк и своими праздниками, традиции проведения которых заложили его первые директора – в их числе заслуженный работник культуры БССР Н. Г. Деменчук.

**Андросюк, И.** Кобринские жар-птицы / Ирина Андросюк // Кобрынскі веснік. – 2004. – 18 верасня.

Надежда Григорьевна Деменчук (бывший директор парка) много времени уделяла развитию живого уголка кобринского парка.

**Кірык, В.** З днём нараджэння, парк! / [Валерый Кірык ; гутарыў] Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2003. – 27 верасня.

Шмат удалося зрабіць у справе арганізацыі культурна-масавай работы Надзеі Дзямянчук, якая працавала дырэктарам парку з 1977 да 1993 года.

**Мартынов, А.** Наш парк / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1994. – 12 лютага. – С. 2, 3.

Под руководством Н. Деменчук значимость и известность парка поднялась на новую высоту.

**Дземянчук, Н.** Для лепшага адпачынку / Н. Дземянчук // Камуністычная праца. – 1986. – 11 сакавіка.

**ЛЮБЧУК Сяргей Феадосавіч**. Нарадзіўся 2 мая 1940 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна. Закончыў Беларускую кансерваторыю (1965). З 1960 года С. Ф. Любчук - выкладчык, кіраўнік аркестра сярэдняй школы № 34 г. Мінска, саліст-баяніст Беларускага тэлебачання і радыё. З 1965 года - у Брэсце: кіраўнік аркестра народных інструментаў і выкладчык музычнага вучылішча, кіраўнік народнага ансамбля песні і танца «Брастчанка» электрамеханічнага завода (1970-1980), з 1981 года - мастацкі кіраўнік народнага ансамбля песні і танца «Бярэсце» Палаца культуры абласнога савета прафсаюзаў. Адначасова з 1995 года - мастацкі кіраўнік народнай харавой групы «Красуні» ААТ «Прадтавары» ў горадзе Брэсце. Аўтар фантазій на тэмы беларускіх народных песень для баяна з аркестрам народных інструментаў, рамансаў, песень (у тым ліку «Шла дзяўчына з яру», «Прывітальная», «Светлячкі Чарнобыля», «Песня пра Бярэсце»), «Элегіі» для хору a cappella, музыкі да спектакляў Брэсцкага абласнога тэатра лялек, апрацовак і перакладаў для аркестра народных інструментаў і народных хораў. У 1978 годзе прысвоена званне «Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР».



**Лученок, И.** [Вступление] / И. Лученок // Любы мой край: зборнік песень / С. Ф. Любчук – Брэст : выд. С. Лабарова, 2000.

**Любчук Сергей Феодосьевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. – В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. – Кн. 1. - С. 52.

**Вядомыя** людзі, ураджэнцы в. Дзівін. **Любчук Сяргей Фядосавіч** // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 43-44.

**Любчук Сяргей Фядосавіч** // Новыя кнігі : на старонках беларускага друку. – 2019. - № 8. – С. 21.

2 мая - Любчук Сяргей Фядосавіч (1940, Кобр. р-н), дзеяч самадзейнага мастацтва, кампазітар, педагог, заслужаны работнік культуры Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

**Определены** финалисты музыкального конкурса «Песни о Бресте» // Заря. – 2018. – 2 октября.

Любчук Сергей Феодосьевич среди финалистов первого этапа конкурса проекта «Песни о Бресте».

**Рубашевский, Ю.** «Голоса Полесья» на Волыни / Юрий Рубашевский // Вечерний Брест. – 2012. – 22 августа.

Народный ансамбль «Берестье» (руководитель Сергей Любчук) получил Почетную грамоту дипломанта международного фестиваля искусств «Песни великой Волыни».

**Гармель, Е.** С любовью к песне / Елена Гармель // Вечерний Брест. – 2012. – 12 июля.

Песени заслуженного работника культуры Беларуси Сергея Любчука есть в репертуаре народного хора «Скарбніца».

**Шеламова, Т.** Играй, музыкант / Татьяна Шеламова // Вечерний Брест. – 2010. – 30 апреля.

Жизненный и творческий путь С. Любчука.

**Зажигали** «Красуні» // Вечерний Брест. – 2009. – 2 октября.

Ансамблем «Красуні» руководит Сергей Любчук.

**Музыкальный** подарок [Электронный ресурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. – Режим доступа: http://kb.brl.by/index.php/books/item/311-музыкальный-подарок. – Дата доступа: 05.04.2019.

Среди авторов нотного сборника композиторов Брестчины «Музыкальный подарок» - С. Ф. Любчук.

**ПІСАРУК Фёдар Фёдаравіч** (1941-1998). Нарадзіўся ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна. У 1986 годзе прысвоена званне «Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР».

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Пісарук Фёдар Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**ЧЭРНІК Ігар Паўлавіч.** Нарадзіўся 25 жніўня 1932 года ў вёсцы Гарадзец Кобрынскага павета (цяпер в. Гарадзец Кобрынскага раёна).



Закончыў Гродзенскае педагагічнае вучылішча (1968), Мінскі інстытут культуры (1983). Працаваў мастацкім кіраўніком Антопальскага дзіцячага дома, кіраўніком фотагуртка і вакальнай групы Кобрынскага Дома піянераў, настаўнікам музыкі і спеваў СШ № 1 горада Кобрына, дырэктарам Кобрынскага РДК, дырэктарам Брэсцкага абласнога Дома народнай творчасці, мастацкім кіраўніком народнага хору настаўнікаў Камянецкага РДК, дырэктарам Чарнянскай дзіцячай музычнай школы, мастацкім кіраўніком народнага ансамбля народнай песні «Галасы Палесся» (г. Брэст), з 1997 года хормайстар народнага хору «Колас» Гарадзецкага сельскага клуба. За сваё

жыццё стварыў пяць самастойных народных хораў: хор Кобрынскага раённага Дома культуры, народны хор настаўнікаў Камянецкага РДК, народны хор «Чарнічанка» саўгаса «Маладая гвардыя» Брэсцкага раёна, народны хор «Колас» Гарадзецкага калгаса-камбіната імя Дзяржынскага, народны ансамбль песні «Галасы Палесся» ў г. Брэсце. У снежні 1966 года ўзнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку», у 1973 годзе - знакам Міністэрства культуры СССР «Выдатнік культурнага шэфства над сялом». Высокае званне «Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР» (1975) Ігару Чэрніку прысвоена за ўзорную працу ў Кобрынскім Доме культуры, які пры яго дырэктарстве ў 1970-я гады быў прызнаны лепшым у рэспубліцы. Таксама ён лаўрэат усіх трох Усесаюзных фестываляў народнай творчасці. У 1971 годзе - дэлегат з'езда дырэктараў Дамоў культуры СССР, на якім Беларусь прадстаўлялі толькі пяць чалавек.

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Чэрнік Ігар Паўлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Черник Игорь Павлович** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание / под ред. И. В. Чекалова. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 367.

**Дубіна, Л.** «Усё жыццё – творчасць» / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. – 2017. – 30 верасня. – С. 4.

Адзначыў свой 85-гадовы юбілей заслужены работнік культуры БССР Ігар Паўлавіч Чэрнік.

**Лесик, И.** Когда превыше благ земных духовное начало / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. – 2014. – 13 снежня. – С. 10.

О композиторе, краеведе, заслуженном работнике культуры Белоруской ССР из д. Городец Игоре Павловиче试Чернике.

**Лесик, И.** Когда превыше благ земли духовное начало / Ирина Лесик ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2014. — 13 снежня. — С. 10.

Об И. П. Чернике, заслуженном работнике культуры Белорусской ССР.

**Сідарук, І.** Жыццё на высокай ноце / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 2012. – 25 жніўня. – С. 3.

Аб жыцці І. П. Чэрніка, кампазітара, заслужанага работніка культуры.

**Казакова, А.** Песни сердца Игоря Черника / Анна Казакова // Кобрин – информ. – 2012. – 30 августа. – С. 5.

Свой 80-летний юбилей отметил Игорь Павлович Черник.

**Черник Игорь Павлович** : информация Кобринского отдела культуры. – Кобрин, 2012.

# ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ ССР
# ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ПРАМЫСЛОВАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ПРАМЫСЛОВАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,*** ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафесійным рабочым, майстрам, інжынерна-тэхнічным работнікам арганізацый, у тым ліку навукова-даследчых, праектна-канструктарскіх, розных галін вытворчасці, работнікам органаў кіравання вытворчасцю, якія працуюць у прамысловасці пятнаццаць і больш гадоў і ўнеслі значны ўклад ва ўдасканаленне тэхнікі, тэхналогіі і арганізацыі вытворчасці, дасягненне высокіх паказчыкаў якасці прадукцыі, павышэнне прадукцыйнасці працы і эфектыўнасці вытворчасці.

*О государственных наградах Республики Беларусь :Закон Республики Беларусь, 18 мая 2004 года, № 288-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – Минск, 2019.*

***ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ ССР*** …. З 1971 года існавала ганаровае званне «Заслужаны работник прамысловасці Беларускай ССР», якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР.

*Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 1998. Т. 6. С. 564.*

**ПАДМАСКОЎНАЯ Хрысціна Людвігаўна.** Круцільшчыца Кобрынскай ткацкай фабрыкі «Чырвоны сцяг». У 1976 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік прамысловасці Беларускай ССР».

**О присвоении** почетных званий Белорусской ССР работникам предприятий и организаций промышленности, транспорта, связи, энергетики, строительства, торговли и бытового обслуживания населения : Указ Указ Президиума Верховного Совета БССР, 5 мая 1976 года // Зональный государственный архив в г. Кобрине. – Ф. 186. Оп. 1. Д. 560.

Заслуженного работника промышленности Белорусской ССР Подмосковной Христине Людвиговне - крутильщице Кобринской ткацкой фабрики «Красное знамя».

**ШУТРО Ганна Мікалаеўна** (1942-2020). Нарадзілася 7 студзеня 1942 года ў вёсцы Зарой Дзятлаўскага раёна. Закончыла завочны Маскоўскі ўсесаюзны інстытут харчовай прамысловасці. Біяграфія Ганны Шутро на Кобрыншчыне пачалася ў 1978 годзе, калі яе - галоўнага інжынера Лёзненскага кансервава-агароднінасушыльнага камбіната - перавялі на пасаду дырэктара Кобрынскага кансервавага завода. На той час яна мела добрую практыку ў кансервавай галіне. Ужо праз год кіраўніцтва Г. Шутро Кобрынскі кансервавы завод быў занесены на гарадскую Дошку гонару. Прадукцыю прадпрыемства ведалі не толькі ў рэспубліцы, але і ва ўсім Савецкім Саюзе. Завод стаў пастаянным уладальнікам пераходнага Чырвонага сцяга, а пасля распаду Саюза - яго захавальнікам. Заводу Ганна Шутро прысвяціла 22 гады. Адданасць і шчырасць у працы Г. М. Шутро адзначаны шматлікімі ўзнагародамі, сярод якіх - сярэбраны медаль ВДНГ СССР і ордэн Дружбы народаў (1986). У 1999 годзе ёй было прысвоена званне «Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь». У энцыклапедычнае выданне «Хто ёсць хто ў Рэспубліцы Беларусь», прысвечанае 70-годдзю Вялікай Перамогі, унесена яе імя. Такое прызнанне Г. М. Шутро атрымала за значныя дасягненні ў прафесіянальнай дзейнасці і актыўную грамадзянскую пазіцыю. Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, Ганна Мікалаеўна з'яўлялася членам прэзідыума Кобрынскага раённага савета ветэранаў і старшынёй савета ветэранаў ААТ «Кобрынскі кансервавы завод».



**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Шутро Ганна Мікалаеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Шутро Анна Николаевна** : [некролог] / Кобринский районный исполнительный комитет, Кобринский районный Совет депутатов // Кобрынскі веснік. - 2020. — 30 верасня (№ 76). — С. 7 : фот.

**Елизарова, Ж.** «Время выбрало нас» / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. —2 кастрычніка. — С. 4 : фот.

Анна Шутро — первая женщина-руководитель в г. Кобрине.

**Дубіна, Л.** Жыла жыццём завода / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2015. - 15 жніўня. - С. 4.

**Мельнік, Р.** Добрыя справы не забываюцца / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2013. – 6 сакавіка. – С. 2.

У гарадскім Палацы культуры ўпершыню адбыўся ўрачысты прыём заслужаных людзей Кобрыншчыны, узнагароджаных працоўнымі ордэнамі і медалямі, у ліку якіх Г. М. Шутро.

**Елизарова, Ж.** Мои года – мое богатство / Жанна Елизарова // Кобрин-информ. - 2012. - 12 января (№ 2). - С. 5.

**Мельнік, Р.** Вернасць роднаму калектыву / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2011. - 1 кастрычніка. - С. 4.

Аб ветэране працы Кобрынскага кансервавага завода Ганне Мікалаеўне Шутро.

**Мельнік, Р.** Ісці насустрач былым калегам / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2006. – 22 лістапада.

З 2000 года Г. Шутро выконвае абавязкі старшыні пярвічнай ветэранскай арганізацыі ААТ «Кансервавы завод».

**Пянко, А.** Крэда дырэктара / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1998. – 23 верасня. – С. 2.

Пад кіраўніцтвам Г. Шутро на Кобрынскім кансервавым заводзе ўкаранілі новыя тэхналогіі, асвоілі шматлікія віды прадукцыі.

# ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР, РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,*** ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь высокапрафесійным работнікам органаў, установаў і прадпрыемстваў сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва, што працуюць у гэтай галіне 15 і больш гадоў, за заслугі ў арганізацыі сацыяльнай дапамогі грамадзянам, іх пенсіённага забеспячэння, укараненні розных форм і відаў дабрачыннасці, развіцці навуковых даследаванняў па найважнейшых кірунках сацыяльнай абароны насельніцтва. Устаноўлена 13.04.1995. У 1981-1988 існавала званне ***заслужаны работнік сацыяльнай абароны Беларускай ССР,*** якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР.

*Беларуская энцыклапедыя : у 18 т.*
*Мінск, 1998. Т. 6. С. 566.*

**ЯРОМІН Лявонцій Васільевіч** (1948-2020). Нарадзіўся 30 чэрвеня 1948 года ў



вёсцы Папялёва Пружанскага раёна. У 1967 годзе закончыў Брэсцкае медыцынскае вучылішча, потым Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Сваю працоўную дзейнасць пачаў загадчыкам медыцынскай амбулаторыі ў вёсцы Тэльмы Брэсцкага раёна. У 1971 годзе прыняты на працу фельчарам у Шэрашэўскі дом інвалідаў. У 1983 годзе ўзначаліў дзяржаўную ўстанову «Кобрынскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў». Пад яго кіраўніцтвам павысіўся ўзровень працы дома-інтэрната, неаднаразова ўстанове прысвойваўся статус адной з лепшых у вобласці.

Імя Л. В. Яроміна добра вядома ў сістэме сацыяльнай абароны не толькі вобласці, але і рэспубліцы. 40 гадоў свайго жыцця прысвяціў ён гэтай высакароднай справе, з іх 30 гадоў працаваў дырэктарам дамоў-інтэрнатаў. За добрасумленныя адносіны да працы, дасягнутыя высокія вынікі і вялікі асабісты ўклад у развіццё галіны ў 1998 годзе Л. В. Яроміну было прысвоена званне «Заслужаны работнік сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь». Па выніках працы ў 2007 годзе атрымаў ганаровае званне «Чалавек года». Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. На працягу многіх гадоў Лявонцій Васільевіч з'яўляўся членам рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў. Імя Яроміна Лявонція Васільевіча ўнесена ў міжнародную энцыклапедыю «Лепшыя людзі».

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Яромін Лявонцій Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Еремин Леонтий Васильевич** : [некролог] // Кобрынскі веснік. – 2020. – 8 лютага. – С. 3.

Ушел из жизни бывший руководитель государственного учреждения «Кобринский психоневрологический дом-интернат для престарелых и инвалидов», заслуженный работник социальной защиты Республики Беларусь Л. В. Еремин.

**Савчук, М.** Дом-интернат — дело всей жизни / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2018. — 6 декабря (№ 49). — С. 5.

70-летие отметил заслуженный работник социальной защиты Республики Беларусь Л. В. Еремин.

**Два** жителя Кобрина включены в международную энциклопедию «Лучшие люди» // Кобрин - информ. – 2012. – 6 сентября. – С. 3.

Второй выпуск энциклопедии «Лучшие люди», совместный проект бывших союзных республик России, Украины, Казахстана и Беларуси, включает два жителя Кобрина — Т. М. Слинко, Л. В. Еремин.

**Петрова, А.** Всякое время своих друзей собирает / Алина Петрова // Беларускі час. - 2011. - 25 февраля - 3 марта. - С. 25.

Директор Кобринского психоневрологического дома-интерната Л. Ерёмин награжден медалью за развитие социального партнёрства.

**Охремук, Л.** «Мы не одни, когда есть дом...» / Лариса Охремук // Заря. - 2008. - 27 ноября. - С. 7.

Имя Л. В. Еремина хорошо известно в системе социальной защиты не только области, но и республики.

# ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР, РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,*** ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафесійным работнікам сельскай гаспадаркі, у тым ліку работнікам сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, дзяржаўных органаў, навукова-даследчых і іншых арганізацый, у тым ліку арганізацый, што абслугоўваюць сельскую гаспадарку, якія працуюць у галіне сельскай гаспадаркі пятнаццаць і больш гадоў, за заслугі ў павелічэнні вытворчасці і рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі, забеспячэнні паспяховага функцыянавання сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

*О государственных наградах Республики Беларусь :Закон Республики Беларусь, 18 мая 2004 года, № 288-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. Минск, 2019.*

**АШМЯНЦАЎ Сяргей Дзмітрыевіч**. Нарадзіўся 20 верасня 1954 года ў вёсцы Рай Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1978). Працаваў загадчыкам гаража, галоўным інжынерам аўтапрадпрыемства Кобрынскай райсельгастэхнікі. З 1979 па 1990 год - намеснік старшыні па аўтатранспарце Кобрынскай райсельгастэхнікі, інструктар, загадчык сельскагаспадарчага аддзела Кобрынскага гаркама КПБ. У 1990-1995 гадах - старшыня калгаса імя Суворава Кобрынскага раёна. У 1995-2002 гадах працаваў старшынёй Кобрынскага райвыканкама. З 2002 па 2007 год – намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама. З лютага 2007 года да лютага 2018 года – старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». У 2006 годзе за значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі ў 2001-2005 гадах прысвоена званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь».



**Ашмянцаў Сяргей Дзмітрыевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 449. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Брестский** областной Совет депутатов. **Ашмянцев Сергей Дмитриевич** // Брест. Брэст. Brest. 1000 / сост. А. Н. Вабищевич. – Минск, 2019. – С. 10.

**Дзяржаўныя** ўзнагароды - працаўнікам Брэстчыны // Заря. – 2006. – 4 марта. – С. 3. - Прысвоена ганаровае званне Рэспублікі Беларусь «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь» С. Д. Ашмянцаву.

**ДУБІНКА Зоя Уладзіміраўна**. Нарадзілася 6 чэрвеня 1937 года ў вёсцы Дзядзічы Іўеўскага раёна. Закончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1967). Працавала заатэхнікам, намеснікам старшыні калгаса «Зара». Узнагароджана ордэнамі «Знак Пашаны» (1966), Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1971), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1982). Неаднаразова выбіралася дэпутатам на месным узроўні, была дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР ІХ склікання. У 1986 годзе прысвоена званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларускай ССР».



**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Дубінка Зоя Уладзіміраўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Заслуженные** работники Беларуси. **Дубинка Зоя Владимировна** // Хидры - первый агрогородок на Кобринщине : информационно - аналитический очерк / Кобринская центральная районная библиотека, отдел обслуживания и информации ; сост. Светлана Курачук, гл. библиограф. – Кобрин, 2007. – С. 40. – (Наша гордость, наша слава).

**Дубінка, З.** Кобрыншчына ў маім жыцці / Зоя Дубінка // Кобрынскі веснік. – 2020. – 15 студзеня. – С. 4.

Да 80-годдзя Кобрынскага раёна.

**Елизарова, Ж.** Эра открытий, достижений, развития / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 12 снежня. — С. 5.

О трудовой деятельности З. Дубинки в колхозе «Заря» (ныне СПК «Восходящая заря»).

**Пашковіч, Л.** У вачах — свет, а ў душы — аптымізм / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2017. — 17 чэрвеня. — С. 4.

Жыхарка в. Хідры, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі З. У. Дубінка, адзначыла 80-гадовы юбілей.

**Лесік, І.** Узыходзячая зорка Кобрыншчыны / Ірына Лесік // Кобрынскі веснік. - 2014. — 3 снежня. — С. 1.

Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі З. У. Дубінка працуе ў СВК «Узыходзячая зара» з 1949 года.

**Мельнік, Р.** Зоя Дубинка: **«**Ушаноўваць традыцыі – справа гонару» / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2010. – 6 лістапада. – С. 2.

**Владимиров, Д.** Главная награда – уважение людей / Дмитрий Владимиров // Кобрынскі веснік. – 2008. – 7 сакавіка. – С. 2.

Зоя Дубинко прошла долгий тру¬довой путь - от рядового до главного зоотехника, заместителя председателя колхо¬за и секретаря парторганизации.

**О награждении** орденами и медалями СССР передовиков сельского хозяйства Белорусской ССР : Указ Президиума Верховного Совета СССР, 26 марта 1982 г. // Заря. - 1982. – 7 апреля.

Заместитель председателя колхоза «Заря» Кобринского района З. В. Дубинко награждена орденом Трудового Красного Знамени.

**Дабрагост, І.** Узнагароды – перадавікам / І. Дабрагост // Камуністычная праца. – 1982. – 17 красавіка.

Сакратар парткома калгаса «Зара» З. У. Дубінка ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**КУЗІЧ Уладзімір Рыгоравіч**. Нарадзіўся 23 лютага 1940 года ў вёсцы Павіцце



Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1972 годзе закончыў Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна, факультэт прыродазнаўства. Працоўную дзейнасць пачаў з 1963 года ў горадзе Чалябінску, куды быў накіраваны па камсамольскай пуцёўцы на будаўніцтва металургічнага завода. З 1965 па 1971 год займаў пасады інструктара Кобрынскага райвыкан-кама, старшыні Павіццеўскага сельскага Савета. Усё жыццё У. Р. Кузіча звязана з сельскай гаспадаркай, праблемамі і клопатамі сялянства. Працаваў намеснікам старшыні калгаса імя Чкалава (1971-1973). З 1973 па 2008 год кіраваў калгасам імя Дзімітрава (цяпер ААТ «Стрыгава»). Дзякуючы высокім прафесійным і арганізатарскім здольнасцям Уладзіміра Рыгоравіча, правядзенню механізацыі і мадэрнізацыі вытворчасці, калгас штогод атрымліваў высокія паказчыкі ў вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі і раслінаводства. Працоўныя заслугі ўмелага спецыяліста і выдатнага

гаспадара высока ацэнены: ордэны «Знак Пашаны» (1978) і «Працоўнага Чырвонага Сцяга» (1986), медаль «За доблесную працу» (1970). У 1999 годзе прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь». З 1991 па 2000 год У. Р. Кузіч з'яўляўся старшынёй савета калгасаў Брэсцкай вобласці, з 2000 па 2009 год - старшынёй Брэсцкага аграпрамысловага саюза. Тройчы выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў. З красавіка 2011 года Уладзімір Рыгоравіч - старшыня Кобрынскай раённай арганізацыі беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў. У дзень 75-годдзя Кобрынскага раёна (2015) Уладзіміру Рыгоравічу было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

**Заслужаныя** работнікі Беларусі. **Кузіч Уладзімір Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 429 – (Вызначыліся працай).

